Леанід Маракоў

Ахвяры і карнікі

Мінск
2007

УДК 323.28(476)(092)
ББК 66.3(4 Беи)6
М25

Маракоў Л. У.
М25 **Ахвяры і карнікі** / Леанід Маракоў. — Мінск, 2007. — 440 с.

Кніга складаецца з трох частак.

У першай падаюцца біяграфічныя даныя пісьменнікаў, дзеячаў культуры і грамадства, знішчаных сталінскімі органамі НКВД усяго за адну ноч — 29–30 кастрычніка 1937 г. — самую чорную ноч у беларускай культурнай гісторыі. Апісваюцца лёсы іх сваякоў. Па крупінках, на працягу дзесяці гадоў аўтар збіраў звесткі пра пакутнікаў. Спачатку былі адшуканы імёны чатырнаццаці закатаваных, потым дваццаці двух, трыццаці пяці, сямідзесяці…

У другой частцы прыводзяцца 6000 (шэсць тысяч!) іменаў расстраляных у той жа Мінскай унутранай турме НКВД у перыяд так званага КРЫВАВАГА ТУНЭЛЯ СМЕРЦІ (жнівень 1937 – лістапад 1938).

Трэцяя частка кнігі складаецца з інфармацыі, якую аўтару ўдалося сабраць пра сталінскіх апрычнікаў, што ўчынілі гэта страшнае злачынства, нелюдзяў, якія катавалі і расстрэльвалі ні ў чым не вінаватых людзей. І гэта аказалася самым цяжкім: бальшавікі правялі татальнае знішчэнне слядоў арганізаванага імі генацыду супраць эліты беларускага народа – спачатку забілі тых, хто расстрэльваў, потым выканаўцаў гэтай акцыі, а затым і апошняй…

УДК 323.28(476)(092)
ББК 66.3(4 Беи)6

Толькі адна ноч

У Архіве прэзідэнта Расійскай Федэрацыі (АПРФ, вопіс № 24, справа № 411) захоўваецца «Список лиц, подлежащих суду военной коллегии Верховного суда Союза ССР». У спіс уключаны «ворагі народа» з усяго Савецкага Саюза ад Далёкаўсходняга краю да яго заходніх межаў, ад паўночнай ледзяной Комі АССР да сонечных курортаў Крыма. Спіс датаваны: 7 верасня 1937 года. Падпісаны І. Сталіным, В. Молатавым, Л. Кагановічам, К. Варашылавым, М. Яжовым. Спіс асуджаных па першай катэгорыі (да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу) па Беларускай ССР налічвае 103 чалавекі, па другой катэгорыі (прыгавораны да 10 і больш гадоў зняволення ў канцлагерах) — 6 чалавек. Спіс па Беларускай ССР датаваны 15 верасня 1937 і падпісаны І. Сталіным, В. Молатавым і начальнікам 8-га аддзела Галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай бяспекі СССР старшым маёрам дзяржаўнай бяспекі У. Цэсарскім. У спіс уключаны:

Абухоў Барыс Аляксандравіч,
Аронаў Навум Мееравіч,
Афанасьеў Ігнат Ільіч,
Бабкоў Сямён Дзмітрыевіч,
Барзуноў Георгій Фёдаравіч,
Бейлін Саламон Хаімавіч,
Белацаркоўскі Абрам Давыдавіч,
Бурдыка Іван Сямёнавіч,
Варшаўскі Станіслаў Юльянавіч,
Васільеў-Вашчылін Рыгор Мікітавіч,
Вольны (Ажгірэй) Анатоль Усцінавіч,
Габаеў Моўша-Нохім Ізраілевіч,
Габрусёў Апанас Сцяпанавіч,
Гейштэрн Антон Міхайлавіч,
Гінзбург Якаў Яфімавіч,
Госін Абрам Мендзелевіч,
Гурскі Канстанцін Іосіфавіч,
Гурэвіч Нохман Гіршавіч,
Дзмітроў (Дзмітраў) Мікалай Андрэевіч,
Дзьякаў (Дзякаў) Ананій Іванавіч,
Дракахруст Абрам Генрыхавіч,
Дудар Алесь (Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч),

Елянсон Гірш Борухавіч,
Ермакоў Мікалай Паўлавіч,
Жывуцкі Іван Сцяпанавіч,
Замалін Навум Міхайлавіч,
Зарэцкі (Касянкоў) Міхась Яфімавіч,
Зянковіч Аляксандр Сазонавіч,
Іваноў Аляксандр Васілевіч,
Ігнаценка Дзмітрый Кузьміч (асуджаны па другой катэгорыі),
Іспраўнікаў Прохар Іванавіч,
Кавалёў Сямён Трафімавіч (асуджаны па другой катэгорыі),
Каваль (Кавалёў) Васіль Пятровіч,
Кантар Саламон Мендзелевіч,
Капітанакі Міхаіл Васілевіч,
Карпенка Іван Іванавіч,
Качанаў Герасім Антонавіч,
Кляніцкі Віктар Сямёнавіч,
Кляшторны Тодар Тодаравіч,
Кудзелька Іосіф Фадзеевіч,
Кучынскі Аляксей Сцяпанавіч,
Левін Аляксандр Самойлавіч,
Левін Саламон Вульфавіч,
Лейбін Піня Майсеевіч,
Ляйбовіч Хаім Элясавіч,
Ліхтэнштэйн Сямён Давыдавіч,
Лукашонак Мікіта Сяргеевіч,
Лявонны Юрка (Юркевіч Леанід Мікалаевіч),
Лямперт Саламон Рыгоравіч,
Мазель Эліязар Якаўлевіч,
Малаў (Малоў) Барыс Міхайлавіч,
Маракоў Валерый Дзмітрыевіч,
Маргелаў Сцяпан Прохаравіч,
Марголін Міхаіл Саламонавіч (вядома, што арыштаваны быў і яго брат),
Масленнікаў Павел Аляксандравіч,
Мелік-Шахназараў Андрэй Паўлавіч,
Мілевіч Антон Сігізмундавіч (асуджаны па другой катэгорыі),
Мірлін Абрам Навумавіч,
Міснікоў Мікалай Данілавіч,
Міхееў Мікалай Іванавіч,
Мурзо Сяргей Мікітавіч,
Мухін Павел Максімавіч,

Навахрэст Якаў Пятровіч,
Несцяровіч Іван Іванавіч,
Падсявалаў Іван Іванавіч,
Паплыка Іван Майсеевіч,
Пасманік Міхаіл Львовіч,
Півавараў Залман Рувімавіч,
ПітомцаўМіхаіл Мікітавіч,
Пратапопаў Апалон Уладзіміравіч,
Пурыс Ізраіль Лейзеравіч,
Пуцілоўскі Аляксандр Андрэевіч,
Пуцінцаў Іван Андрэевіч,
Пыж Рыгор Фёдаравіч (асуджаны па другой катэгорыі),
Пятрашын Кузьма Рыгоравіч,
Пятровіч (Нёманскі) Іван Андрэевіч,
Разумоўскі Арон-Лейб Сіманавіч,
Рыдзеўскі Міхаіл Антонавіч,
Самахвалаў Аляксандр Рыгоравіч,
Сандамірскі Якаў Рыгоравіч,
Сапрыцкі Оскар (Аскар) Абрамавіч,
Саракош (Сарокаш) Іван Усцінавіч,
Спектар Якаў Мееравіч,
Старынскі Васіль Сямёнавіч,
Сташэўскі Васіль Пятровіч,
Стрэле Георгій Уладзіміравіч,
Суроўцаў Мікалай Якаўлевіч,
Сялоў Дзмітрый Паўлавіч,
Сярдзюк Панцеляймон Іванавіч,
Таненбаўм Мірон Барысавіч,
Таўбін Юдаль Абрамавіч,
Троіцкі Іван Васілевіч,
Трумпацкі Эля Хацкелевіч,
Успенскі Яўген Канстанцінавіч,
Фалкін Рыгор Якаўлевіч,
Фінкельштэйн Аба Алтэравіч,
Фломбаўм Яўсей Еўнавіч,
Фрэнкель Іосіф Львовіч (асуджаны па другой катэгорыі),
Харлац Дзмітрый Сямёнавіч,
Хатулёў Пётр Фёдаравіч,
Чарнушэвіч Аляксандр Анікеевіч,
Чарняк Мікалай Платонавіч,
Чарот (Кудзелька)Міхась Сямёнавіч,

Чачура Канстанцін Георгіевіч,
Шалай (Шалаеў) Макар Ксенафонтавіч,
Шапіра Юдаль Ісакавіч,
Шастакоў Павел Пятровіч,
Элькін Якаў Веньямінавіч (таксама арыштаваны і яго брат),
Ярковіч Іван Канстанцінавіч (асуджаны па другой катэгорыі).

Згоду, дакладней, загад на знішчэнне па ўсім СССР тысяч (атрымаецца мільёнаў) ні ў чым не вінаватых людзей далі вышэйшыя кіраўнікі краіны. Загад дадзены, і яго трэба было выконваць, а лепш... перавыконваць. Што і было зроблена ў невыпадкова прызначаную ноч.

29 кастрычніка 1937 года, напэўна, у гонар 20-годдзя кастрычніцкага перавароту, у сталіцы Беларусі Мінску адбылася акцыя, аналагаў якой яшчэ не ведала гісторыя чалавецтва. На працягу ночы ў сутарэннях унутранай турмы НКВД, так званай «амерыканкі», былі расстраляны паэты Алесь Дудар, Юрка Лявонны, Валеры Маракоў, Сяргей Мурзо, Зяма Півавараў, Міхась Чарот, празаікі Міхась Зарэцкі, Васіль Каваль, Васіль Сташэўскі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Анатоль Вольны, літаратурныя крытыкі Саламон Левін, Пятро Хатулёў, Макар Шалай, журналіст Павел Шастакоў, наркам асветы Аляксандр Чарнушэвіч, рэктар БДУ Ананій Дзьякаў (Дзякаў), нам. наркама земляробства БССР Аскар Сапрыцкі, адказны сакратар СНК БССР Іван Бурдыка, начальнік упраўлення па ахове аўтарскіх правоў пры СП БССР Іосіф Кудзелька, начальнік планава-фінансавага ўпраўлення наркама асветы БССР Дзмітрый Сялоў, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, педагог, рэдактар Аляксей Кучынскі, загадчык секцыі геаграфіі Інстытута эканомікі АН БССР Сцяпан Маргелаў, загадчык вучэбнай часткі Мінскага педагагічнага інстытута Міхаіл Рыдзеўскі, фізік Яўген Успенскі, дацэнт Віцебскага ветэрынарнага інстытута Навум Замалін, выкладчык Мінскага Белпедтэхнікума Ігнат Афанасьеў, настаўнік Іван Жывуцкі, студэнт 5 курса БДУ Саламон Лямперт.

Паэты Ізі Харык, Арон Юдэльсон, празаікі Платон Галавач, Майсей Кульбак, літаратурны крытык Якаў Бранштэйн, журналіст Віктар Вайноў, наркам асветы Аляксандр Варончанка, крытык, публіцыст Хацкель Дунец, наркам юстыцыі БССР Максім Ляўкоў, другі сакратар ЦК КП(б)Б Мікалай Дзеніскевіч, загадчык асобага сектара (аддзела) ЦК КП(б)Б Міхаіл Лабадаеў, сакратар Барысаўскага РК КП(б)Б Леў Майсееў, дзяржаўны дзеяч, педагог, публіцыст Язэп Каранеўскі, вучоны-аграхімік Рыгор Пратасеня дададзены ўсмяротны спіс мясцовымі энкавэдыстамі.

Сёння ўжо цяжка ўдакладніць, калі — 29 (у 23.45, да прыкладу) або 30

(скажам, у 00.15) кастрычніка 1937 — расстралялі празаіка і грамадскага дзеяча Янку Нёманскага (Пятровіча), паэтаў Тодара Кляшторнага і Юлія Таўбіна, нам. загадчыка сельскагаспадарчага аддзела рэдакцыі газ. «Віцебскі пралетарый» Прохара Іспраўнікава, дырэктара трэста «Галоўхлеб» БССР Георгія Барзунова, дырэктара Белпрамторга Саламона Кантара, загадчыка аддзела хлебнай групы наркамата ўнутранага гандлю Барыса Малава, загадчыка сакратарыята СНК БССР Якава Спектара, дырэктара конесаўгаса №120 Георгія Стрэле, загадчыка лабараторыі Віцебскай ветэрынарнай станцыі Івана Карпенку, нам. дырэктара па навуковай рабоце Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі Элізара Мазеля, загадчыка кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута Якава Сандамірскага, загадчыка лабараторыі Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі Паўла Мухіна, загадчыка лабараторыі біяфабрыкі № 5 у Віцебску Панцялея Сердзюка.

Тое ж самае можна сказаць і пра дададзеных у спіс мясцовымі энкавэдыстамі начальніка Упраўлення вышэйшай школы Наркамата асветы БССР Вадзіма Башкевіча, нам. наркама асветы БССР Юсіфа Гершона, загадчыка аддзела школ і навукі ЦК КП(б)Б Мікалая Арабея, старшыню ЦК прафсаюзаў БССР Захара Кавальчука, сакратара Варашылаўскага РК КП(б)Б Захара Кавалёва, начальніка Упраўлення будаўнічых работ пры СНК БССР Анатоля Аўгусціновіча, начальніка Упраўлення шкляной прамысловасці Наркамата лёгкай прамысловасці БССР Мікалая Кандрашука, нам. наркама Наркамата саўгасаў БССР Леанарда Лашкевіча, сакратара Дзяржынскага РК КП(б)Б, члена ЦК КП(б)Б (з 1937) Барыса Мар'янава, кансультанта Упраўлення справамі СНК БССР Дзям'яна Міхайлава, дырэктара Гідролізнага доследнага завода Наркамата мясцовай прамысловасці Сяргея Міцькова, кансультанта СНК БССР па камунальных і транспартных справах Васіля Петрушэню, наркама саўгасаў БССР Андрэя Турлая, начальніка аддзела землеўпарадкавання Наркамата земляробства БССР Ісака Фрыдмана, начальніка службы Днепра-Дзвінскага параходства ў Гомелі Віктара Яркіна.

Уключаныя ў сталінскі смяротны спіс начальнік Ветэрынарнага ўпраўлення Наркамата земляробства БССР Пасманік Міхаіл Львовіч (н. ў 1903), яго нам. Іваноў Аляксандр Васілевіч (н. ў 1898) і старшы ветэрынарны ўрач Ветэрынарнага ўпраўлення Гурскі Канстанцін Іосіфавіч (н. ў 1903) (з машыністам паравознага дэпо станцыі «Мінск» Бяганскім Іосіфам Вікенцевічам (н. 1.1.1881), бацькам таксама рэпрэсаванай пісьменніцы Ядвігі Бяганскай, і 20 іншымі, далучанымі да спіса мясцовымі энкавэдыстамі) асуджаны да ВМП і расстраляны 17 кастрычніка 1937.

Наркам унутранага гандлю БССР Гурэвіч Нохім Гіршавіч (н. ў 1895), падчас арышту беспрацоўны Ермакоў Мікалай Паўлавіч[1] (н. 1.5.1894),

загадчык кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута Міхееў Мікалай Іванавіч (н. ў 1905), загадчык склада «Галоўнафты» Пятрашын Кузьма Рыгоравіч, падчас арышту беспрацоўны Пітомцаў Міхаіл Мікітавіч[2] (н. 13.11.1902), нам. начальніка штаба, палкавы камісар 16-га стралковага корпуса Паплыка Іван Майсеевіч[3] (н. ў 1890), вайсковец, старшы афіцэр БВА Пратапопаў Апалон Уладзіміравіч, ветэрынарны ўрач Віцебскай біяфабрыкі Чарняк Мікалай Платонавіч[4] (н. ў 1885), ветэрынарны ўрач Віцебскай біяфабрыкі Чачура Канстанцін Георгіевіч, загадчык кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута Кляніцкі Віктар Сымонавіч (н. ў 1879), загадчык кафедры анатоміі гэтага ж інстытута Абухоў Барыс Аляксандравіч, загадчык кафедры заагігіеннага інстытута Старынскі Васіль Сямёнавіч, дацэнт інстытута Качанаў Герасім Артамонавіч (н. у 1907), прафесар Віцебскага медыцынскага інстытута Троіцкі Іван Васілевіч (н. у 1893) былі асуджаны да ВМП і расстраляны 31 кастрычніка 1937 г.

У гэты ж дзень расстраляны і далучаныя да спіса мясцовымі энкавэдыстамі пробашч касцёла кармелітаў у Чавусах Магілёўскай вобл. Казюнас Павел Мацвеевіч (н. ў 1868), выкладчык Магілёўскага сельскагаспадарчага тэхнікума Маеўскі-Лукша Давыд Якімавіч (н. ў 1899), дырэктар Мінскага (Беларускага) навукова-даследчага інстытута прамысловасці Слонім Самуіл Захаравіч (н. 30.9.1888), праваслаўны святар Раеўскі Аляксандр Сямёнавіч (н. ў 1868) і 30 іншых.

Загадчык лабараторыі Віцебскай ветэрынарнай станцыі Капітанакі Міхаіл Васілевіч (н. ў 1904) арыштаваны 17.5.1937, прыгавораны да 10 гадоў ППК і этапаваны ва Унжэнскі канцлагер НКВД Горкаўскай чыгункі, дзе адбываў пакаранне да 7.9.1945.

---

[1] 4.11.1937 арыштавана, а 28.11.1937 асуджана да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР яго жонка Ермакова Францішка Іванаўна.

[2] 4.11.1937 арыштавана, а 28.11.1937 асуджана да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР яго жонка Пітомцава Аляксандра Георгіеўна, настаўніца Мінскай школы № 6.

[3] 25.9.1932 органамі АДПУ арыштаваны і 2.12.1932 асуджаны за ўдзел у «контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК яго брат Паплыка Сцяпан Майсеевіч; 6.11.1937 (з сынам Канстанцінам; н. ў 1917) арыштавана, а 16.5.1938 асуджана да 8 гадоў зняволення і выслана ў Краснаярскі край жонка Івана Паплыкі Юлія Іванаўна, загадчыца чытальнай залы Магілёўскай цэнтральнай бібліятэкі.

[4] 15.11.1937 арыштавана, а 16.5.1938 асуджана да 8 гадоў ППК жонка Мікалая Чарняка Марыя Еўсцігнееўна, фельчар Віцебскай чыгуначнай бальніцы; хутчэй за ўсё рэпрэсаваны і іх дзеці.

Лёсы ўключаных у смяротны спіс Аронава Навума Мееравіча, Бабкова Сямёна Дзмітрыевіча, Бейліна Саламона Хаімавіча, Белацаркоўскага Абрама Давыдавіча, Варшаўскага Станіслава Юльянавіча, Васільева-Вашчыліна Рыгора Мікітавіча, Габаева Моўша-Нохіма Ізраілевіча, Габрусёва Апанаса Сцяпанавіча, Гейштэрна Антона Міхайлавіча, Гінзбурга Якава Яфімавіча, Госіна Абрама Мендзелевіча, Дзмітрова Мікалая Андрэевіча, Дракахруста Абрама Генрыхавіча, Елянсона Гірша Борухавіча, Ігнаценкі Дзмітрыя Кузьміча, Кавалёва Сямёна Трафімавіча, Левіна Аляксандра Самойлавіча, Ляйбовіча Хаіма Элясавіча, Лейбіна Піні Майсеевіча, Ліхтэнштэйна Сямёна Давыдавіча, Лукашонка Мікіты Сяргеевіча, Марголіна Міхаіла Саламонавіча (вядома, што арыштаваны быў ягоны брат), Масленнікава Паўла Аляксандравіча, Мелік-Шахназарава Андрэя Паўлавіча, Мілевіча Абрама Сігізмундавіча, Мірліна Абрама Навумавіча, Міснікова Мікалая Данілавіча, Навахрэста Якава Пятровіча, Несцяровіча Івана Іванавіча, Падсявалава Івана Іванавіча, Пурыса Ізраіля Лейзеравіча, Пуцілоўскага Аляксандра Андрэевіча, Пуцінцава Івана Андрэевіча, Пыжа Рыгора Фёдаравіча, Разумоўскага Арона-Лейбы Сіманавіча, Самахвалава Аляксандра Рыгоравіча, Саракоша Івана Усцінавіча, Суроўцава Мікалая Якаўлевіча, Таненбаўма Мірона Барысавіча, Трумпацкага Элі Хацкелевіча, Фалкіна Рыгора Якаўлевіча, Фінкельштэйна Абу Алтэравіча, Фломбаўма Яўсея Еўнавіча, Фрэнкеля Іосіфа Львовіча, Харлаца Дзмітрыя Сямёнавіча, Шапіры Юдаля Ісакавіча, Элькіна Якава Веньямінавіча (таксама арыштаваны ягоны брат), Янковіча Аляксандра Сазонавіча (далучаны мясцовымі энкавэдыстамі), Ярковіча Івана Канстанцінавіча невядомыя, але найхутчэй, яны ўкастрычніку-лістападзе 1937-га былі арыштаваны і асуджаны тройкамі НКВД да ВМП.

29 кастрычніка 1937 года толькі ў Мінскай турме НКВД энкавэдысты расстралялі не менш за 70 чалавек (праўдападобна, больш за 100). І заўважце каго! Дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, навукоўцы, літаратары, работнікі асветы. Ніколі ні раней, ні пазней такога адсеву не рабілася. Вынішчалі эліту беларускай інтэлігенцыі, мозг нацыі... Вынікі таго расстрэлу мы адчуваем нават цяпер, праз 70 гадоў! Страх, што ўеўся ў нашы гены, душыць, як пятля, сціскае нашыя шыі, не дае дыхаць...


У жніўні таго юбілейнага для бальшавікоў 1937-га іх гвардзейцы-энкавэдысты пачалі татальнае вынішчэнне інтэлектуальнай беларускай эліты. Толькі за тры восеньскія месяцы паслугачамі таталітарнага рэжыму было рэпрэсавана больш за 600 грамадскіх і культурных дзеячаў Беларусі. За перыяд жа так званага крывавага тунэля смерці (жн. 1937 — снеж. 1938) расстралянa не менш за дзесяць тысяч чалавек.

Рэпрэсаваны… Знайшлі ж бальшавікі слова! Не канкрэтнае — расстраляны або загублены на катарзэці замардаваны ў ссылцы, а замежнае, не кожнаму

да канца зразумелае — рэпрэсаваны (з лацінскай repressor — падаўленне). Не, гэта было не падаўленне, гэта было вынішчэнне, генацыд супраць беларускага народа!

Першага жніўня 1937 г. на вялікім вогнішчы ў «амерыканцы» энкавэдысты Сакалоў (нам. начальніка Мінскай унутранай турмы НКВД), Абрамчык, Гарбацэвіч вынішчылі — спалілі — некалькі дзесяткаў тысяч (!) рукапісаў беларускіх літаратараў. Гарэлі творы, якія не праскочылі цэнзуру або пісаліся ў стол, для нас, нашчадкаў. Гарэлі рукапісы М. Багуна, С. Баранавых, А. Вольнага, П. Галавача, У. Галубка, Ц. Гартнага, С. Дарожнага, А. Дзеркача, А. Дудара, Х. Дунца, М. Зарэцкага, С. Знаёмага, В. Каваля, Т. Кляшторнага, М. Кульбака, Ю. Лявоннага, В. Маракова, С. Мурзо, Я. Нёманскага, З. Піваварава, С. Ракіты, А. Розны, В. Сташэўскага, Б. Тарашкевіча, Ю. Таўбіна, У. Хадыкі, І. Харыка, М. Чарота, В. Шашалевіча, А. Юдэльсона і многіх іншых. Гарэла амаль уся спадчына пісьменнікаў «першага прызыву». Няма чалавека — няма толькі адной праблемы. Няма рукапісаў — няма паэтаў, няма гісторыі, няма народа!

Нашу гісторыю разам з нашым народам ЯНЫ ўвесь час і выкарчоўваюць. Калі мячом, калі агнём.



СПИСОК

лиц, подлежащих суду Военной Коллегии

Верховного Суда Союза ССР.


« 7 » сентября 1937 г.

Спіс асобаў, якія падпадаюць пад суд Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР (7 верасня 1937 года).
За: Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Яжоў.
(АПРФ, в. 24, с. 411, л. 1.)



6741

АПРФ, в. 24, с. 411, л. 249.



Спіс асобаў, якія падпадаюць пад суд Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР (15 верасня 1937 года).
Сталін, Молатаў.
(АПРФ, в. 24, с. 411, л. 65.)

	1-я кат.	2-я кат.	3-я кат.
1. Белорусская ССР	103	6	0

АП РФ, оп.24, дело 411, лист 65

Асуджаныя па першай категорыі (расстрэл)


1. АЖГИРЕЙ (ВОЛЬНЫЙ) Анатолий Устинович
2. АРОНОВ Наум Мейерович
3. АФАНАСЬЕВ Игнатий Ильич
4. БАБКОВ Семен Дмитриевич
5. БЕЙЛИН Соломон Хаимович
6. БЕЛОЦЕРКОВСКИЙ Абрам Давыдович
7. БОРЗУНОВ Георгий Федорович
8. БУРДЫКО Иван Семенович
9. ВАРШАВСКИЙ Станислав Юльянович
10. ВАСИЛЬЕВ-ВАЩИЛИН Григорий Никитич
11. ГАБАЕВ Мовша-Нохим Израилевич
12. ГАБРУСЕВ Афанасий Степанович
13. ГЕЙШТЕР Антон Михайлович
14. ГИНЗБУРГ Яков Ефимович
15. ГОСИН Абрам Менделевич
16. ГУРЕВИЧ Нохман Гиршевич
17. ГУРСКИЙ Константин Иосифович
18. ДАЙЛИДОВИЧ-ДУДАРЬ Александр Александрович
19. ДМИТРОВ Николай Андреевич
20. ДРАКОХРУСТ Абрам Генрихович
21. ДЬЯКОВ Ананий Иванович
22. ЕЛЕНСОН Гирш Борухович
23. ЕРМАКОВ Николай Павлович
24. ЖИВУЦКИЙ Иван Степанович
25. ЗАМАЛИН Наум Михайлович
26. ЗЕНКОВИЧ Александр Сазонович
27. ИВАНОВ Александр Васильевич
28. ИСПРАВНИКОВ Прохор Иванович
29. КАНТАР Соломон Менделевич
30. КАПИТАНАКИ Михаил Васильевич
31. КАРПЕНКО Иван Иванович
32. КАЧАНОВ Герасим Антонович
33. КЛЕНИЦКИЙ Виктор Семенович
34. КЛЯШТОРНЫЙ Федор Федорович
35. КОВАЛЬ Василий Петрович
36. КОСЯНКОВ-ЗАРЕЦКИЙ Михаил Ефимович
37. КУДЕЛЬКО Иосиф Фаддеевич
38. КУДЕЛЬКО-ЧАРОТ Михаил Семенович

39. КУЧИНСКИЙ Алексей Степанович
40. ЛЕВИН Александр Самойлович
41. ЛЕВИН Соломон Вульфович
42. ЛЕЙБИН Пиня Моисеевич
43. ЛЕЙБОВИЧ Хаим Эльясович
44. ЛИХТЕНШТЕЙН Семен Давидович
45. ЛУКАШЕНОК Никита Сергеевич
46. ЛЯМПЕРТ Соломон Григорьевич
47. МАЗЕЛЬ Элиазар Яковлевич
48. МАЛОВ Борис Михайлович
49. МАРГЕЛОВ Степан Прохорович
50. МАРГОЛИН Михаил Соломонович
51. МАСЛЕННИКОВ Павел Александрович
52. МЕЛИК-ШАХНАЗАРОВ Андрей Павлович
53. МИРЛИН Абрам Наумович
54. МИСНИКОВ Николай Данилович
55. МИХЕЕВ Николай Иванович
56. МОРЯКОВ Валерий Дмитриевич
57. МУРЗО Сергей Никитич
58. МУХИН Павел Максимович
59. НЕСТЕРОВИЧ Иван Иванович
60. НОВОХРЕСТ Яков Петрович
61. ОБУХОВ Борис Александрович
62. ПАСМАНИК Михаил Львович
63. ПЕТРАШИН Кузьма Григорьевич
64. ПЕТРОВИЧ Иван Андреевич
65. ПИВОВАРОВ Залман Рувимович
66. ПИТОМЦЕВ Михаил Никитич
67. ПОДСЕВАЛОВ Иван Иванович
68. ПОПЛЫКО Иван Моисеевич
69. ПРОТОПОПОВ Апполон Владимирович
70. ПУРИС Израиль Лейзерович
71. ПУТИНЦЕВ Иван Андреевич
72. ПУЦИЛОВСКИЙ Александр Андреевич
73. РАЗУМОВСКИЙ Арон-Лейба Симонович
74. РЫДЗЕВСКИЙ Михаил Антонович
75. САМОХВАЛОВ Александр Григорьевич
76. САНДОМИРСКИЙ Яков Григорьевич
77. САПРИЦКИЙ Оскар Абрамович
78. СЕЛОВ Дмитрий Павлович
79. СЕРДЮК Пантелеймон Иванович
80. СОРОКОШ Иван Иустинович
81. СПЕКТОР Яков Мейерович
82. СТАРИНСКИЙ Василий Семенович
83. СТАШЕВСКИЙ Василий Петрович

84. СТРЕЛЕ Георгий Владимирович
85. СУРОВЦЕВ Николай Яковлевич
86. ТАНЕНБАУМ Мирон Борисович
87. ТАУБИН Юлий Абрамович
88. ТРОИЦКИЙ Иван Васильевич
89. ТРУМПАЦКИЙ Эля Хацкелевич
90. УСПЕНСКИЙ Евгений Константинович
91. ФАЛКИН Григорий Яковлевич
92. ФИНКЕЛЬШТЕЙН Аба Алтерович
93. ФЛОМБАУМ Евсей Евнович
94. ХАРЛАЦ Дмитрий Семенович
95. ХОТУЛЕВ Петр Федорович
96. ЧЕРНУШЕВИЧ Александр Аникеевич
97. ЧЕРНЯК Николай Платонович
98. ЧЕЧУРО Константин Георгиевич
99. ШАЛАЕВ Макар Ксенофонтович
100. ШАПИРО Юдель Исаакович
101. ШЕСТАКОВ Павел Петрович
102. ЭЛЬКИН Яков Вениаминович
103. ЮРКЕВИЧ-ЛЯВОННЫЙ Леонид Николаевич

Асуджаныя па другой катэгорыі (ППК)

1. ЕРКОВИЧ Иван Константинович
2. ИГНАТЕНКО Дмитрий Кузьмич
3. КОВАЛЕВ Семен Трофимович
4. МИЛЕВИЧ Антон Сигизмундович
5. ПЫЖ Григорий Федорович
6. ФРЕНКЕЛЬ Иосиф Львович



Кр.: АПРФ, в.24. с. 24. с. 411. л. 250.

БІЯГРАФІІ РАССТРАЛЯНЫХ
29—30 кастрычніка 1937 года

АРАБЕЙ Мікалай Лявонавіч [16.1899, в. Вялікая Вобрына Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны дзеяч. З сялянскай сям'і. Скончыў рэальнае вучылішча ў Петраградзе. З 1919 (?) да 1930 у Чырвонай арміі на палітрабоце. З ліп. 1919 да снеж. 1920 на Зах. фронце. У ВКП(б) з 1920. У 1926 скончыў курсы ўдасканальвання вышэйшага начсаставу. З лют. да верас. 1930 — інструктар ЦК КП(б)Б, потым вучыўся ў Інстытуце чырвонай прафесуры ў Маскве (да ліст. 1933). Ажаніўся, гадаваў дваіх дзяцей. Пасля вяртання ў Мінск — памочнік сакратара ЦК КП(б)Б, дырэктар Белпартвыдавецтва. З верас. 1935 да мая 1936 — загадчык аддзела школ і навукі ЦК КП(б)Б. 17.1.1936 бюро ЦК КП(б)Б рэкамендавала А. на пасаду наркама асветы БССР, а таксама ў члены ЦК і кандыдатам у члены бюро ЦК КП(б)Б. Пры абмеркаванні гэтага пытання на пленуме адзін з яго ўдзельнікаў заявіў, што А. у 1923 выступаў у абарону Л. Троцкага. Узнікла «персанальная справа», пры разглядзе якой 4.3.1936 бюро ЦК адмяніла сваё рашэнне аб вылучэнні наркамам і вызваліла А. ад пасады загадчыка аддзела школ і навукі ЦК КП(б)Б, выключыла з членаў партыі і накіравала на перавыхаванне на абутковую фабрыку ў Мінску ў якасці нарміроўшчыка. Кантрольная партыйная камісія пры ЦК ВКП(б), куды ён звярнуўся з апеляцыяй, пацвердзіла выключэнне з партыі. Арыштаваны 27.4.1937 у Мінску па адрасе: пл. Парыжскай Камуны, д. 14, кв. 11. Асуджаны 29.10.1937 пазасудовым органам НКВД як «удзельнік антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 16.7.1957. Асабовая справа А. № 10752-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Энгельса, д. 26/92, кв. 25 арыштавана ўрач Ляхаўскай паліклінікі, маці дваіх дзяцей **Арабей Дэбора Майсееўна** (н. 29.8.1902 у мяст. Старыя Дарогі Бабруйскага пав. Мінскай губ.), жонка Мікалая Арабея. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД яна была асуджана як «член сям'і расстралянага ворага народа» да 8 гадоў ППК. Этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР[1]

[1] Акмолінскае лагернае аддзяленне жонак здраднікаў радзімы, адзін з трох астравоў «Архіпелага ГУЛАГ» . Створана ў пачатку 1938 на базе 26 працоўных пасёлкаў.

Акмолінск (ад Ак-Мола — Белая Магіла), з 1961 — Цалінаград, з 1992 — Акмала, з 10.12.1997 Астана (па-казахску — сталіца), сталіца Рэспублікі Казахстан.

НКВД Казахскай ССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 27.4.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа А. № 6693-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД*; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

АЎГУСЦІНОВІЧ Анатоль Ільіч [4.9.1904, Орша Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сям'і службоўца. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Уступіў у ВКП(б). Да арышту — начальнік Ўпраўлення будаўнічых работ пры СНК БССР. Арыштаваны 10.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Праўдная, д. 6, кв. 8. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 10.8.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа А. № 10858-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

16.2.1938 у Мінску па адрасе: Каралінскі зав., д. 8, кв. 4 арыштавана хатняя гаспадыня **Аўгусціновіч Алена Іванаўна** (н. 28.2.1907 у Мінску ў сям'і служачага; атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю; выйшла замуж, гадавала дзіця), жонка Анатоля Аўгусціновіча. 16.5.1938 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана праз Оршу ў Цемнікоўскі канцлагер НКВД Мардоўскай АССР. У 1941 пераведзена ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 15.2.1946. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 4.9.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа А. № 6895-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*



Памятны знак вязніцам АЛЖЗР (АЛЖИР) у пас. Малінаўка (Казахстан).


АФАНАСЬЕЎ Ігнат Ільіч [2.1.1888, в. Гарадзечна Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], педагог. З сям'і бел. селяніна-серадняка: бацька меў 5 дзесяцін зямлі, дом і карову. Скончыў настаўніцкую семінарыю. У 1910-я г. — настаўнік Мсціслаўскага 2-класнага прыходскага мужчынскага вучылішча. У 1920–30-я г. выкладчык МБПТ, Мінскай 2-гадовай школы культпрасветработнікаў, Яўрэйскага педагагічнага тэхнікума. Жонка А. Марыя Васілеўна (н. ў 1881, хатняя гаспадыня) жыла ў Магілёве з іх агульным сынам Барысам і сваёй дачкой Вольгай Сцяпанаўнай Пятровай. Арыштаваны 29.4.1937 у Мінску па адрасе: вул. Падлесная, д. 8/22, кв. 1[1]. Пры вобыску разам з інш. рэчамі ў А. забралі ягоны пашпарт (серыя ФО № 534970). Асуджаны тройкай НКВД 28.10.1937 як «удзельнік шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны Вярхоўным судом Беларусі 15.5.1992. Асабовая справа А. № 35624-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная книжка Могилевской губернии. Могилев, 1915. С. 168; *Рэпрэсаваныя...*

БАРЗУНОЎ Георгій Фёдаравіч [23.4.1901, с. Гоці (?) Тульскай губ., цяпер Бялёўскі р-н Тульскай вобл., Расія — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сялянскай сям'і. Член ВКП(б) з 1925. Да арышту — дырэктар трэста «Галоўхлеб» БССР. Арыштаваны 22.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Ленінская, д. 36/43, кв. 17. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнскай арганізацыі правых» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 4.7.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Б. № 10667-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

16.5.1938 асобай нарадай НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы і ворага народа» да 8 гадоў ППК маці чацвярых дзяцей **Барзунова Марфа Захараўна** (н. ў 1900 у с. Таць Тульскай губ., цяпер Бялёўскі р-н), жонка Георгія Барзунова. Этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 24.4.1946. Далейшы лёс невядомы.

[1] Праз няпоўныя тры месяцы 25.7.1937 арыштаваны новы жыхар гэтай кватэры работнік Мінскага дрэваапрацоўчага завода Барысюк Іван Лаўрэнцевіч. Н. ў 1916 у Гродзенскай губ. у бел. сялянскай сям'і. Прыгавораны 1.11.1937 як «агент польскіх разведвальных органаў» да ВМП і 4.12.1937 расстраляны ў Мінскай унутранай турме НКВД (гл. таксама с. 146).


АНКЕТА АРЕСТОВАННОГО

З асабовай справы № 35624-с.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*


БАШКЕВІЧ Вадзім Ігнатавіч [12(24).3.1904, в. Сёмкаў Гарадок Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сям'і бел. настаўнікаў. Да 1919 скончыў школу першай ступені і 3 курсы Мінскай гімназіі. У сувязі з заняццем Мінска ў жн. 1919 польскімі легіянерамі вучоба была перапынена. У 1920 працаваў загадчыкам валаснога рэўкама ў мяст. Сенніца каля Мінска. Пасля быў загадчыкам клуба ў в. Новы Двор Самахвалавіцкага пав., інструктарам Мінскага павятовага камітэта, загадчыкам аддзела палітпрасветы і нам. сакратара Мінскага павятовага камітэта камсамола Беларусі. З сак. 1924 — інструктар Барысаўскага акруговага камітэта КСМБ, у ліст. пераведзены на пасаду загадчыка аддзела палітпрасветы Слуцкага акруговага камітэта ЛКСМБ. У 1928 уступіў у ВКП(б). У студз. 1931 прызначаны нам. загадчыка сектара навукі і культуры ЦК КП(б)Б, потым начальнікам Управлення вышэйшай школы Наркамасветы БССР. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. 23.8.1936 пастановай бюро ЦК КП(б)Б адхілены ад работы «за сувязь з нацдэмамі і прамое патуранне контррэвалюцыйным трацкісцкім элементам». Са жн. 1936 беспрацоўны, нягледзячы на тое, што неаднаразова звяртаўся ў партыйныя і савецкія органы з просьбай уладкаваць яго на работу. Арыштаваны ў Мінску ў 1936 па адрасе: вул. Валадарскага, д. 30, кв. 4. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29.10.1937 як «член антысавецкай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 23.5.1956. Асабовая справа Б. № 6577-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.



Кр.: *БНДЦЭД; Рэпрэсаваныя...*

БРАНШТЭЙН Якаў Анатолевіч [10.11.1897, Бельск Гродзенскай губ., цяпер Падляшскае ваяв., Польшча — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], крытык, літаратуразнавец. З сям'і службоўца. У 1914–18 жыў у Варшаве. Друкавацца пачаў у 1918. У 1919 пераехаў у Савецкую Расію (Арол). Добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную армію. Пасля дэ-

мабілізацыі (1921) працаваў у рэдакцыі газ. «Орловская правда». У 1925 скончыў літаратурны ф-т 1-га Маскоўскага ун-та. У 1926–30 вучыўся ў Камуністычнай акадэміі ў Маскве. З 1930 навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. З 1932 адначасова прафесар МПІ. У 1932–37 адказны сакратар СП БССР. Член СП СССР з 1934. Член-карэспандэнт АН БССР з 1936. Як крытык выступаў з 1925. Б. *«беспадстаўна атаясамліваў метад са светапоглядам, супрацьпастаўляў рэалізм усім іншым «антырэалістычным кірункам». Памылкова лічыў, што ўздым мастацкай культуры непасрэдна залежыць ад уздыму палітычнай свядомасці творцы, а значыць, ад палітычнай накіраванасці мастацкай літаратуры...»* (І. Багдановіч). Арыштаваны 6.6.1937 у Мінску па адрасе: 2-гі Апанскі зав., д. 4б, кв. 2. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член трацкісцкай арганізацыі і арганізатар тэрарыстычнай групоўкі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 27.6.1956. Асабовая справа Б. № 6889-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.



Я. Браншт эйн з жонкай М. У. Мінкінай.

11.2.1938 асобай нарадай НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы і ворага народа» да 8 гадоў ППК **Браншт эйн Раіса Аляксандраўна** (н. ў 1904 у Харкаве), верагодна, жонка або сваячка Якава Браншт эйна. Этапавана ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 18.10.1945. Далейшы лёс невядомы.

Тв.: Атака: [Зборнік артыкулаў]. Мн., 1930. Ідыш; Аб стане яўрэйскай літаратуры ў перыяд рэканструкцыі. Мн., 1932. Ідыш; Літаратурная вучоба: У дапамогу выкладчыкам літаратуры і кіраўнікам літгурткоў. Вып. 1. Мн., 1935.

Кр.: *Барадзіч Д.* Спадчына Я. Браншт эйна // *ЛіМ.* 1958. 23 ліп.; *Лынькоў М.* Ён быў сярод нас… // *ЛіМ.* 1962. 25 снеж.; *НАРБ, ІКБР*; *Возвращенные имена; БП.* Т. 1; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*


БУРДЫКА Іван Сямёнавіч [7.9.1900, в. Хутар Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З бел. сялянскай сям'і. У 1925 уступіў у ВКП(б). Меў незакончаную вышэйшую адукацыю. У 1930-я г. адказны сакратар СНК БССР. Арыштаваны 28.6.1937 у Мінску па адрасе: Омскі зав., д. 5а, кв. 3. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 30.11.1957. Асабовая справа Б. № 11025-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Рэпрэсаваныя…*

ВАЙНОЎ Віктар Лявонавіч [23.2.1904, в. Палужжа Карэліцкай вол. Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], журналіст. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Камуністычны ун-т. У 1926–27 сакратар Магілёўскага акружкама КП(б)Б, пазней загадчык сельскагаспадарчага сектара (аддзела) газ. «Звязда». У чэрв. 1936 выключаны з ВКП(б). На момант арышту працаваў загадчыкам экспедыцыі карамельнага цэха фабрыкі «Камунарка». Жыў з жонкай у Мінску па адрасе: вул. Свярдлова, д. 60, кв. 4. Маці В. Марыя Васілеўна і сястра Алена жылі ў в. Палужжа. Брат Сцяпан працаваў рабочым на заводзе імя Дзмітрыева ў Магілёве, другі брат Іван жыў у Томастоне, штат Канектытут, ЗША, таксама працаваў рабочым. Арыштаваны 8.12.1936. Пры вобыску разам з інш. рэчамі забраны і пашпарт В. (серыя ФД № 043726). Асуджаны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці 28.10.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.4.1956. Асабовая справа В. № 5913-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

4.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Свярдлова, д. 60, кв. 4 арыштавана на той час рабочая Мінскай скураной фабрыкі імя Куйбышава (а ў 1930–36 член ВКП(б), партыйны і савецкі работнік у Мінску і Смалявічах) **Растоўская Рэвека Лазараўна** (н. 31.3.1904 у г. Цельшы Ковенскай губ., цяпер Літва, у сям'і службоўца), жонка Віктара Вайнова. 16.5.1938 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 4.9.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 17.1.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Р. № 5881-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Жертвы политического террора…; Рэпрэсаваныя…*



АНКЕТА АРЕСТОВАННОГО

З асабовай справы № 591 З-с.

ВАРОНЧАНКА Аляксандр Аўксенцевіч [14.2.1905, Чэрыкаў Магілёўскай губ., цяпер Магілёўская вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны дзеяч. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Уступіў у ВКП(б). У 1935–36 — загадчык агітацыйна-масавага аддзела Мінскага гаркама КП(б)Б, пасля сакратар Кагановіцкага РК КП(б)Б Мінска, наркам асветы БССР. Арыштаваны 3.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Валадарскага, д. 28. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «актыўны член антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі, створанай па заданні палякаў» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 16.5.1957. Асабовая справа В. № 10308-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

20.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Чыгуначная, д. 10, кв. 1 арыштавана настаўніца Мінскай вячэрняй школы № 15, маці дваіх дзяцей **Варончанка (Ясэпкіна) Хася Самуілаўна** (н. ў 1908 у мяст. Хіславічы Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Аляксандра Варончанкі. 28.11.1937 асуджана асобай нарадай пры НКВД як «член сям'і ворага народа, прыгаворанага да ВМП» і «саўдзельніца яго контррэвалюцыйных злачынстваў» да 8 гадоў ППК. Этапавана ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 28.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана прэзідыумам Мінскага абл. суда 27.7.1957. Асабовая справа В. № 10634-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*



ВОЛЬНЫ Анатоль [сапр.: **Ажгірэй Анатоль Усцінавіч**; 19.11(2.12).1902, ст. Пухавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, празаік, кінадраматург, журналіст. З сям'і службоўца. Вучыўся ў Ігуменскай гімназіі (паступіў у 1911). У 1920 пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную армію. Пасля дэмабілізацыі ў 1921 працаваў у ЦК ЛКСМБ, у газ. «Малады араты». Вучыўся ў БДУ. Публікаваўся з 1921. У 1920–30-х г. быў актыўным удзельнікам літаратурна-мастацкага руху ў Беларусі. З 1923 —

у літаб'яднанні «Маладняк». Адзін з пачынальнікаў прыгодніцкага жанру ў бел. прозе. Член СП Беларусі з 1934; заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1935). Паводле сцэнарыяў В. пастаўлены фільмы «Хвоі гамоняць» (1929, сааўтар К. Дзяржавін), «Атэль «Савой» (1930), «У агні народжаныя» (1930), «Сонечны паход» (1931), «Новая радзіма» (1935) і інш. Яго называлі «майстрам контррэвалюцыйных анекдотаў». Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 4.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. М. Горкага, д. 4, кв. 6. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 3.12.1957. Асабовая справа № 11054-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсаваны і сваякі В.

Тв.: Камсамольская нота: Вершы. Мн., 1924 (з А. Александровічам); Ваўчаняты: Раман беларускіх лясоў / Сааўт. А. Александровіч, А. Дудар. Мн., 1925 (2-е выд. 1929); Два: Аповесць. Мн., 1925; Чарнакудрая радасць: Вершы. Мн., 1926; Зборнік фельетонаў. Мн., 1927; Табе: Вершы. Мн., 1927; Суседзі: Гумарэскі і фельетоны. Мн., 1932; Шасцідзесятая паралель: Кінааповесць. Мн., 1935.

Кр.: *Айзенштадт Г.* Ждите нас, звезды!: Докум. очерк о комс. поэте, журналисте и сценаристе А. Вольном // *Знамя юности.* 1978. 5 окт.; *Айзенштат Г.* З ліку першапраходцаў // *Чырвоная змена.* 1981. 21 крас.; *Брадзянскі Б.* На шляху да рэалізму: Пра творчасць кінадраматурга А. Вольнага // *ЛіМ.* 1935. 16 сак.; *Шушкевіч С.* Талент, загартаваны Кастрычнікам: Да 70-годдзя з дня нараджэння А. Вольнага // *ЛіМ.* 1972. 1 снеж.; Яго ўспамінаюць добрым словам // *Шушкевіч С.* Выбр. тв.: У 2 т. Т. 2. Мн., 1978; *БП.* Т. 2; *Рэпрэсаваныя...*



ГАЛАВАЧ Платон Раманавіч [5(18).4.1903, в. Пабокавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], празаік. У 1922–23 — інструктар Барысаўскага павятовага камітэта камсамола, з 1926 — загадчык аргаддзела, з 1928 — першы сакратар ЦК ЛКСМБ. У 1929–30 — нам. наркама асветы БССР. У 1922–23 вучыўся ў Мінскай партшколе, у 1926 скончыў Камуністычны ун-т Беларусі. Быў рэдактарам газ. «Чырвоная змена», час. «Малад-

няк», «Полымя». З'яўляўся адным з лідэраў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і БелАПП. Ініцыятар арганізацыі крытыка-творчага аддзялення МПІ. З пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці (1921) Г. змагаўся за чысціню роднай мовы, за яе дакладнасць і выразнасць. Першае апавяданне «Загубленае жыццё» апублікавана ў газ. «Савецкая Беларусь» у 1925. У 1927 выйшла кніга апавяданняў «Дробязі жыцця». Тэматыка шматлікіх аповесцяў, апавяданняў, нарысаў звязана з грамадзянскай вайной і жыццём вёскі. Яго творы карысталіся поспехам, перакладаліся на рускую, польскую, украінскую, чэшскую, яўрэйскую і інш. мовы.

Як успамінаў паэт Павел Пруднікаў (таксама рэпрэсаваны), *«Платон Галавач быў рослы, стройны, прыгожы малады чалавек з бялявай чупрынай, якой не стараўся закрываць свой шырокі і высокі лоб, з блакітнымі вачамі, белымі, як цукар, зубамі, з правільнымі рысамі твару, на якім заўсёды ззяла ўсмешка, акуратна апрануты і абуты. Пераважна любіў хадзіць у светла-шэрым касцюме і белай кашулі-касаваротцы, вышытай беларускім народным арнаментам і падпяразанай тонкім поясам з кутасамі. Ён заўсёды з кожным быў прыветлівы і стараўся трымацца роўным. У час гутаркі ніколі не перабіваў свайго субяседніка. Спачатку даваў магчымасць выказацца яму, а потым ужо гаварыў сам, ніколі ні на каго не павышаў голасу. Скажу шчыра — не любіць яго было нельга».*

А вось што прыгадваў пра пісьменніка Я. Скрыган (таксама рэпрэсаваны) у сваёй кнізе «Некалькі хвілін чужога жыцця» (Мн., 1990. С. 52): «*Любіў глядзець трошачкі спадылба, гаварыў вельмі спакойна і ціха, голас у яго быў мяккі, з малюсенькім насавым гучаннем. І здалося зусім нечаканым, што няма ў яго ні рэзкага жэсту, які звычайна выпрацоўвае прафесія, ні строгага позірку, ні павышанай камандзірскай ноты — усё па-чалавечы проста і душэўна*».

Арыштавалі Г. 11.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Маскоўская, д. 8/1, кв. 34. Пры вобыску следчыя канфіскавалі 67 сшыткаў рукапісаў (магчыма, сярод іх быў і раман «Ён»). У сувязі з арыштам выключаны з ВКП(б). Ва ўнутранай турме НКВД лёс звёў Г. з яшчэ адным рэпрэсаваным пісьменнікам С. Шушкевічам, які пазней успомніў такі эпізод (прыведзены ў кнізе В. Куляшовай «Лясному рэху праўду раскажу», Мн., 1989): *«Платона Галавача і Васіля Каваля я бачыў апошні раз 3 кастрычніка 1937 года. Іх прывялі сведчыць супраць мяне. Скатаваны і знясілены, Платон Раманавіч доўга маўчаў... Нарэшце загаварыў: «За [мной] няма ніякай віны, таксама, як і за кожным з нас». Сказаў і заплакаў...»*

Перад «судом» Г. пакінуў у камеры запіску: *«Таварышы, даруйце, калі чым вінаваты перад вамі. Гісторыя яшчэ скажа праўду*

пра нас. Платон». Але на «судзе» (пачаўся ў 22.15, а скончыўся праз пятнаццаць хвілін) вінаватым сябе прызнаў.

28.10.1937 у 22.30 тройкай НКВД асуджаны як «арганізатар тэрарыстычнай групоўкі» і за «правядзенне нямецка-фашысцкай дзейнасці» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны праз некалькі гадзін пасля прысуду.

З сакрэтнай даведкі начальніка 1-га спецаддзела НКВД Шавялёва: *«Акт аб выкананні прысуду захоўваецца ў Мінску ў Асобым архіве 1-га спецаддзела НКВД СССР том 8 ліст 16».*

Асабовая справа Г. № 6852-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Многія яго творы засталіся няскончанымі, у тым ліку кніга пра паўстанне 1863–64 і К. Каліноўскага. Імем Г. названы вуліца і завулак у Бабруйску. У 1968 на будынку Гарбацэвіцкай школы Бабруйскага р-на, дзе вучыўся Г., адкрыта мемарыяльная дошка.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Маскоўская, д. 8/1, кв. 34 арыштавана хатняя гаспадыня, маці дачкі Галіны і сына Ралана **Вечар Ніка Фёдараўна** (н. ў 1905 у в. Машчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ.), жонка Платона Галавача. 28.11.1937 асуджана асобай нарадай пры НКВД як «член сям'і расстралянага ворага радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР (в. Далінская). Пасля вызвалення вярнулася на радзіму. Рэабілітавана трыбуналам БВА 24.7.1956. Асабовая справа В. № 6759-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

У асабовай справе Г. захоўваецца рапарт:


Зам. Министра внутренних дел БССР полковнику Ханяк.

Рапорт.

В 1 спецотдел МВД БССР поступило заявление Вечер Нины Федоровны о розыске Головача Платона Романовича, осужденного ВК Верховного суда СССР к ВМН.

Прошу вашего согласия объявить заявителю Вечер Н. Ф., что муж ее, Головач П. Р., находясь в лагере, 25 декабря 1944 г. умер от паралича сердца.

Начальник 1 спецотдела МВД БССР майор Минаев.



П. Галавач з жонкай Нінай Фёдараўнай. 1928 г.

На рапарце ёсць рэзалюцыя: *«Согласен. 19.VIII»* (1956 г. — *Л. М.*) *Подпіс.*

Тв.: Збор твораў: У 3 т. Мн., 1958. Т. 1. Апавяданні. Нарысы. Артыкулы. Т. 2. Аповесці. Т. 3. Праз гады: Раман; Пісьмы // Полымя. 1963. № 4; Некалькі слоў пра сябе // Пра час і пра сябе. Мн., 1966; Праз гады. Мн., 1992; Спалох на загонах. Мн., 1996.

Кр.: *Булацкі Р. В., Карніловіч Э. А.* Платон Галавач — публіцыст. Мн., 1973; *Бугаёў Дз.* З кагорты першых // Бугаёў Дз. Талент і праца. Мн., 1979; *Каленкович И.* Творчество Платона Галавача: (Жанрово-стилевое своеобразие): Автор. дис. канд. филол. наук. Мн., 1979; *БП.* Т. 2; *ЭГБ.* Т. 2; *Рэпрэсаваныя...*

ГЕРШОН Іосіф Хаімавіч [лют. 1900, Бабруйск Мінскай губ., цяпер Магілёўская вобл. — 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны служачы. З сям'і рабочага. Атрымаў пачатковую адукацыю. У 1919 уступіў у ВКП(б). Падчас арышту — нам. наркама асветы БССР. Арыштаваны 26.6.1937 у Мінску па адрасе: вул. Камунальная, д. 21/25, кв. 7. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29.10.1937 як «член антысавецкай тэрарыстычна-шпіёнскай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 13.8.1957. Асабовая справа Г. № 10812-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

4.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Рабкораўская, д. 16, кв. 8 арыштавана настаўніца школы слабаадукаваных пры Мінскай войлачнай фабрыцы, маці дваіх дзяцей **Гершон (Шведзік) Броня Борухаўна** (н. 9.8.1898 у Бабруйску; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Іосіфа Гершона. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 29.8.1943. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 13.1.1956. Асабовая справа Г. захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

ДЗЕНІСКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч [26.4(9.5).1904, в. Закаблукі Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны дзеяч. З сям'і рабочага. Атрымаў сярэднюю адукацыю, працаваў слесарам на Мінскай чыгунцы. З 1921 — на камсамольскай рабоце. З 1925 — сакратар Аршанскага камітэта ЛКСМБ, потым на партыйнай рабоце. У 1930 скончыў курсы партыйных работнікаў у Маскве. З 1933 — загадчык аддзела ЦК КП(б)Б, сакратар Лёзненскага райкама, Віцебскага гаркама КП(б)Б (1937), другі

сакратар ЦК КП(б)Б. Арыштаваны з жонкай 26.7.1937 на дачы ЦК КП(б)Б «Гарадзішча». Асуджаны за «ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі правых» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 25.2.1956. Асабовая справа Д. № 5900-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

26.7.1937 разам з мужам арыштавана ўрач Лёзненскай бальніцы **Коршун Ірына Васілеўна** (н. 4.12.1912 у Мінску ў сям'і рабочага), жонка Мікалая Дзяніскевіча. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы, прыгаворанага да ВМП» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР, потым у Салікамскі інвалідны лагер НКВД Молатаўскай (цяпер Пермскай) вобл. Вызвалена 26.7.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 10.12.1955. Асабовая справа К. № 6301-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.


З нарыса Н. Курганавай і П. Марцава «Личный номер — 902»:

«Со страхом ждала ночи (успамінае Ірына Коршун. — **Л. М.**). *Каменные стены не могли заглушить вопли и стоны заключенных. Конвейер допросов замедлял свой бег лишь днем. Однажды забрали польку. Прошло двое суток. Ее уже перестали ждать. Через неделю в камеру на носилках внесли какую-то грязную женщину и вывалили на пол. Ее подняли, уложили на нары. Четырехугольное опухшее лицо, такое же тело, ноги. Вся в кровоподтеках». Ирина делала «новенькой» холодные примочки. Когда та пришла в сознание и произнесла ее имя, по голосу Коршун узнала польку! Почти восемь суток она простояла на допросе под ярким светом. Падала. Отливали водой, поднимали. Били по суставам пивными бутылками. Она назвала лучших коммунистов Польши, предала мужа. Подписала все!..*

Однажды днем Ира услышала у двери своей камеры крик Н. Денискевича: «Ирочка, родная». Затем слышно было, как он вырвался и бежал по коридору с криком: «Клянусь тобой, ни в чем не виноват!» Ирина стала стучать в дверь кулаками, мисками, кружками. Она истерично кричала: «Звери, куда его увели, так не издеваются в фашистских тюрьмах над политзаключенными, как здесь над невиновными людьми!»[1]

Кр.: *Жертвы политического террора...; ЭГБ.* Т. 3*; Рэпрэсаваныя...*

[1] Правда истории: память и боль. Мн., 1991.



ДЗЯКАЎ Ананій Іванавіч [1.10.1896, в. Багданаўка Мсціслаўскага пав., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны дзеяч, педагог. З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу. Удзельнічаў у 1-й сусветнай вайне. За мужнасць у баях атрымаў афіцэрскае званне. У 1918 уступіў у ВКП(б), узначаліў Вяземскі зямельны аддзел. У 1919–23 служыў у Чырвонай арміі (камандзір роты). З 1923 — нам. старшыні Мсціслаўскага павятовага выканкама. У 1924 прызначаны нам. старшыні (потым старшынёй) Магілёўскага акруговага выканкама. У ліп. 1928 накіраваны на вучобу ў Прамысловую акадэмію ў Маскву, але вучыцца не давялося — быў прызначаны нам. старшыні (пазней старшынёй) Віцебскага выканкама. У 1930–34 вучыўся ў Маскве ў Інстытуце чырвонай прафесуры. З лют. 1934 — нам. рэктара, рэктар БДУ. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. З восені 1935 загадчык аддзела ЦВК БССР. У ліп. 1936 прызначаны наркамам асветы БССР. Арыштаваны 11.5.1937 у Мінску па адрасе: вул. Горкага, д. 21/52, кв. 24. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член нацыянал-фашысцкай арганізацыі, які праводзіў шкодніцкую работу ў галіне народнай асветы» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 3.4.1957. Асабовая справа Д. № 10175-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

22.9.1937 у Мінску па адрасе: вул. 11 ліпеня, д. 18, кв. 2 арыштавана хатняя гаспадыня **Дзякава Марыя Іванаўна** (н. 19.2.1904 у Мсціславе, атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю), жонка Ананія Дзякава. 28.11.1937 асобай нарадай НКВД асуджана як «жонка здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 22.9.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 8.6.1956. Яе асабовая справа № 6688-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Яноўскі А., Зельскі А.* Гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў біяграфіях яго рэктараў. Мн., 2001. С. 47–60; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*





Н. Вішнеўская.

ДУДАР Алесь [сапр.: **Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч**; 24.12.1904, в. Навасёлкі Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, крытык, перакладчык, першы муж паэткі і настаўніцы Наталлі Вішнеўскай[1]. З бел. сялянскай сям'і. У час 1-й сусветнай вайны Дайлідовічы знаходзіліся ў бежанстве. Выязджалі ў Тамбоўскую вобл. (Казлоў, цяпер Мічурынск). Вясной 1917 сям'я вярнулася ў Беларусь. Пасля сканчэння (1921) сярэдняй школы (па іншых звестках — сямігодкі) Д. уступіў у тэатральную трупу славутага У. Галубка. Першы верш апублікаваў у 1921 у газ. «Савецкая Беларусь». У 1923 — адзін з заснавальнікаў мінскай, віцебскай і полацкай філій «Маладняка». Выступаў таксама як крытык і празаік. Перакладаў з рускай, нямецкай, французскай моў. У 1927–28 вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага ф-та БДУ.

Алесь Звонак успамінаў: *«Малады, круглатвары, з усмешліва-цёплым позіркам, высокі і зграбны... вочы яс-*

[1] Вішнеўская Наталля Вячаславаўна [3.5.1907, Коўна, цяпер Каўнас, Літва — 3.5.1989, Ленінград], паэтэса, рэдактар. У час 1-й сусветнай вайны з бацькамі ў эвакуацыі ў Самарскай губ. Пасля грамадзянскай вайны Вішнеўскія жылі на Случчыне. Тады пачала пісаць вершы. Уплыў на фарміраванне паэтэсы аказаў Якуб Колас, які ўвёў яе ў літаб'яднанне «Маладняк» і дапамог стаць студэнткай МБПТ (1924). Удзельнічала ў 1-м з'ездзе «Маладняка» (1925). Публікавалася з 1926. У 1928, на апошнім курсе вучобы, пабралася шлюбам з А. Дударом, з якім пазнаёмілася ў «Маладняку». Неўзабаве мужа арыштавалі і выслалі ў Смаленск. Нягледзячы на ярлык жонкі «ворага народа», В. удалося паступіць у БДУ (1929). Аднак на працягу года яе творы не друкаваліся, яна не магла знайсці працы, часам галадала. У 1930 «Малад-



А. Дудар і В. Каваль.

ныя, усмешлівыя, з нейкімі іскрынкамі. Голас мяккі, задушэўны, здаецца, крыху з прышэптам... Гэта і ёсць Алесь Дудар»[1].

У выніку кампаніі супраць бел. пісьменнікаў-студэнтаў Д. вымушаны пакінуць ун-т. У снеж. 1927 выйшаў з «Маладняка» і далучыўся да новага аб'яднання «Полымя». За верш «Пасеклі наш край папалам...» арыштаваны ДПУ 20.3.1929; высланы на тры гады ў Смаленск. Зноў арыштаваны ў Смаленску 22.7.1930 і прывезены ў Мінск на допыты па справе «Саюза вызвалення Беларусі». У 1931 зноў у Смаленску. Пасля сканчэння тэрміну высылкі вярнуўся ў Мінск. Сябра СП БССР з 1934. У 1935–36 у асноўным займаўся перакладамі. Трэці раз арыштаваны 31.10.1936 у Мінску па адрасе: вул. Праўдная, д. 15а, кв. 2. Як з «нацдэмам са стажам»,

няк» і «Савецкая Беларусь» зноў пачалі друкаваць вершы В. У сувязі з узбуджэннем новай справы на А. Дудара і выклікам В. на допыты яна вырашыла шукаць паратунку ў Маскве (1930). Тут працавала ў бел. секцыі Дзяржвыдавецтва народаў СССР. Пасля яе ліквідацыі перайшла ў газ. «Гудок», рэдагавала бел. старонку. Там пазнаёмілася са сваім другім мужам А. Звонакам. У 1934 вярнулася ў Мінск. У 1936 па справах А. Дудара і А. Звонака зноў выклікалася на допыты. Арышту пазбегла дзякуючы падказцы знаёмага следчага. Разам з маці пераехала ва Украіну, потым у Ленінград (1938), дзе выйшла замуж за бел. паэта Я. Бобрыка. З 1942 — у Горкаўскай вобл. У 1945 вярнулася ў Ленінград, працавала бібліятэкарам. Выгадавала двух дзетдомаўскіх хлопцаў (абодва сталі капітанамі далёкага плавання). У канцы 1940-х — пачатку 1950-х г. зноў выклікалася на допыты ў МДБ. З 1962 на пенсіі. Да літаратурнай дзейнасці не вярнулася.

[1] *Звонак А.* Неспакойныя сэрцы. Мн., 1973.

следчыя з Д. доўга не цырымоніліся і адразу пачалі катаваць. «Гутаркай» з паэтам займаўся вядомы сваімі садысцкімі схільнасцямі следчы Быхоўскі. Пасля трохсутачнага «канвееру» паэт «успомніў», што сапраўды лічыў, быццам *«Москва русифицирует Беларусь... и все беды Беларуси идут от Москвы... а период с двадцать пятого по двадцать шестой годы был золотым веком истории белорусской литературы...»*[1].

Журналіст З. на адным з допытаў у НКВД, не вытрымаўшы катаванняў, паведаміў пра такі выпадак: *«Дудар вытащил спрятанные фото высланных нацдемов и, вспоминая о совместной с ними деятельности, высказывался об этом периоде как о расцвете белорусской культуры...»*

28.10.1937 Д. быў асуджаны тройкай НКВД як «член антысавецкай аб'яднанай шпіёнска-тэрарыстычнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці**.** Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 21.9.1957.

Тв.: Выбраныя творы. Мн., 1959; Вежа: Вершы і паэмы. Мн., 1984.

Кр.: *Багдановіч І.* Будучыня з сінімі крыламі: Літаратурны партрэт А. Дудара // *Роднае слова*. 1994. № 12; *Міхнюк У.* Арыштаваць у высылцы: Дакументальны нарыс пра Алеся Дудара. Мн., 1996; *Маракоў Л.* Алесь Дудар: штрыхі да партрэта пісьменніка // *Роднае слова*. 2001. № 12.



ДУНЕЦ Хацкель Майсеевіч [студз. 1897, Слонім Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], крытык, публіцыст. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. З 1920 у РКП(б), на партыйнай рабоце ў Віцебску. З 1926 у Мінску. Публікаваўся з 1927. Працаваў нам. рэдактара яўрэйскай газ. «Октобэр», рэдактарам газ. «Літаратура і мастацтва», быў адным з кіраўнікоў яўрэйскай секцыі СП БССР. У 1930–35 нам. наркама асветы БССР. Сябра СП БССР з 1934. У сярэдзіне 1930-х г. абвінавачваўся ў трацкізме. У 1935 выключаны з партыі, зняты з усіх адказных пасад. Працаваў культработнікам на

[1] З асабовай справы А. Дудара № 10861-с (захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі).

заводзе імя Кірава. Арыштаваны 8.6.1936 у Мінску па адрасе: вул. Кірава, д. 5/30, кв. 3. Асуджаны 27.8.1936 да 5 гадоў ППК. Этапаваны ва Ухта-Пячорскі канцлагер НКВД Комі АССР. Зноў арыштаваны ў крас. 1937, этапаваны ў Мінск. 28.10.1937 тройкай НКВД прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Верагодна, рэпрэсавана і жонка Д. Па першай справе (№ 19688-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 24.1.1967 калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР, па другой — 2.3.1967.


Кр.: Рашэнні парткома Наркамасветы і Саюза савецкіх пісьменнікаў па справе тав. Дунца: Пастанова бюро Мінскага гаркома КП(б)Б // *ЛіМ*. 1935. 23 лют.; *БП*. Т. 2; *Рэпрэсаваныя...*

ЖЫВУЦКІ Іван Сцяпанавіч [17.9.1912, в. Зарэмец (?) Ігуменскага або Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяперашняе месцазнаходжанне не ўстаноўлена — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], педагог. З сям'і вясковага каваля бел. паходжання, у сярэдзіне 1930-х г. старшыні калгаса. Скончыў МПІ (1934). Выкладаў бел. і рускую мову і літаратуру ў СШ мяст. Заслаўе Мінскага р-на. Маці Ж. Леанора Адольфаўна — хатняя гаспадыня. Брат Іосіф (н. ў 1910) знаходзіўся ў Марыінскім канцлагеры НКВД Кемераўскай вобл.; другі брат (імя невядома, н. ў 1911) вучыўся на рабфаку ў Мінску; малодшы брат Віктар (н. ў 1921) вучыўся ў школе. Арыштаваны 14.10.1937. Асуджаны 28.10.1937 пазасудовым органам НКВД як «удзельнік контррэвалюцыйнай шпіёнскай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 19.10.1959. Асабовая справа Ж. № 14857-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД*.

ЗАМАЛІН Навум Міхайлавіч [1905, мяст. Кадзіна Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — 29 ці 30.10.1937, Мінск, турма НКВД]. З мяшчанскай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Уступіў у ВКП(б). Да арышту дацэнт Віцебскага ветэрынарнага інстытута. Быў жанаты. Арыштаваны 25.7.1937. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «удзельнік антысавецкай дыверсійна-тэрарыстычнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР 9.2.1967. Асабовая справа З. № 13401-п з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.


АНКЕТА АРЕСТОВАННОГО

З асабовай справы № 14857-с.



ЗАРЭЦКІ Міхась [сапр.: **Касянкоў Міхаіл Яўхімавіч**; 20.11.1901, в. Высокі Гарадзец Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], празаік, драматург, перакладчык, крытык. Дзяцінства прайшло ў в. Зарэчча пад Шкловам — адсюль паходзіць і псеўданім. Вучыўся ў Аршанскім духоўным вучылішчы і Магілёўскай духоўнай семінарыі (у 1917 пакінуў семінарыю пасля 2 гадоў вучобы). У 1919 настаўнічаў на Магілёўшчыне. Уступіў у ВКП(б). У 1920–27 палітработнік Чырвонай арміі. Публікавацца пачаў у 1922. З 1924 член літаб'яднання «Маладняк», уваходзіў у Цэнтральнае бюро арганізацыі. У 1926–27 рэдагаваў час. «Маладняк». У 1927 стаў адным з ініцыятараў утварэння новага літаб'яднання «Полымя». У жн. — кастр. 1927 у складзе дэлегацыі бел. літаратараў наведаў Латвію, Чэхаславакію, Германію, Францыю. Адзін з ініцыятараў тэатральнай дыскусіі ў ліст. 1928 [артыкулы «Два экзамены (Да пытання аб тэатральнай крытыцы)», «Чым пагражае нам Белдзяржкіно? (Да крытыкі тэматычнага плана)»]. Выступленні З. у друку былі расцэнены як праявы нацыянал-дэмакратызму. Разам з А. Александровічам і А. Дударом заявіў пра выхад з БДУ (публікацыя ў «Савецкай Беларусі» 4.12.1928). У 1929 выключаны з ВКП(б) за «праяўленне нацыянал-дэмакратызму». Член СП Беларусі з 1934. Працаваў загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва АН БССР. Ажаніўся, гадаваў сына Вячаслава і дачку Радаміру.

П. Пруднікаў успамінаў: *«Гэта быў стройны, вышэй сярэдняга росту, бландзіністы, маладжавы на погляд чалавек. Заўсёды акуратна апрануты, падцягнуты, добра прычэсаны, чыста паголены. Твар яго меў удумліва-дабрадушны выгляд, вочы — сіне-блакітныя. Гаварыў ціха, але пераканаўча. Ніколі не павышаў голасу. Паходка была быстрая, імклівая, але не мітуслівая».*

Я. Скрыган удакладняў: *«У 1927 годзе Міхась Зарэцкі выглядзеў зусім іначай* (чым аўтар гэтых радкоў. — **Л. М.**). *Гэта быў ужо ў поўным сэнсе слова пісьменнік і інтэлігент. Папулярнасці і славе яго адпавядаў вонкавы выгляд. Апрануты ён быў, як тады казалі, чыста па-еўрапейску: самае моднае элегантнае паліто, бліскучыя пальчаткі і капялюш. А капялюш на той час мала хто насіў, гэта было нават вельмі смела. Бачылі яго найчасцей*



М. Касянкоў і Р. Касянкова (брат і дачка М. Зарэцкага).

разам з А. Александровічам і А. Дударом... Мы тады зачытваліся М. Зарэцкім. Пісаў ён многа, горача і ярка»[1].

Арыштаваны 3.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. Абутковая, д. 23, кв. 3.

Пратакол вобыску ў кватэры М. Зарэцкага:

Взято для доставления в НКВД Белоруссии следующее:

Паспорт.

Заграничный паспорт.

Удостоверение СП № 1543.

Другие документы:

писем — 44 штуки, открытки — 13 шт., адресов телеф. и телег. — 10 штук, телеграмм — 3 шт., 9 пакетов с выписками из контрреволюционной троцкистской литературы, 19 записных книжек, 20 тетрадей с разными записями (магчыма, сярод іх быў і раман «Крывічы». — **Л. М.**)*, фотокарточек — 20 шт., групповых фото — 50 шт., написанных общих тетрадей — 2 шт.*

Рукопись на 3129 листах. Разная переписка на 953 листах...

Книг с автографами — 83 шт., книг разных авторов и изданий — 80 шт., Зарецкий — сочинения — 36 шт.

Асуджаны тройкай НКВД 28.10.1937 у 18.30 (пасяджэнне працягвалася 15 хвілін) як «актыўны член нацыянал-фашысцкай тэрарыстычнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 7.12.1957. Асабовая справа К. № 11069-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Многія рукапісы З. загінулі, у прыватнасці, гістарычная драма «Рагнеда» (1929), працяг рамана «Крывічы».

[1] *Скрыган Я.* Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1990. С. 33.

Таксама рэпрэсавана жонка пісьменніка **Марыя Іванаўна Касянкова** (некаторы час пакаранне адбывала з Л. Геніюш).

Два дакументы з асабовай справы Міхася Зарэцкага:

Секретно

Справка

Приговор о расстреле Косенкова-Зарецкого Михаила Ефимовича приведен в исполнение в Минске 29/X–1937. Акт о приведении приговора в исполнение хранится в Особом архиве в спецотделе НКВД СССР, т. 8, лист 155.

Нач. отд. спец. отд. НКВД СССР

лейтенант госбезопасности Шевелев.

22 октября 1956. Секретно.

Начальнику Главного управления милиции МВД СССР,

Начальнику 1 спецотдела МВД СССР,

Главному военному прокурору.

Прошу дать указание соответствующему отделу ЗАГС о выдаче гражданке Косенковой Марии Ивановне свидетельства о смерти ее мужа Зарецкого М. Е.:

«Зарецкий Михаил Ефимович, 1901 г. рождения, был осужден Военной Коллегией Верховного Суда СССР 28 октября 1937 г. и, отбывая наказание, умер 13 июня 1941 г.»

Гр. Косенкова М. И. проживает по адресу:

г. Баку 40, III Поперечная, д. 15, кв. 3.

Зам. Председателя Военной Коллегии Верховного Суда СССР

А. Борисоглебский.

Тв.: Збор твораў. Т. 1–4. Мн., 1989–1992.

Кр.: *Мушынскі М.* Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага. Мн., 1991; *БП.* Т. 2; *ЭГБ.* Т. 3; *Рэпрэсаваныя...*

ІСПРАЎНІКАЎ Прохар Іванавіч [16.3.1902, в. Трыбулінцы (?) Вяліжскага або Віцебскага пав. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], журналіст. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Уступіў у ВКП(б). У першай палове 1930-х г. нам. дырэктара па гаспадарчай часці Віцебскай ветэрынарнай станцыі. З кастр. 1936 упаўнаважаны Галоўліта, нам. загадчыка сельскагаспадарчага сектара (аддзела) газ. «Віцебскі пралетарый». Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 3.7.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 1-я Свярдлова, д. 19. Перавезены ў Мінск. На допытах яго жорстка катавалі, і ён агаварыў сябе, прызнаў, што з'яўляўся «членам фашысцкай арганізацыі, контррэвалюцыянерам, трацкістам,

шкодні кам», «праводзіў работу па зрыве выпуску супрацьсібіраязвеннай сыроваткі» і г. д. Асуджаны тройкай НКВД 29.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 10.6.1958. Асабовая справа І. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ф. 4, в. 21, с. 1097, л. 151—152; *Рэпрэсаваныя…*

КАВАЛЁЎ Захар Ціханавіч [1900, в. Узлогі Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хоцімскі р-н Магілёўскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны работнік. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1922). Працаваў сакратаром Чэрыкаўскага гаркама КП(б)Б, быў загадчыкам аддзела Аршанскага акругкама. Падчас арышту — сакратар Варашылаўскага РК КП(б)Б. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 9.9.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 171, кв. 6. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Абвінавачваўся ў тым, што «праводзіў шкодніцкую работу ў сельскай гаспадарцы — тармазіў калгаснае будаўніцтва, насаджаў у вёсцы хутары і г. д.; пры абмене партыйных дакументаў знарок зберагаў патрэбныя арганізацыі контррэвалюцыйныя кадры». Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 14.11.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа К. № 10990-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка К.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.



КАВАЛЬ Васіль [сапр.: **Кавалёў Васіль Пятровіч**; 4(17).8.1907, в. Сава Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], празаік. У 1925 скончыў агульнаадукацыйныя курсы пры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі; увосень 1925 паступіў у Магілёўскі педтэхнікум. Тады ж быў прыняты ў літаб'яднанне «Маладняк». Пачаў друкавацца ў 1926 у час. «Аршанскі маладняк». У 1926–29 (з перапынкам) вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага ф-та БДУ, але кінуў вучобу і пайшоў на творчую працу. Пасля дру-



Злева направа: В. Каваль, С. Дарожны, З. Астапенка, Ю. Таўбін. Пачатак. 1930-х гг.

гога расколу «Маладняка» ў 1928 абраны членам Цэнтральнага бюро аб'яднання і ўведзены ў рэдакцыйную групу час. «Маладняк», дзе застаўся пасля ўтварэння БелАПП. Увосень 1928 крытык А. Мардвілка пісаў: *«Ніхто* (як В. Каваль. — **Л. М.**) *не ахапляе так эмацыянальна сілу зямлі і цягу да яе чалавека, самую існасць сялянскага жыцця і працы».* З 1931 К. — актыўны ўдзельнік Беларускага літаратурнага аб'яднання Чырвонай арміі і Флота. У 1932–34 служыў у войску, быў ваенным журналістам газ. «Красноармейская правда» ў Смаленску.

Я. Скрыган успамінаў: *«Аказалася, што ён зусім не пявучы, не такі паэтычны і ласкавы, як назва яго кнігі* («Як вясну гукалі». — **Л. М.**), *а наадварот, маўклівы, спакойны, з чорнымі і цвёрдыміваласамі, трохі насуплены, задуманы, трохі недаверлівы, з нізка апушчанаю галавою, з цяжкаю верхняю губою і як бы пужлівымі вачыма... Усміхаўся ён скупа, як бы баючыся, каб чаго нядобрага не падумалі пра яго ўсмешку»*[1].

Арыштавалі К. 2.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. Маскоўская, д. 3/2, кв. 4. Асудзілі 28.10.1937 як «члена антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі К. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда

[1] *Скрыган Я.* Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1990.

СССР 24.9.1957. Асабовая справа К. № 10898-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Выбраныя творы. Мн., 1932; Выбранае: Аповесці і апавяданні. Мн., 1959; Следапыты; Санька-сігналіст. Мн., 1961.

Кр.: *Пальчэўскі А.* Васіль Каваль // Пальчэўскі А. Выбр. тв. Т. 2. Мн., 1975; *Казека Я.* Васіль Каваль // Казека Я. Падарожжа ў маладосць. Мн., 1984; *Грамадчанка Т.* Васіль Каваль // Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20–30-х гг. Мн., 1985; *БП.* Т. 3; *ЭГБ.* Т. 3; *Рэпрэсаваныя...*

КАВАЛЬЧУК Захар Захаравіч [1893, в. Крыўляны Пружанскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З бел. сялянскай сям'і. З 1911 у ЗША. Працаваў на аўтамабільных заводах Дэтройта ліцейшчыкам, страгальшчыкам. У 1916 уступіў у члены Рускай федэрацыі, якая ўваходзіла ў Сацыялістычную партыю Амерыкі. Пасля яе распаду стаў членам Кампартыі ЗША, за прыналежнасць да якой быў арыштаваны і высланы за межы краіны. Пераехаў у СССР. Працаваў ліцейшчыкам на заводзе Аўтамабільнага маскоўскага таварыства. Уступіў у ВКП(б) (1920). У 1921 паступіў у ВЧК, адкуль накіраваны на вучобу ў Маскоўскую савецкую партыйную школу. Пасля яе заканчэння член Маскоўскай павятовай кантрольнай камісіі, загадчык агітпрапа павятовага Маскоўскага камітэта. У 1930 накіраваны ў БССР. Працаваў сакратаром Аршанскага акруговага камітэта партыі, загадчыкам аддзела кадраў ЦК КП(б)Б. З 1932 старшыня ЦК прафсаюзаў БССР, член ЦК КП(б)Б. Пастановай Бюро ЦК КП(б)Б у 1936 вызвалены ад сваіх абавязкаў за прыналежнасць да трацкісцкай апазіцыі ў 1923. Выведзены са складу кандыдатаў у члены Бюро ЦК КП(б)Б, члена ЦВК БССР і Прэзідыума ЦВК БССР. Падчас арышту — дырэктар рыбакансервавага завода. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 29.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Ленінская, д. 36/43, кв. 22. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «актыўны член контррэвалюцыйнай тэрарыстычнай шпіёнскай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.9.1956 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа К. № 7252-с (спынена з-за адсутнасці складу злачынства) захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка К.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

КАНДРАШУК Мікалай Фёдаравіч [1897, мяст. Скідзель Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З бел. сялянскай сям'і. Член ВКП(б) з 1919. Падчас арышту — начальнік Упраўлення шкляной прамысловасці Наркамата лёгкай прамысловасці БССР. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 1.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Камуністычная, 3-ці дом Саветаў, кв. 26. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе польскай шпіёнскай тэрарыстычнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.4.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа К. № 10197-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка К.

У верас. 1937 органамі НКВД арыштаваны інжынер Аршанскага ільнокамбіната **Кандрашук Канстанцін Фёдаравіч** (н. ў 1894 у мяст. Скідзель), брат Мікалая Кандрашука. 20.10.1937 асуджаны за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП і 4.11.1937 расстраляны ў Віцебскай турме НКВД. Рэабілітаваны 4.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Канстанціна Кандрашука і інш. № 10895-п (усяго каля 30 чалавек) захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

КАНТАР Саламон Мендзелевіч [май 1894, Горкі Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. Член ВКП(б) з 1922. Да арышту — дырэктар Белпрамгандлю. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 18.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 32/1, кв. 11. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 6.7.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа К. № 10677-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка К.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

КАРАНЕЎСКІ Язэп Пятровіч [31.12.1887 (12.1.1888), Заслаўе Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны дзеяч, педагог, публіцыст. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1909), Віленскі настаўніцкі інстытут (1914). З 1915 выкладаў у Мінскім настаўніцкім інстытуце. У 1915–17 член культурна-асветнага гуртка «Наш край», з мая 1917 — арганізацыі «Маладая Беларусь». З 1916 у эвакуа-



цыі ў Яраслаўлі. У маі 1918 прыехаў у Мінск, дзе вёў перамовы з урадам БНР па пытанні рээвакуацыі Мінскага настаўніцкага інстытута. У 1919–20 школьны інспектар і выкладчык геаграфіі Мінскай беларускай гімназіі. У 1920 нам. старшыні Беларускай камуністычнай арганізацыі; са жн. 1920 член КП(б)Б, загадчык аддзела ў Наркамаце асветы БССР. Правадзейны член Інбелкульта з 1924. Быў дырэктарам МБПТ. Публікаваўся ў перыядычным друку па праблемах адукацыі. З 1926 — нам. старшыні Інбелкульта. З 1927 — прарэктар Камуністычнага ун-та імя У. Леніна, з кастр. 1928 — намеснік, з кастр. 1929 да ліп. 1931 — рэктар БДУ. З 1932 — у Маскве, нам. дырэктара па вучэбнай частцы Інстытута чырвонай прафесуры сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі. Арыштаваны 15.7.1937 у Маскве па адрасе: Цвярскі бульвар, д. 10, кв. 5. Крымінальную справу К. запатрабаваў НКВД БССР, і ён быў этапаваны ў Мінск.



Беларускія пісьменнікі У. Барашка, М. Хведаровіч, М. Нікановіч, Я. Каранеўскі, С. Дарожны, П. Броўка на курорце ў Сочы. 1931 г.

Пасля катаванняў на допытах у верас. 1937 прызнаўся ў «шпіянажы на карысць Польшчы», у правядзенні «контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай прапаганды». Асуджаны 28.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай нацыяналістычнай тэрарыстычнай шпіёнскай дыверсійнай арганізацыі» да ВМП. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 6.4.1957. Асабовая справа К. № 16406-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.



Пасля арышту К. арыштавана і асуджана да 5 гадоў пазбаўлення волі яго жонка **П. Г. Каранеўская**. Пакаранне адбывала з 3-гадовым сынам Юрыем.

Тв.: Да пачатку вучэбнага года // Асвета. 1924. № 3; Пaслякастрычніцкі перыяд // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. Мн., 1924; Інстытут беларускае культуры (Інбелкульт) // Наш край. 1927. № 10.

Кр.: *ЭГБ*. Т. 4; Гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў біяграфіях яго рэктараў. Мн., 2001; *Рэпрэсаваныя...*

КАРПЕНКА Іван Іванавіч [1905, мяст. Парычы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Светлагорскі р-н Гомельскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], навуковец. З сям'і службоўца. Атрымаў вышэйшую адукацыю. У 1930-я г. — загадчык лабараторыі Віцебскай ветэрынарнай станцыі. Жыў у Віцебску па адрасе: вул. 1-я Свярдлова, д. 19. Арыштаваны 26.6.1937. Перавезены ў Мінск. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29.10.1937 за «дзейнасць у складзе антысавецкай групы» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда

СССР 24.10.1957. Асабовая справа К. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

29.11.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 1-я Свярдлова, д. 19 арыштавана ветэрынарны ўрач Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі **Карпенка Аляўціна Васілеўна** (н. ў 1904 у мяст. Каршуноўка Тамбоўскай вобл., Расія), жонка Івана Карпенкі. Верагодна, у канцы 1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Цемнікоўскі канцлагер НКВД Мардоўскай АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 27.5.1957 трыбуналам Маскоўскай ВА. Асабовая справа К. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Рэпрэсаваныя...*



КЛЯШТОРНЫ Тодар Тодаравіч [26.2(11.3).1903, в. Парэчча Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, перакладчык. Пасля службы ў войску вучыўся на рабфаку ў Оршы. Першыя вершы апублікаваў у 1925 у час. «Аршанскі маладняк». Першы зборнік вершаў «Кляновыя завеі» выйшаў у 1927. Аўтар паэмы «Калі ася дае муць», у якой адзін з герояў сведчыў: «Мы ходзім пад месяцам і ГПУ». Пасля выйшлі зборнікі «Светацені» (1928), «Ветразі» (1929), «Палі загаманілі» (1930), «Праз шторм — на штурм» (1934). Член літаб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», БелАПП. Перакладаў рускую паэзію на бел. мову. На вершы К. напісаны песні І. Івановым, М. Равенскім. У 1931 скончыў БДУ. Працаваў на радыё, у рэдакцыях бел. газет і часопісаў. Член СП Беларусі з 1934.

П. Пруднікаў успамінаў: *«Тодар Кляшторны быў ціхі, спакойны і выключна ветлівы чалавек. Ён заўсёды і ўсюды стараўся быць непрыкметным. Многа ведаў, слухаў іншых, але сам гаварыў мала. З выгляду ён быў прыгожы, высакарослы, крыху сутулаваты, як быццам гнуўся знарок, саромеючыся свайго росту, сінявокі, з добрай чупрынай непаслухмяных валасоў каштанавага колеру. Апрануты звычайна не па модзе. Як на вопратку, так і на абутак асаблівай увагі не звяртаў. Усе яго думкі і клопаты былі сканцэнтраваны на адным — паэзіі, якой ён самаадданы служыў з дзіцячых гадоў свайго жыцця...*

Вершы свае Тодар Кляшторны чытаў ціха, больш унутраным голасам, характэрным толькі для паэтаў. Ні жэстаў, ні мімікі не прымяняў. І, нягледзячы на ўсё гэта, слухачы яго вельмі добра прымалі. Асабліва тады, калі ён чытаў вершы на тэму кахання...»

Арыштаваны 3.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. Фабрычная, д. 10/4, кв. 7. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29.10.1937 у 11.00 як «член антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці.



Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 8.6.1957. Асабовая справа К. № 10476-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

28.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Фабрычная, д. 10/4, кв. 7 арыштавана маці траіх дзяцей **Германовіч Яніна Міхайлаўна** (н. ў 1909 у в. Раванічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл.), жонка Тодара Кляшторнага. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК. 24.1.1938 прыбыла з Аршанскай турмы ў Акмолінскае аддзяленне Карагандзінскага канцлагера НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 1.12.1945. Верагодна, у канцы 1940-х — пачатку 1950-х г. зноў арыштавана і выслана ў г. Бялова Кемераўскай вобл. Канчаткова вызвалена ў 1955. Рэабілітавана трыбуналам БВА 4.11.1955. Як напісана ў асабовай справе Г. № 5570-с (захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі), у 1957 кошт канфіскаванай у яе сям'і маёмасці быў «кампенсаваны». Памерла ў 1959 у Мінску.

Тв.: Залатое вязьмо: Выбр. вершы. Мн., 1960; Выбраныя вершы. Мн., 1970; Сляды дарог. Выбранае. Мн., 2003.


Кр.: *Хранить вечно*; *Багдановіч І. Э.* Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. Мн., 2001; *Шушкевіч С.* Права на песню // Шушкевіч С. Выбр. творы: У 2 т. Мн., 1978. Т. 2.; *БП*. Т. 3; *ЭГБ*. Т. 4; *Рэпрэсаваныя...*

КУДЗЕЛЬКА Іосіф Фадзеевіч [1894, в. Рудзенск Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер г. п. Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сялянскай сям'і. Прымаў удзел у грамадзянскай вайне, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1924 уступіў у ВКП(б). У 1930-я г. — начальнік Упраўлення па ахове аўтарскіх правоў пры СП БССР. Арыштаваны 30.4.1937 у Мінску па адрасе: Койданаўскі тракт, д. 29, кв. 1. Выключаны з ВКП(б). Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 (?) як «актыўны член антысавецкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 2.12.1958. Асабовая справа К. № 13352-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: Койданаўскі тракт, д. 29, кв. 1 арыштавана бактэрыёлаг Мінскага мясакамбіната **Аляксеева (Кудзелька) Уладзіслава Мікітаўна** (н. ў 1901 у в. Кабылля Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер в. Кастрычніцкая Вілейскага р-на Мінскай вобл.; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Іосіфа Кудзелькі. 29.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і расстралянага здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК. У студз. 1938 этапавана (з Аршанскай турмы) у Акмолінскае аддзяленне Карагандзінскага канцлагера НКВД Казахскай ССР. 15.8.1938 пераведзена ў Сярэдне-Азіяцкі канцлагер НКВД Узбекскай ССР. Вызвалена і рэабілітавана ў перыяд 8.12.1943–10.1.1944. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа А. № 7253-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

13.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. К. Маркса, д. 40, кв. 10 арыштаваны парт. і дзяржаўны дзеяч **Кудзелька Іван Фадзеевіч** (н. 30.11.1891 у в. Рудзенск; з 1914 у арміі; з сак. 1918 у Чырвонай арміі; уступіў у ВКП(б) (1918); з 1922 працаваў на Мінскім чыгуначным вузле; з 1925 сакратар Гарадоцкага, Глускага райкамаў КП(б)Б; у 1930 сакратар Мазырскай акруговай кантрольнай камісіі; з 1932 — загадчык аддзела кадраў ЦК КП(б)Б; у 1933 сакратар Мінскага гаркама КП(б)Б; з 1935 наркам фінансаў БССР), брат Іосіфа Кудзелькі. 28.7.1937 пазасудовым органам НКВД асуджаны за «дыверсійна-шпіёнскую дзейнасць у Наркамфіне БССР» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці і расстраляны (28.6.1938). Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 26.3.1957. Асабовая справа К. № 10144-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

22.9.1937 у Мінску па адрасе: вул. К. Маркса, д. 40, кв. 10 арыштавана хатняя гаспадыня, маці дваіх дзяцей **Кудзелька Ксенія Якаўлеўна** (н. 21.1.1894 у с. Лоцманская Каменка, цяпер Днепрапятроўскай вобл., Украіна), жонка Івана Кудзелькі. 8.10.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзі-



Ксенія і Іван Кудзелька з дзецьмі.

мы» да 5 гадоў ППК і этапавана ў Цемнікоўскі канцлагер НКВД Мардоўскай ССР (ст. Поцьма). Далейшы яе лёс невядомы. Рэабілітавана 12.4.1957 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа К. № 10179-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

17.10.1937 у Мінску па адрасе: вул. К. Маркса, д. 40, кв. 10 арыштаваны **Кудзелька Уладзімір Іванавіч** (н. ў 1921 у Днепрапятроўску), сын Івана Кудзелькі. 8.10.1938 асобай нарадай пры НКВД асуджаны разам з маці як «член сям'і здрадніка радзімы» да 3 гадоў ППК і этапаваны ва Усольскі канцлагер НКВД Свярдлоўскай вобл. 18.8.1941, верагодна, лагернай тройкай прыгавораны за «антысавецкую прапаганду» да 10 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні 10.5.1942. Рэабілітаваны 27.12.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа К. № 11320-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

18.11.1937 у в. Крыніца Смілавіцкага р-на Мінскай вобл. арыштаваны **Кудзелька Міхаіл Фадзеевіч** (н. ў 1897 у в. Рудзенск), верагодна, малодшы брат Іосіфа і Івана Кудзелькаў. 15.2.1938 пастановай НКВД асуджаны за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП і 15.3.1938 расстраляны ў Мінскай турме НКВД. Рэабілітаваны 15.6.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа К. № 10590-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Хранить вечно*; *ЭГБ*. Т. 4; *Рэпрэсаваныя...*



КУЛЬБАК Майсей Саламонавіч [13(25).3.1896, мяст. Смаргонь Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, празаік, драматург. Вучыўся ў Валожынскім ешыбоце. У сувязі з пачаткам 1-й сусветнай вайны ў 1914 пераехаў у Мінск. Экстэрнам здаў экзамен на званне народнага настаўніка. Працаваў у школах і гімназіях Смаргоні, Мінска, Вільні. Пачаў публікавацца з 1916. Прыхільна сустрэў Кастрычніцкую рэвалюцыю, якой прысвяціў пафасную паэму «Горад» (1919). У 1919 К. знаходзіўся ў Вільні. З 1920 да 1927 жыў у Вільні і Берліне. Вярнуўся ў Мінск у 1928. Працаваў у рэспубліканскіх газетах, у яўрэйскім сектары БелАН. Член СП Беларусі з 1934. Перакладаў на ідыш творы Я. Коласа і Я. Купалы.

З успамінаў М. Хведаровіча: *«М. Кульбак быў вясёлым чалавекам, у якім жыла, як кажуць, «смяшынка-залацінка», умеў цікава расказаць, і я не раз бачыў, як Купала, Колас і Чорны сядзелі з ім на канапе ў Доме пісьменніка і ўважліва яго слухалі...»*[1]

Арыштаваны 11.9.1937 у Мінску па адрасе: 2-і Акопны (?) зав., д. 4б, кв. 1.

З успамінаў Г. Рэлеса: *«Увосень 1937 года, калі сталінскія душагубы з’явіліся па яго, ён сказаў жонцы:*

— Ну, Зэльдэ, прыйшла і мая чарга. Залішне казаць табе, што я ні ў чым не вінаваты. Ты сама гэта ведаеш. Але мы ўжо больш ніколі не ўбачымся. Беражы дзяцей.

Выканаць гэты запавет поўнасцю Зэльдэ не ўдалося. Услед за ім арыштавалі і яе... Сын загінуў у гета... Цудам ацалела толькі дачка...»[2]

Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член контррэвалюцыйнай трацкісцка-тэрарыстычнай арганізацыі» і за «сувязь з польскімі разведорганамі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 15.12.1956. Асабовая справа К. № 8179-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску арыштавана настаўніца адной з СШ горада **Кульбак Зэльда Барысаўна** (н. ў 1897 у Вільні), жонка Майсея

---

[1] *Хведаровіч М.* Шчыры сябра, самабытны пісьменнік: Да 70-годдзя з дня нараджэння М. Кульбака // *ЛіМ*. 1966. 22 сак.

[2] *Рэлес Г.* Майсей Кульбак у Мінску // *Полымя*. 1996. № 4.

Кульбака. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 5.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 24.7.1956. Асабовая справа К. № 6761-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Выбранае. Мн., 1970; Зельманцы: Раман. Мн., 1960.

Кр.: *Барскі А.* Майсей Кульбак — прыгожая і трагічная кветка беларускай зямлі // *Ніва* (Беласток). 1984. 15 студз.; *Возвращенные имена*; *БП.* Т. 3; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

КУЧЫНСКІ Аляксей Сцяпанавіч [4(16)2.1892, в. Выдранка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны і грамадскі дзеяч, педагог. Скончыў гарадское вучылішча, здаў экстэрнам экзамены на званне сельскага настаўніка. З 1909 працаваў у школах Рагачоўскага пав. У 1916 скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут. Мабілізаваны ў армію. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Са снеж. 1917 у Мсціслаўскім пав.; працаваў у дзяржаўных і партыйных органах. Уступіў у ВКП(б) (1917). Рэдактар газ. «Думы бедняка». З 1922 у Смаленску. Працаваў у губкаме РКП(б), у газ. «Рабочий путь», быў рэдактарам газ. «Смоленская деревня». З мая 1929 у Беларусі, в. а. рэдактара газ. «Рабочий». З 1930 нам. рэдактара газ. «Савецкая Беларусь». Падчас арышту в.а. рэктара БДУ. Арыштаваны 7.2.1937 у Мінску па адрасе: вул. Кірава, д. 23, кв. 44. У сувязі з арыштам выключаны з ВКП(б). Асуджаны тройкай НКВД 28.10.1937 як «член антысавецкай шпіёнска-тэрарыстычнай арганізацыі, удзельнік у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта над адным з кіраўнікоў дзяржавы» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 4.7.1957. Асабовая справа К. № 10604-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Кірава, д. 23, кв. 44 арыштавана выкладчыца нямецкай мовы Беларускага політэхнічнага інстытута **Кучынская (Старасценка) Алена Фёдараўна** (н. 30.12.1894 у Оршы Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., у сям'і бел. службоўца; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Аляксея Кучынскага. 28.11.1937 асуджана асобай нарадай пры НКВД як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Зноў арыштавана і другі раз асуджана 14.2.1940 да ссылкі на 5 гадоў у Краснаярскі край. Вызвалена 5.11.1942. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуна-

лам БВА 11.12.1956. Асабовая справа К. № 8164-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 разам з маці арыштаваны сын Алены і Аляксея **Кучынскі Дзмітрый** (н. 9.11.1919 у Мсціславе Магілёўскай вобл.) — вучань 10 класа СШ № 2 Мінска. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджаны як «член сям'і ворага народа» да 5 гадоў ППК і этапаваны ў Ягрынскі канцлагер НКВД Архангельскай вобл. З 1940 — у Краснаярскім краі. Вызвалены 14.2.1940. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны трыбуналам БВА 25.12.1956. Асабовая справа К. № 9890-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Жертвы политического террора...*

ЛАБАДАЕЎ Міхаіл Гаўрылавіч [1905, мяст. Прапойск Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Слаўгарад Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны работнік. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Уступіў у ВКП(б) (1927). Да арышту — нам. першага сакратара ЦК КП(б)Б, адначасова загадчык асобага сектара (аддзела) ЦК КП(б)Б. Быў жанаты, меў дваіх дзяцей. Арыштаваны 26.7.1937 у Мінску па адрасе: зав. Круглы, д. 1, кв. 1. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Асуджаны 28.10.1937 тройкай НКВД як «удзельнік антысавецкай арганізацыі правых» і за «шкодніцкую работу ў сельскай гаспадарцы» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.7.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Л. № 10751-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

26.7.1937 арыштавана медсястра Мінскай скурна-венералагічнай клінікі, маці дваіх дзяцей **Лабадаева Вольга Ігнатаўна** (н. 8.7.1908 у в. Лашанцы Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл.), жонка Міхаіла Лабадаева. 28.10.1937 ці 28.11.1937 асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК. Этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 27.7.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 4.9.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Л. № 6885-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

14.8.1938 у Прапойску арыштаваны **Лабадаеў Гаўрыла Паўлавіч** (н. ў 1873), верагодна, бацька Міхаіла Лабадаева. 2.11.1938 тройкай НКВД асуджаны за «шпіянаж і ўдзел у контррэвалюцыйнай партыі» да ВМП і 18.11.1938 расстраляны. Рэабілітаваны 20.7.1960 трыбуналам БВА. Асабовая справа Л. № 7127-сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Жертвы политического террора...*

ЛАШКЕВІЧ Леанард Янавіч [1899, Рыга, цяпер Латвія — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны і дзяржаўны дзеяч. З сям'і польскага рабочага. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Уступіў у ВКП(б) (1920). Да арышту — нам. наркама Наркамата саўгасаў БССР. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 1.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 1, кв. 13. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 21.3.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Л. № 10143-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, асуджана і жонка Л.


Кр.: *Рэпрэсаваныя…*



ЛЕВІН Саламон Вульфавіч [жн. 1912, пас. Ратамка Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], літаратурны крытык. З сям'і служачага. Блізкі сябар літаратурнага крытыка П. *Хатулёва*. Скончыў МПІ (1934). Выкладаў літаратуру ў адной з мінскіх СШ. Жыў з бацькам Вульфам Берkавічам (н. ў 1877), вартаўніком пры Доме Ураду, і маці Соняй Лазараўнай (н. ў 1877), хатняй гаспадыняй. Арыштаваны 13.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 9, кв. 2. Пры вобыску разам з інш. рэчамі канфіскаваны і пашпарт Л. (серыя ФЗ № 091212). Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пленумам Вярхоўнага суда СССР 29.11.1989. Асабовая справа Л. № 28720-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Рэпрэсаваныя…*

ЛЯВОННЫ Юрка [сапр.: **Юркевіч Леанід Мікалаевіч**; 16(29).7.1908, Чавусы Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт. Вучыўся ў Чавускай сямігодцы, Магілёўскім педтэхнікуме, МПІ (за распаўсюджванне «контррэвалюцыйных вершаў» выключаны, але пазней ад-



АНКЕТА АРЕСТОВАННОГО

З асабовай справы № 28720-с.



навіўся і ў 1934 скончыў літаратурны ф-т). Друкавацца пачаў у 1924. Першыя зборнікі паэзіі «Камсамольскія вершы» і «Штурм» выйшлі ў 1930. Член СП Беларусі з 1934. Працаваў у рэдакцыях газ. «Магілёўскі селянін», «Звязда», час. «Работніца і калгасніца Беларусі». Разам з С. Грахоўскім пераклаў на бел. мову раман Ж. Верна «80 000 лье пад вадой». Некаторыя вершы Л. пакладзены на музыку.

З успамінаў С. Грахоўскага: *«Ён гадзінамі чытаў па памяці Маякоўскага і Кірсанава, Ціханава і Лугаўскога. У яго быў тонкі густ да слова, да формы, а пра сябе ён часта гаварыў: «Сапраўднае я яшчэ напішу, значнае наперадзе...»*[1]

Арыштаваны 30.10.1936 у Мінску па адрасе: вул. Фурманская, д. 9, кв. 2. З падследных, якія праходзілі з ім разам, толькі Л. пасля бясконцых катаванняў не пацвердзіў, што Цішка Гартны «контррэвалюцыянер», «нацдэм» і г. д. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 25.4.1957. Асабовая справа Ю. № 10242-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1938 у Мінску па адрасе: вул. Фурманская, д. 9, кв. 2 арыштавана бухгалтар «Белсольэнерга» **Гольдберг Яўгенія Абрамаўна** (н. ў 1907 у Мелітопалі, цяпер Украіна), жонка Юркі Лявоннага. 28.11.1938 асобай нарадай НКВД асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК. Этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 5.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 2.6.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Г. № 6656-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Выбранае. Мн., 1960.

Кр.: *Грахоўскі С.* Савецкая № 68: Трыццатыя гады...: Успаміны // Дзень паэзіі. Мн., 1978; *Шушкевіч С.* З маладнякоўскага племя // *ЛіМ.* 1968. 30 ліп.; *БП.* Т. 4; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

[1] *Грахоўскі С.* Так і было. Мн., 1986.


ЛЯМПЕРТ Саламон Рыгоравіч [27.3.1916, Мінск — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], навучэнец. З сям'і службоўца. Скончыў 7-класнае гарадское вучылішча. У першай палове 1930-х г. вучыўся на гістарычным ф-це Ленінградскага дзяржаўнага ун-та, потым перавёўся на 5 курс БДУ. Жыў з маці Ідай Я. (поўнае імя па бацьку невядома, н. ў 1887), інвалідам, і сястрой Вольгай, працавала бібліятэкарам. Арыштаваны 17.2.1937 у Мінску па адрасе: вул. Абаронная, д. 13, кв. 1. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.4.1992 Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Л. № 34836-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

ЛЯЎКОЎ Максім Архіпавіч [12.5.1894, в. Кавалі Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны дзеяч. З сялянскай сям'і. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. З 1918 — ваенны камісар Рудабельскай воласці Бабруйскага пав. У 1920-я г. атрымаў вышэйшую адукацыю (?). З 1931 — наркам юстыцыі і пракурор БССР. Старшыня Цэнтральнай камісіі па справах былых чырвонагвардзейцаў і партызан. З 1933 — сакратар ЦВК БССР. У 1932–37 — член ЦК КП(б)Б. Арыштаваны 13.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 31. Асуджаны тройкай НКВД 28.10.1937 як «агент польскай разведкі і член нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР 21.9.1957. Справа Л. № 10936-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

18.10.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 31 арыштавана адказны сакратар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б **Ляўкова Ніна Уладзіміраўна** (н. 18.2.1902 на ст. Мураўёва, цяпер Латвія; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Максіма Ляўкова. У 1936 выключана з ВКП(б) за «абарону свайго брата, абвінавачанага ў прыналежнасці да трацкістаў». 16.5.1938 асуджана асобай нарадай пры НКВД СССР як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК. Этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 18.10.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 12.2.1957. Асабовая справа Л. № 9982-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *ЭГБ.* Т. 4; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*



АНКЕТА арестованного

З асабовай справы № 3483 6-с.

МАЗЕЛЬ Елізар Якаўлевіч [1895, Палтава, цяпер Украіна — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], навуковец. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Да арышту — нам. дырэктара па навуковай рабоце Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі. Арыштаваны 26.4.1937. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнскай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.9.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

10.11.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 1-я Свярдлова, д. 19 арыштавана хатняя гаспадыня **Мазель Разалія Львоўна** (н. ў 1899 у Палтаве ў сям'і купца), жонка Елізара Мазеля. 14.12.1937 пастановай НКВД асуджана за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыі» да ВМП і 9.1.1938 расстраляна ў Віцебскай турме НКВД. Рэабілітавана 27.10.1956 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

МАЙСЕЕЎ Леў Абрамавіч [15.11.1897, Веліж Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Смаленскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны работнік. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Уступіў у ВКП(б) (1919). Служыў у Чырвонай арміі. Падчас арышту — сакратар Барысаўскага РК КП(б)Б. Арыштаваны 8.8.1937. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Асуджаны 28.10.1937 тройкай НКВД як «член трацкісцкай шкодніцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.12.1956 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. № 9857-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.


13.11.1937 у Барысаве арыштавана загадчыца дзіцячага сада пры заводзе імя Молатава, маці дваіх дзяцей **Майсеева Марыя Рыгораўна** (н. ў 1903 у Мінску; член ВКП(б) з 1925), жонка Льва Майсеева. 16.5.1938 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка Радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 13.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 30.10.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа М. № 7411-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

МАЛАЎ Барыс Міхайлавіч [ліст. 1904, Мінск — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сям'і бел. рабочага. Член ВКП(б). Да арышту — загадчык аддзела хлебнай групы Наркамата ўнутранага гандлю. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 19.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Свярдлоўская, д. 8, кв. 15. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 8.3.1958 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. № 11563-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка М.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*



МАРАКОЎ Валерый Дзмітрыевіч [14(27).3.1909, мяст. Козырава Мінскага пав., цяпер у межах Мінска — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, перакладчык. Старэйшы сын Дз. Маракова[1]. Падчас 1-й сусветнай вайны — у бежанстве ў Мцэнску (Расія) і Ромнах (Украіна). У 1924 скончыў 4-ю Мінскую сямігодку і да канца 1925 працаваў мулярам разам з бацькам. З чэрв. 1925 у друку пачалі з'яўляцца яго першыя вершы («Чырвоная змена», «Малады араты» і інш.). У снеж. па пастанове ЦБ юных піянераў і пры спрыянні А. Якімовіча прызначаны

[1] **Маракоў Дзмітрый Захаравіч** [21.9.1880, в. Азяроўка (Азераўкі, Азяроўкі, Азяранка) Пскоўскай губ. — 18.11.1968, Мінск], старшыня царкоўнага савета Козыраўскай царквы. Паводле некаторых звестак, удзельнік руска-японскай вайны 1904–05, І Усебеларускага кангрэса (верагодна, як дэлегат ад бежанцаў або эсэраў). Па звестках С. Шушкевіча і П. Пруднікава, вуліца Вялікаморская, дзе М. паставіў (каля 1906–07) першы дом, спачатку мела назву *Марская*, а потым, калі яна пашырылася, была перайменавана ў Вялікаморскую. Адзін з арганізатараў (з епіскапам Мінска М. Семянякам і настаяцелямі Козыраўскай царквы У. Бірулем і І. Зенюком (цесцем паэта Я. Бобрыка) рэлігійнай антысавецкай арганізацыі ў мяст. Козырава (1933–35). У канцы сак. 1935 у арганізацыю пранік правакатар і 4.5.1935 яе члены былі арыштаваны. 10.8.1935 М. і іншыя ўдзельнікі арганізацыі прызнаны «судом» вінаватымі ў тым, што *«пачынаючы з 1933 г., пасля прыезду*




Дзмітрый Захаравіч Маракоў

сакратаром рэдакцыі час. «Піянер Беларусі». Належаў да «другога прызыву» (1926) маладнякоўцаў, да якіх яго прывёў І. Барашка. У канцы 1926 пэўны час (па запрашэнні А. Звонака) жыў у Полацку, друкаваўся ў газ. «Чырвоная Полаччына». Першы зборнік вершаў выйшаў у 1926. Другі — у 1927. У тым самым годзе паступіў у МБПТ, але пасля двух курсаў адкліканы з вучобы і прызначаны загадчыкам літаратурнага аддзела газ. «Савецкая Беларусь», дзе працаваў з перапынкам да канца 1930. М. Гарэцкі ў той час пісаў пра М.: *«Маракоў вызначаецца лірычнасцю, эмацыйнай напружанасцю, гучальнасцю сваіх вершаў. У яго шмат пачуцця, ён любіць яскравыя фарбы і гучанне».* С. Шушкевіч пазней успамінаў: *«Маракова заўважыў і акрыліў бацькоўскай ласкай і прыхільнасцю Янка Купала. Народны паэт не раз запрашаў да сябе юнака на сваю кватэру і цешыўся яго першымі творчымі крокамі, даў паэту не адну сваю кнігу з цёплым і шчырым аўтографам»*[1]. У 1931 М. паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне МПІ (скончыў у 1934). Адначасова працаваў у час.

ў Мінск М. Семянякі на пасаду епіскапа, у Козыраўскай царкве пачалі групавацца рэлігійныя, кулацкія і іншыя антысавецкія элементы, якія паставілі сабе за мэту, пад прыкрыццём царквы і выканання рэлігійных абрадаў, настройваць у антысавецкім духу насельніцтва горада і бліжэйшых раёнаў... Толькі пасля арышту гэтай контррэвалюцыйнай групы святароў прыпынілася распаўсюджванне правакацыйных чутак і пачаўся масавы прыліў людзей у калгасы». На працэсе 25 удзельнікаў арганізацыі асудзілі да розных тэрмінаў зняволення. М. быў асуджаны да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Тайшэцкі канцлагер НКВД Іркуцкай вобл., потым пераведзены на шахты ў Кісялёўск Кемераўскай вобл. Зноў арыштаваны 17.9.1938. Прыгавораны 26.9.1939 Іркуцкім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» да 4 гадоў ППК. Вызвалены ў жн. 1943, але ў сувязі з забаронай уезду ў Беларусь дадому вярнуўся толькі праз 10 гадоў. М. неаднаразова выклікалі ў НКВД-КДБ. Апошні раз дапытвалі ў 1960 (у 80 гадоў!). М. ні разу не атрымаў пенсіі, бо не меў дакументаў (НКВД згубіў іх і асабовую справу), якія б пацвердзілі яго працоўны стаж прыкладна з 1897–98 г. Па другой справе (№ 3488) рэабілітаваны 13.10.1960 прэзідыумам Вярхоўнага суда РСФСР.

[1] *Шушкевіч С.* Вяртанне ў маладосць. Мн., 1968.




«Чырвоная Беларусь». Сябра СП Беларусі з 1934. У пачатку 1935, спрабуючы пазбегнуць арышту, паехаў у мяст. Чэрнеўка Барысаўскага р-на. 1 сак. вярнуўся дадому. Праз 3 тыдні арыштаваны органамі Дзяржбяспекі. Пасля 3 месяцаў знаходжання ва ўнутранай турме НКВД вызвалены. Паўторна арыштаваны 6.11.1936. Арышт быў праведзены супрацоўнікамі НКВД БССР Авербухам і інш. згодна з ордэрам № 700, выдадзеным 3.11.1936 і сапраўдным адны суткі (арыштавалі па ўжо несапраўдным ордэры — беззаконнасць у беззаконнасці). Як потым высветлілася, мог мець месца ўзброены супраціў пісьменніка пры арышце. Паводле слоў Тодара Кляшторнага, сказаных у верас. 1936 у Доме пісьменніка М. Багуну і П. Хатулёву, «*Маракоў, калі ад'язджаў з Мінску на раён, узяў з сабой наган і казаў, што ён будзе са зброяй у руках бараніць сябе...*» Калі б В. Маракова арыштоўвалі не на Мінскім вакзале, а ў пакоі, які ён здымаў у Барысаве і дзе, магчыма, прыхаваў так і не знойдзены энкавэдыстамі наган, апошнія вымушаны былі б «браць» пісьменніка з боем…

28.10.1937 пасля года катаванняў знявечанага М. тройка НКВД асудзіла (у 19.30; пасяджэнне працягвалася 15 хвілін) як «члена контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 23.4.1957. Асабовая справа М. № 10234-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

З сакрэтнай даведкі начальніка 1-га спецаддзела НКВД Шавялёва: *«Акт аб выкананні прысуду захоўваецца ў Мінску ў Асобым архіве 1-га спецаддзела НКВД СССР, том 8, ліст 155».*

Тв.: На залатым пакосе: Вершы. Мн., 1927; Вяршыні жаданняў. Паэзія. Мн., 1930; Права на зброю: Вершы. Мн., 1933; Лірыка. Мн., 1959; Вяршыні жаданняў: Вершы, паэмы. Мн., 1989; Рабінавая ноч: Выбранае. Вершы, паэмы, проза, публіцыстыка, крытыка, пераклады. Мн., 2003.

Кр.: *Рагойша В.* Сердце, согретое грустью // *Вопросы литературы*. 1990. № 6; *Праднікаў П.* Паэт эмоцый // *Маладосць*. 1998. № 3; *Грахоўскі С.* Растаптаныя пялёсткі // *Голас Радзімы*. 1998. 7 мая; *Звонак А.* З успамінаў аб В. Маракове // *Першацвет*. 1998. № 10–11; *Маракоў Л.* Валеры Маракоў: Лёс, хроніка, кантэкст. Мн., 1999.



АНКЕТА АРЕСТОВАННОГО

З асабовай справы № 10234-с.

МАРГЕЛАЎ Сцяпан Прохаравіч [28.3.1902, в. Расохавічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], эканаміст, географ. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1927), аспірантуру пры НДІ сельскай і лясной гаспадаркі (1930). З 1931 працаваў у Інстытуце эканомікі АН БССР: вучоны сакратар інстытута, загадчык секцыі эканамічнай геаграфіі. Адначасова выкладаў у Інстытуце народнай гаспадаркі, прафесар. Кандыдат эканамічных навук (1934). Распрацоўваў тэорыю размяшчэння ў БССР тэхнічных сельскагаспадарчых культур і перапрацоўчай прамысловасці. Адзін з кіраўнікоў групы па складанні Вялікага атласа БССР. Арыштаваны 23.1.1937 у Мінску па адрасе: Барысаўскі тракт, д. 54а, кв. 11. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член з 1927 антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнскай шкодніцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 19.7.1957. Асабовая справа М. № 10673-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: Барысаўскі тракт, д. 54а, кв. 11. арыштавана лабарантка дражджавога завода «Чырвоная зара», маці дваіх дзяцей **Гоманава (Маргелава) Серафіма Георгіеўна** (н. 27.6.1904 у Горках Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., у сям'і рабочага; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Сцяпана Маргелава. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД прыгаворана як «член сям'і здрадніка радзімы, асуджанага да расстрэлу» да 8 гадоў ППК. Этапавана праз Оршу ў АЛЖЗР НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 9.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 2.10.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Г.-М. № 7215-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Да пытання аб рэсурсах Палесся БССР. Мн., 1933; Эканамічная геаграфія БССР. Мн., 1936 (у сааўт.).

Кр.: *Возвращенные имена; Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*


МАР'ЯНАЎ Барыс Лазаравіч [1894, мяст. Татарск Смаленскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны работнік. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Уступіў у ВКП(б). У 1930-я г. — сакратар Дзяржынскага РК КП(б)Б, член ЦК КП(б)Б (з 1937). Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 9.8.1937 у Дзяржынску Мінскай вобл. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.5.1959 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. № 14127-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка М.
Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

МІХАЙЛАЎ Дзям'ян Мацвеевіч [30.10.1905, в. Хоцімск Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Уступіў у ВКП(б). Падчас арышту — кансультант Упраўлення справамі СНК БССР. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 23.6.1937 у Мінску па адрасе: вул. Горкага, 3-ці дом Саветаў, кв. 17. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.9.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. № 10893-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.
Верагодна, рэпрэсавана і жонка М.
Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

МІЦЬКОЎ Сяргей Рыгоравіч [20.3.1896, в. Косашчына Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], партыйны работнік. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў вясковую школу. Да 1915 жыў з бацькамі, дапамагаў ім па гаспадарцы. У 1920-я г. уступіў у ВКП(б). Працаваў у Полацку, Клімавічах, Гомелі, Оршы, Лёзне, Расне, Віцебску, Мсціславе. З сак. 1929 загадчык вясковага аддзела ЦК КП(б)Б. У 1930-я г. дырэктар Гідролізнага вопытнага завода Наркамата мясцовай прамысловасці. Дэлегат 8–15 з'ездаў КП(б)Б. Гадаваў дачку Алену (н. ў 1926). У студз. 1936 выключаны з ВКП(б). Арыштаваны 20.6.1937 у Мінску па адрасе: Грушаўскі пас., д. 32, кв. 1. Падчас вобыску канфіскаваны пашпарт М. № 608317. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «актыўны член антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнскай арганізацыі правых» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.5.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. № 10379-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.
Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

МУРЗО Сяргей Мікітавіч [1912, Масква — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, настаўнік. З сям'і рабочага. Да 1930 працаваў токарам на Віцебскім станкабудаўнічым заводзе «Камінтэрн». У 1934 скончыў МПІ.



З асабовай справы № 10379-с.



З успамінаў З. Біралы: «*Мой аднакурснік Сяргей Мурзо ў чарзе* [па хлеб. — **Л. М.**] *страціў прытомнасць. Апамятаўшыся, ледзь дайшоў да інтэрната*».

З успамінаў С. Шушкевіча: *«Дэкан інстытута знайшоў пад падушкай студэнта — былога віцебскага рабочага* (Сяргея Мурзо. — **Л. М.**) *— два тамы твораў С. Ясеніна і патрабаваў выключыць з інстытута чытача «кулацкіх упадніцкіх твораў». На агульным студэнцкім сходзе выступіў В. Маракоў. Ён нагадаў зборнік С. Ясеніна «Русь Савецкая», «Паэму пра 26», даказаў, што яго сябар ведае, як адрозніць станоўчае і патрэбнае ад шкоднага і слабога. Студэнт скончыў інстытут разам з усімі таварышамі крытыка-творчага аддзялення».*

Друкаваўся з 1929. Належаў да так званых паэтаў-ударнікаў, асноўнай тэмай якіх было ўслаўленне працы рабочага. Быў членам Віцебскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Да арышту — настаўнік СШ у Краснаполлі Магілёўскай вобл. Арыштаваны 3.11.1936 у Мінску або пасля арышту дастаўлены ў Мінск, бо разам з шэрагам літаратараў абвінавачваўся ў адным злачынстве. Асуджаны 28.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны 10.11.1956 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа М. № 3929 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

З архіваў НКВД:

Справка.

Дело Мурзо Сергея Никитича вместе с заключением, в котором ставится вопрос о прекращении дела за отсутствием преступления, представлено 28.6.56 г. в... Коллегию Верховного суда СССР для рассмотрения. №№ 9-17987-37.

30.8.1956.

Тв.: Ля сталёвых бліскучых машын // Рытмы будавання. Віцебск, 1930.

Кр.: *БП.* Т. 4; *Маракоў Л.* Валеры Маракоў: Лёс, хроніка, кантэкст. Мн., 1999; *Рэпрэсаваныя...*

МУХІН Павел Максімавіч [1907, в. Забалоцце Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], навуковец. З бел. сялянскай сям'і.

Атрымаў вышэйшую адукацыю. У 1930-я г. загадчык лабараторыі Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 3.7.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 11-я Ветэрынарная, д. 19. Перавезены ў Мінск. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29.10.1937 за «дзейнасць у складзе антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 24.10.1957. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка М.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Рэпрэсаваныя…*



НЁМАНСКІ Янка [сапр.: **Пятровіч Іван Андрэевіч**; 31.3(12.4).1890, мяст. Шчорсы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер в. Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], празаік, публіцыст, эканаміст, грамадскі дзеяч. У 1909 скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю; у 1915–16, 1918 вучыўся на гісторыка-філалагічным ф-це Петраградскага ун-та. У 1916 мабілізаваны ў армію, накіраваны ў школу прапаршчыкаў. У 1918 — загадчык выдавецкага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята. У 1918–19 разам з Ц. Гартным выдаваў газ. «Дзянніца». Там з 1918 пачаў друкаваць публіцыстычныя творы. У 1919–21 — у Чырвонай арміі. З 1922 у Мінску; працаваў у планава-эканамічных органах. Нам. старшыні Дзяржплана БССР. Член Інбелкульта. Акадэмік БелАН з 1928. У 1929–31 сакратар АН БССР. З 1931 загадчык аддзела эканомікі НДІ прамысловасці. У 1933–36 узначальваў кафедру фінансавых дысцыплін у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі. З першым апавяданнем «Над Кроманню» выступіў у 1922 (час. «Полымя»). У 1927–32 член праўлення літаратурнага аб'яднання «Полымя». На працягу 1928–30 пісаў раман «Драпежнікі», які застаўся нязкончаным (рукапіс 2-й часткі быў спалены энкавэдыстамі пасля арышту). Арыштаваны 27.4.1937 у Мінску па адрасе: вул. Горкага, д. 21/52, кв. 25.

З асабовай справы Янкі Нёманскага (№ 10052-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі):

Протокол обыска

Изъято:

4 тетради (рукапісаў, сярод якіх, магчыма, была другая частка рамана «Драпежнікі». — **Л. М.**), *разная переписка, блокнотов 11 штук, 10 книг под ред. Петровича, книга «Война с белополяками», журн. «Полымя» — 25 штук, «Красная новь» — 2 шт., 2 книги под редакцией Некрашевича, 1 книга под ред. Дунца, 1 книга под ред. Гартного и разн. книги — 7 шт., вся переписка и документы...*

Постановление

1937 г. мая, 10 дня. Я, инспектор при наркоме Внутренних дел БССР, лейт. Гос. Без. Кац М. И., рассмотрев следственное дело № 9751, нашел:

Материалами следствия в достаточной степени установлено, что Петрович И. А. состоял членом национал-фашистской организации в БССР и проводил организационную, вредительскую и разрушительную к-р деятельность.

На основании ст. 128 УПК БССР

Постановил:

Петровича Ивана Андреевича привлечь по настоящему делу в качестве обвиняемого, предъявив ему обвинение по ст. 68, 69, 70, 72, 76 УК БССР.

Инспектор при наркоме лейт. Кац.

Асуджаны тройкай НКВД 29.10.1937 у 10.00 як «член нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 16.3.1957.

4.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. 11 ліпеня, д. 18/7, кв. 2 арыштавана старшы эканаміст Наркамата лясной гаспадаркі БССР, маці траіх дзяцей **Пятровіч Глафіра Дзмітрыеўна** (н. 26.4.1892 у г. Параўчат Пензенскай губ., цяпер райцэнтр Пензенскай вобл., Расія; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Янкі Нёманскага. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і расстралянага ворага народа» і «саўдзельніца ягоных контррэвалюцыйных злачынстваў» да 8 гадоў ППК. 24.1.1938 прыбыла з Оршы ў Акмолінскае аддзяленне Карагандзінскага канцлагера НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 25.11.1945. Пасля вызвалення жыла ў Віцебску ў дачкі Лідзіі. Неаднаразова звярталася ў АН БССР і КДБ з прашэннем прызначыць ёй пенсію за беспадстаўна рэпрэсаванага мужа, але адказу не дачакалася. Рэабілітавана трыбуналам БВА 6.3.1956. Асабовая справа П. № 6643-с знаходзіцца ў архіве КДБ Беларусі.

15.11.1937 у Мінску арыштаваны навучэнец Мінскага дарожна-механічнага тэхнікума **Пятровіч Андрэй Іванавіч** (н. 10.7.1922 у Ноўгарадзе, Расія), сын Янкі Нёманскага і Глафіры Пятровіч. 28.11.1937 «тройкай» НКВД асуджаны як «член сям'і ворага народа» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Паўночна-Уральскі канцлагер НКВД Свярдлоўскай вобл. Загінуў у зняволенні ў 15 гадоў. Рэабілітаваны 9.5.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа П. № 6594-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: На зломе: Апавяданні. Мн., 1925; Творы. Мн., 1984.

Кр.: *Строева Т.* Адзін з пачынальнікаў // *ЛіМ.* 1980. 4 крас.; *Хомчанка В.* Абавязак памяці // *ЛіМ.* 1985. 15 ліст.; *Савік Л.* Янка Нёманскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Мн., 1999. Т. 2; *Платонаў Р.* Лёсы. Мн., 1998; *БП.* Т. 4; *ЭГБ.* Т. 5; *З асабістага архіва Л. С. Савік; Хранить вечно; Рэпрэсаваныя...*

ПЕТРУШЭНЯ Васіль Аляксандравіч [1904, в. Сінягова Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Уступіў у ВКП(б). Да арышту — кансультант СНК БССР па камунальных і транспартных справах. Арыштаваны 9.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 31/33 (у 1937 значная частка жыхароў гэтага «элітнага» дома арыштавана і прыгаворана да расстрэлу), кв. 4. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.2.1966 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа П. № 19413-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*



ПІВАВАРАЎ Зяма [Залман Рувімавіч; 24.5(5.6).1910, мяст. Касцюковічы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, перакладчык. Пачаў пісаць вершы пабеларуску ў 1925, тады ж упершыню апублікаваў іх у клімавіцкай газ. «Малады камуніст». У 1927 паступіў у Мсціслаўскі педтэхнікум. У 1929 пераехаў у Ленінград. Публікаваўся ў ленінградскіх альманахах і часопісах. Уступіў у БелАПП. З 1931 вучыўся на

літаратурным ф-це МПІ (скончыў у 1934). У 1934–36 супрацоўнік газ. «Чырвоная змена». Перакладаў рускіх паэтаў. Выступаў у друку і як тэатральны крытык. Арыштаваны 13.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. Чычэрына, д. 30, кв. 1. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член нацыянал-фашысцкай арганізацыі», за «антысавецкую прапаганду» і «ўдзел (з 1934) у тэрарыстычнай групоўцы» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 8.3.1958. Асабовая справа П. № 11556-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсаваны сваякі П.

Тв.: Лірыка двух нараджэнняў: Вершы. Мн., 1934.

Кр.: *Левін С.* Пра творы Зямы Півараварава // *ЛіМ*. 1934. 31 студз.; *Шушкевіч С.* У буднях працоўных гартаваўся радок // *Чырвоная змена*. 1971. 17 крас.; *Русаковіч В.* Зяма Піварараў // *Полымя*. 1985. № 6; *БП*. Т. 5; *Рэпрэсаваныя...*


ПРАТАСЕНЯ Рыгор Іванавіч [1.12.1899, в. Сенніца Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], аграхімік. З сям'і рабочага. Атрымаў вышэйшую адукацыю. У 1932–33 працаваў нам. дырэктара Інстытута аграглебазнаўства АН БССР. У снеж. 1933 выключаны з КП(б)Б, потым працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела Інстытута аграглебазнаўства. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 26.11.1936 у Мінску па адрасе: Барысаўскі тракт, д. 54а, кв. 15. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член трацкісцка-тэрарыстычнай шпіёнска-шкодніцкай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 22.8.1957. Асабовая справа П. № 10820-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.



Верагодна, асуджана і жонка П.

Кр.: *Возвращенные имена; Рэпрэсаваныя...*

РЫДЗЕЎСКІ Міхаіл Антонавіч [30.10.1885, Рэчыца Мінскай губ., цяпер Гомельская вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], педагог, верагодна, сваяк Сцяпана Некрашэвіча. З сялянскай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. У канцы 1920-х — пачатку 1930-х г. дырэктар МБПТ. Падчас



арышту — загадчык вучэбнай часткі МПІ. Арыштаваны 27.11.1936 у Мінску па адрасе: вул. Валадарскага, д. 30, кв. 11 (27.10.1933 у гэтай жа кватэры быў арыштаваны і дацэнт Мінскага медыцынскага інстытута Хаім Манасзон). Асуджаны тройкай НКВД 28.10.1937 як «член антысавецкай тэрарыстычна-шпіёнскай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.5.1957. Асабовая справа Р. № 10284-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

20.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Нова-Мясніцкая, д. 26, кв. 61 арыштавана хатняя гаспадыня **Рыдзеўская Алена Рыгораўна** (н. 20.5.1889 у в. Масееўка Магілёўскай губ., цяпер Светлагорскі р-н Гомельскай вобл.), жонка Міхаіла Рыдзеўскага. 28.11.1937 (?) асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Акмолінскае аддзяленне Карагандзінскага канцлагера НКВД Казахскай ССР. Пасля вызвалення (1945) вярнулася на радзіму. Жыла разам з дачкой Аленай у Мінску ў кватэры зяця — П. Броўкі, але прапісана была на раёне. Рэабілітавана 3.7.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Р. № 6659-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

20.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Нова-Мясніцкая, д. 26, кв. 61 разам з маці арыштаваны студэнт МБПТ (?) **Рыдзеўскі Алег Міхайлавіч** (н. ў 1919 (?) у в. Сарочынцы, цяпер Харкаўская вобл., Украіна), верагодна, сын Міхаіла Рыдзеўскага. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджаны за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК і этапаваны ў Акмолінскае аддзяленне Карагандзінскага канцлагера НКВД Казахскай ССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.9.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Р. № 6904-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Сын Міхаіла Рыдзеўскага Ігар (н. ў 1916) падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Працаваў у Мінскім гарадскім тэатры. З 1943 сувязны партызанскай групы Казанцава. У другой палове 1940-х г. рэпрэсаваны. Пасля вызвалення (1956?) вярнуўся на радзіму. Працаваў у Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР, потым — дырэктар вучэбнага тэатра Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, здымаўся ў тэлефільме «Справа Ігнатоўскага» (1991). У 1990-я г. — супрацоўнік літаратурнага музея П. Броўкі. Аўтар успамінаў.

Дачка Міхаіла Рыдзеўскага Алена (н. 15.4.1911 у в. Ісакавічы, цяпер Лоеўскі р-н Гомельскай вобл.) у 1930-я г. выйшла замуж за паэта Петруся Броўку. Працавала ў Інстытуце мовазнаўства, потым — дырэктарам музея П. Броўкі. Памерла 15.8.1982.

Кр.: *Рэпрэсаваныя...*

САНДАМІРСКІ Якаў Рыгоравіч [1902, Крамянчуг Палтаўскай губ., цяпер Палтаўская вобл., Украіна — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], педагог. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Падчас арышту — загадчык кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 3.7.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 1-я Ветэрынарная, д. 11/21. Перавезены ў Мінск. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29.10.1937 за «дзейнасць у складзе нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 5.10.1957. Асабовая справа С. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Паводле некаторых звестак, рэпрэсаваны і бацька Якава Сандамірскага.

Кр.: *Рэпрэсаваныя...*



САПРЫЦКІ Аскар Абрамавіч [1894, в. Халочча Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чачэрскі р-н Гомельскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. Падчас арышту — нам. наркама земляробства БССР. Арыштаваны 26.4.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 31/2, кв. 3. У сувязі з арыштам выключаны з партыі. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член антысавецкай дыверсійна-тэрарыстычнай

арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 27.10.1956. Асабовая справа С. №7399-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Кастрычніцкая, д. 3, кв. 4 арыштавана настаўніца Мінскай школы № 2, маці дваіх дзяцей **Сапрыцкая Берта Навумаўна** (н. 9.1.1900 у Гомелі ў сям'і службоўца; мела вышэйшую адукацыю), жонка Аскара Сапрыцкага. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД прыгаворана як «член сям'і ворага народа, асуджанага да ВМП» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена ў 1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 24.7.1956. Асабовая справа С. № 6763-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Рэпрэсаваныя...*

СПЕКТАР Якаў Мееравіч [студз. 1891, мяст. Копысь Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. Падчас арышту — загадчык сакратарыята СНК БССР. Арыштаваны 2.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. К. Маркса, д. 36/43, кв. 24. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнскай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 8.8.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа С. № 10859-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. 1-я Лекарта, д. 3, кв. 7 арыштавана краўчыха фабрыкі імя Крупскай **Спектар Фаня Яфімаўна** (н. 10.12.1903 у мяст. Копысь у сям'і службоўца), жонка Якава Спектара. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і расстралянага ворага народа» да 8 гадоў ППК. Этапавана ў Аршанскую турму НКВД. З 24.1.1938 у Карагандзінскім канцлагеры. Вызвалена 5.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 6.8.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа С. № 10648-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Хранить вечно; Жертвы политического террора ...*

СТАШЭЎСКІ Васіль Пятровіч [11(23).3.1895, в. Свінка Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Лугавая Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], празаік, драматург, педагог. З бел. сялянскай сям'і. У 1914 скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Ваяваў у 1-ю сусветную вайну і ў час грамадзянскай вайны ў Расіі. У 1918–20 і ў 1923 настаўнічаў. У 1920 — удзель-



нік антыпольскага руху на Случчыне. У 1920–21 служыў ваенкамам. Уваходзіў у арганізацыю «Маладая Беларусь», БПС-Р, са студз. 1920 член Беларускай камуністычнай арганізацыі, са жн. член КП(б)Б. За пратэсты супраць арышту членаў БПС-Р выключаны ў маі 1921 з КП(б)Б. Публікавацца пачаў у 1923. У 1924 скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут. Выкладаў гісторыю і літаратуру на настаўніцкіх курсах і на рабфаку ў Оршы. Першую п’есу апублікаваў у 1926. З 1926 жыў у Мінску. Адказны сакратар літаратурнага аб’яднання «Маладняк». У 1928–29 працаваў у рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь». З 1929 — адказны сакратар літаратурнага аб’яднання «Полымя». Член СП Беларусі з 1934. У 1936 Беларускі тэатр юнага гледача паставіў яго п’есу «Мікола Гоман».

З аўтабіяграфіі Я. Ермаловіча (1967): *«Засталася ў памяці сустрэча з Васілём Сташэўскім. Што ў ім захапляла, дык гэта нязгасны аптымізм, любоў да жыцця і вера ў яго. Знаходзячыся ў вельмі цяжкіх жыццёвых умовах, кашляючы кроўю (ён хварэў туберкулёзам), Сташэўскі расказваў анекдоты, жартаваў, спяваў, дзяліўся сюжэтамі ненапісаных твораў, якія спадзяваўся з цягам часу напісаць, і ні разу не заікнуўся аб тым, што хворы і што вось-вось можа памерці...»*

Арыштаваны 4.11.1936. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 8.6.1957. Асабовая справа С. № 10477-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Правіянцкая, д. 33, кв. 1 арыштавана гідратэхнік Мінскага інстытута харчовай прамысловасці **Сташэўская Лідзія Пятроўна** (н. 2.10.1908 у Мінску ў сям’і службоўца), жонка Васіля Сташэўскага. 28.11.1937 асуджана асобай нарадай пры НКВД як «член сям’і расстралянага ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 6.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 24.7.1956. Асабовая справа С. № 6762-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Бацька і сын; У цемры: П’есы. Мн., 1927; Беспрытульная: П’еска (у 1 дзеі). Мн., 1927; Архангелы з крэсаў: П’еса. Мн., 1930; Прысяга ў лесе: Шэсць сцэн з 1919–1920 гг. Мн., 1930; Шуміць Бярэзінка: Аповесці, апавяданні, нарысы. Мн., 1963.

Кр.: *Александровіч С.* Жывыя старонкі часу // *Полымя*. 1963. № 12; *Сабалеўскі А.* Васіль Сташэўскі // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн., 1975. Т. 2; *Шушкевіч С.* Талент грамадскага гучання // *ЛіМ*. 1975. 28 сак.; *БП*. Т. 5; *ЭГБ*. Т. 6/1; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

СТРЭЛЕ Георгій Уладзіміравіч [1900, в. Кашэдары Трокскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 29 ці 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны дзеяч Беларусі. З бел. рабочай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Працаваў у Бабруйску (да 1924), Клімавічах (да 1926), Мазыры, Оршы (старшыня акруговага выканаўчага камітэта). З 1929 у Мінску ва Упраўленні народнагаспадарчага ўліку, потым у Калгасцэнтры. З 1933 начальнік Упраўлення жывёлагадоўлі (конегадоўлі і ветэрынарыі) Наркамата земляробства, нам. наркама. З 1936 дырэктар конесаўгаса № 120 у Мсціславе Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 29.4.1937. Абвінавачваўся як «актыўны ўдзельнік нацдэмаўскай контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі». Падчас следства жорстка катаваны. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 29 ці 30.10.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 22.3.1958. Асабовая справа С. № 3647 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

22.1.1938 арыштавана хатняя гаспадыня **Стрэле Ганна Пятроўна** (н. ў 1903 у в. Адаменкі Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл., у бел. сялянскай сям'і), верагодна, жонка Георгія Стрэле. 16.5.1938 асуджана асобай нарадай пры НКВД як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана Вярхоўным судом БССР 3.3.1958.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

СЯЛОЎ Дзмітрый Паўлавіч [5.8.1896, в. Яхрабол, цяпер Яраслаўская вобл., Расія — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сялянскай сям'і. Да арышту — начальнік планава-фінансавага ўпраўлення Наркамата асветы БССР. Арыштаваны 20.6.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 33, кв. 8. Асуджаны 28.10.1937 тройкай НКВД як «член нацыянал-фашысцкай арганізацыі» і за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 3.8.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа С. № 10816-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: Транспартны зав., д. 18, кв. 3 арыштавана прадавец магазіна № 3 Галоўхлебзбыта **Сялова (Баркоў-**

ская) Лізавета Маркаўна (н. 28.12.1902 у мяст. Лоеў Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., у сям'і рабочага), жонка Дзмітрыя Сялова. 28.11.1937 асуджана асобай нарадай пры НКВД як «член сям'і расстралянага ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана праз Оршу ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 10.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 5.11.1956. Асабовая справа С.-Б. № 7414-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Жертвы политического террора…*

СЯРДЗЮК Панцялей Іванавіч [1907, станіца Старамінская Азоўска-Чарнаморскага краю, Украіна — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. З сям'і службоўца. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Да арышту — загадчык лабараторыі біяфабрыкі № 5 у Віцебску. Арыштаваны 27.1.1936 на рабоце. Перавезены ў Мінск. Асуджаны 29.10.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.10.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*



ТАЎБІН Юлій [Юдаль Абрамавіч; 2(15).9.1911, Астрагожск Варонежскай губ., цяпер Варонежская вобл., Расія — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, перакладчык. Нарадзіўся ў сям'і аптэкара. У 1921 пераехаў з бацькамі ў Мсціслаў. Пасля заканчэння сямігодкі (1928) паступіў у Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, адначасова стаў сябрам аршанскай філіі «Маладняка», друкаваўся ў часопісе філіі. Разам з Т. пачалі вучыцца Змітрок Астапенка і Аркадзь Куляшоў (пазней вядомая «тройца мсціслаўцаў»), будучы выпускнік першага выпуска прафесійных літаратараў МПІ (1934), «камсамольскі паэт» (як называў яго аднакурснік С. Шушкевіч) Зяма Півавараў, будучы «ўдзельнік вызвалення Заходняй Беларусі» (І. Багдановіч), дзіцячы пісьменнік Павел Левановіч (загінуў падчас 2-й сусветнай вайны), Ганна Сапрыка і інш. Першыя вершы з'явіліся ў 1926 на старонках час. «Ма-

ладняк Калініншчыны» (Клімавічы). Увосень 1930 выйшаў першы зборнік вершаў «Агні». Тагачасная крытыка ставілася да Т. насцярожана; яго абвінавачвалі ў рабскіх адносінах да старой буржуазнай літаратуры. У 1931–33 вучыўся ў МПІ (паводле іншых звестак — у БДУ). Стаў членам БелАПП.

Сцяпан Ліхадзіеўскі пазней успамінаў: *«Юлі Таўбін... Гэта быў юнак, ад прыроды ўзнагароджаны вялікім паэтычным талентам. Сціплы, добры, таварыскі, чалавечны, ён выклікаў да сябе ўсеагульную любоў і павагу».*

Сяргей Грахоўскі ў сваёй кнізе «Так і было» адзначыў, што *«сярод пісьменнікаў Таўбін быў адметны ад усіх: зрэнкі аксамітна-чорных вачэй, здавалася, бачаць навылёт, выразныя тоўстыя губы нечым нагадвалі Пушкіна, у свае дзевятнаццаць гадоў ён хадзіў трошкі сагнуты, нібы толькі ўстаў з-за стала. Можа, так і было...».*

Арыштаваны ў канцы лют. 1933. Прыгавораны 10.8.1933 да 2 гадоў ссылкі (паводле звестак В. Куляшовай, *«повадам для першага арышту Юлія Таўбіна стаў ліст з-за мяжы ад цёткі, якая нібыта пераехала з Польшчы ў Амерыку»*). Тэрмін адбываў у Цюмені. Настойліва вывучаў англійскую мову, многа перакладаў з яе. Перакладаў таксама творы Г. Гейнэ, У. Маякоўскага. 4.11.1936 паўторна арыштаваны і этапаваны ў Мінск. 29.10.1937 выязная сесія ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР прысудзіла паэта да расстрэлу.



М. Багун (загінуў у перасыльным лагпункце 17.2.1938), З. Астапенка (знік у 1940-я г.), Ю. Таўбін. 1930 г.

Незадоўга да арышту Юлі Таўбін паслаў у Ленінградскае аддзяленне выдавецтва «Художественная литература» падборку перакладаў на рускую мову вершаў Альфрэда Хаўсмана, якія потым увайшлі ў зборнік «Антология новой английской поэзии» (выйшаў праз 20 дзён пасля расстрэлу паэта). Пераклад верша англійскага паэта «Законы Бога и людей» прагучаў своеасаблівым пасланнем з «таго свету»:

...Себе другой избрал я путь —
Они хотят меня вернуть.
Но я, хуля законы их,
Им не навязывал своих.
Мол, как угодно, господа, —
Раз вы туда, так я сюда.
Так нет же! Им стерпеть нельзя,
Что у него своя стезя.
Они грозят — иди назад,
Не то — тюрьма, петля и ад.
Как не робеть мне! Суд их скор.
Могу ль вступить в неравный спор?
Не я построил этот мир.
Я в нем блуждаю, чужд и сир.
Хоть глупые, но господа —
Они. Их сила, их права.
А нам на Марс не улететь
С тобой, душа моя... Так впредь
Смирись и следовать сумей
Законам Бога и людей...

Рэабілітаваны 29.8.1956.

Тв.: Каб жыць, спяваць і не старэць...: Вершы. 1928–1930. Мн., 1931; Тры паэмы. Мн., 1931; Мая другая кніга: Вершы. Мн., 1932; Таўрыда: Паэма. Мн., 1932; Выбраныя вершы. Мн., 1957; Вершы. Мн., 1969.

Кр.: *Бечык В.* Голас маладосці // *ЛіМ.* 1973. 8 сак.; *Грахоўскі С.* Жыве ў памяці маёй: Успаміны // Дзень паэзіі-73. Мн., 1973; *Азгур З.* Пад небам і пад дахам майстэрні: [Успаміны] // *Полымя.* 1974, № 2; *Бярозкін Р.* Пра Юлія Таўбіна // Бярозкін Р. Кніга пра паэзію. Мн., 1974; *Маракоў Л.* Ліст з таго свету // *Голас Радзімы.* 1999. 26 жн.

ТУРЛАЙ Андрэй Аляксеевіч [30.11.1894, в. Вялікая Кракотка Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], дзяржаўны дзеяч. З сялянскай сям'і. У 1918 уступіў у КП(б)Б. У 1935–36 сакратар Полацкага райкама партыі. Член ЦК ВКП(б). Падчас арышту —

наркам саўгасаў БССР. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 9.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. М. Горкага, 3-і дом Саветаў, кв. 8. У сувязі з арыштам выключаны з партыі. Асуджаны тройкай НКВД 29.10.1937 як «член антысавецкай шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 15.9.1956. Асабовая справа Т. № 7222-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

22.9.1937 арыштавана **Турлай Раіса Абрамаўна** (н. ў 1903 у Бабруйску), жонка Андрэя Турлая. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД БССР асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК. Этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 22.9.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 26.9.1955. Яе асабовая справа № 5551-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

УСПЕНСКІ Яўген Канстанцінавіч [18.10.1891, Вільня — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], фізік, грамадскі дзеяч, педагог. З сям'і службоўца. Скончыў Віленскую гімназію (1910), фізіка-матэматычны ф-т Маскоўскага ун-та (1915). З бел. нацыянальна-вызваленчым рухам пазнаёміўся ў студэнцкія гады (з 1911) у Віленскім зямляцтве пры Маскоўскім ун-це. Пасля заканчэння ун-та працаваў у Бабруйску і Глуску: у гімназіях, школах, палітэхнікуме і педтэхнікуме, вёў фізіку і матэматыку. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі абраны ў бюро Настаўніцкага саюза. Падчас нямецкай і польскай акупацыі ўваходзіў у Бабруйскую беларускую раду. Летам 1918 быў ініцыятарам першых настаўніцкіх курсаў у Бабруйску. У час польскай акупацыі — адзін са стваральнікаў Беларускага нацыянальнага камітэта. У 1921 уступіў у ВКП(б). Быў нам., потым загадчыкам Бабруйскай палітасветы. Працаваў разам з Алесем Адамовічам, прымаў удзел у правядзенні беларусізацыі. У верас. 1922 па запрашэнні У. Ігнатоўскага пераехаў у Мінск. Прызначаны загадчыкам Галоўпалітасветы і Галоўпрафасветы пры наркаме асветы БССР. Са студз. 1923 — асістэнт, потым дацэнт кафедры фізікі педагагічнага ф-та БДУ. З мая 1924 — нам. дэкана педагагічнага ф-та, загадчык фізіка-матэматычнага і прыродазнаўчага аддзяленняў. Увосень 1924 арганізаваў таварыства «Прэч непісьменнасць». З 1929 — дэкан фізіка-матэматычнага ф-та. У 1925–36 прафесар БДУ. Першы ў Беларусі пачаў выкладаць фізіку на бел. мове. Быў дэлегатам навуковых з'ездаў у Маскве, Ленінградзе, Берліне. У 1931–36 супрацоўнік Фізіка-тэхнічнага інстытута БелАН. У кастр. 1935 выключаны з ВКП(б) за «прытупленне класавай пільнасці і адрыў ад партыйнага жыцця». З 1936 — прафесар і загадчык ка-

федры фізікі Гомельскага педінстытута. Асноўныя працы У. прысвечаны квантавай тэорыі ядра атама, гісторыі і метадалогіі фізікі. Арыштаваны 20.6.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 97, кв. 12. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «актыўны член контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай шпіёнска-тэрарыстычнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 25.7.1957. Асабовая справа У. № 10764-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

15.11.1937 у Мінску па адрасе: Грушаўскі пас., д. 23 арыштавана касір Аптэкаўпраўлення Белмедінструментаў **Успенская Ксенія Міхайлаўна** (н. 13.11.1892 у Вільні ў сям'і службоўца), жонка Яўгена Успенскага. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД БССР асуджана як «член сям'і ворага народа» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 5 (ці 30).9.1943. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана трыбуналам БВА 12.6.1956. Асабовая справа У. № 6686-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

19.11.1937 у Мінску па адрасе: Грушаўскі пас., д. 23 арыштаваны сыны У. — **Рыгор** (н. 5.5.1919, вучань Мінскай СШ № 4) і **Уладзімір** (н. 28.7.1916, студэнт фізіка-матэматычнага ф-та БДУ) **Успенскія**. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД БССР асуджаны як «члены сям'і расстралянага ворага народа» да 5 гадоў ППК і этапаваны (хутчэй за ўсё, разам з маці) у Карагандзінскі канцлагер Казахскай ССР. Уладзімір вызваліўся 19.11.1942. Пра далейшы лёс Рыгора нічога не вядома. У 1956 трыбуналам БВА браты рэабілітаваны. Іх асабовыя справы № 6660-с (Уладзіміра) і № 6662-с (Рыгора) захоўваюцца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; ІКР; Гесь А.* Успенскі Яўген Канстанцінавіч // Университет профессорский. Гомель, 2005. С. 327–329; *Возвращенные имена; Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*

ФРЫДМАН Ісак Сямёнавіч [1887, Сімферопаль, цяпер Украіна — 29 або 30.10.1937, Мінск, турма НКВД], службовец. Атрымаў вышэйшую адукацыю, уступіў у ВКП(б) (1918). Да арышту — начальнік аддзела землеўпарадкавання Наркамата земляробства БССР. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 15.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 148/19, кв. 57. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Асуджаны 28 ці 29.10.1937 тройкай НКВД за «шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы» і як «член тэрарыстычнай арганізацыі правых» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.5.1957 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР Асабовая справа Ф. № 10367-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Верагодна, рэпрэсавана і жонка Ф.
Кр.: *НАРБ, ІКБР.*



ХАРЫК Ізі [**Ісак Давыдавіч**; 6.3.1896, па іншых крыніцах 17.3.1898, мяст. Зембін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт. У 1919 добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію, удзельнічаў у грамадзянскай вайне ў Расіі. У 1916–23 — член арганізацыі «Паалей-Цыён». У другой палове 1920-х г. уступіў у ВКП(б). Літаратурную дзейнасць пачаў у 1920 публікацыямі ў яўрэйскіх газетах. У 1921–23 вучыўся ў Вышэйшым літаратурным інстытуце імя В. Брусава ў Маскве. У 1922 у Мінску выйшла першая кніжка вершаў «Трапятанне». З 1925 друкаваўся ў яўрэйскім час. «Штэрн». У 1927 скончыў яўрэйскае аддзяленне педагагічнага ф-та 2-га Маскоўскага дзяржаўнага ун-та. З 1928 сталі з'яўляцца пераклады вершаў Х. на бел. мову. Пераехаў у Мінск, працаваў рэдактарам час. «Штэрн». У 1931 абраны членам ЦВК БССР. Член СП Беларусі з 1934. Член прэзідыумаў СП БССР і СССР. Да 1936 у Мінску, Маскве і Кіеве выйшла 13 яго кніг на яўрэйскай мове. З пачатку 1930-х г. выступаў з артыкуламі і нарысамі таксама ў беларускамоўных выданнях. Х. перакладаў на яўрэйскую мову творы Я. Коласа, М. Чарота. Член-карэспандэнт БелАН з 1936. Адзін з аўтараў «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» (1936). Вершы «Над Бярозай» і «Хлеб» былі пакладзены на музыку С. Палонскім.

З успамінаў перакладчыка Юркі Гаўрука (таксама рэпрэсаванага): *«Я ніколі не забуду той атмасферы давер'я, зацікаўленасці, любові і пашаны, якая адразу ж устанавілася паміж паэтам і яго слухачамі. Ізі Харык чытаў многа, з вялікім уздымам. Яго гучны, выразны голас з пявучай інтанацыяй, запал, аптымізм і публіцыстычная вастрыня вершаў літаральна зачаравалі вучняў* (Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. — **Л. М.**). *Твары іх гарэлі, вочы блішчалі. Яны гатовы былі слухаць яго бясконца... Фізічна моцны, з энергічнымі рысамі твару і пышнай чорнай чупрынай, ён быў увасабленнем жыццярадаснасці...»*[1]

[1] *Гаўрук Ю.* Ступень адказнасці. Мн., 1986.

Арыштаваны ў Мінску ў Доме спецыялістаў. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член трацкісцка-зіноўеўскай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 13.6.1956. Асабовая справа Х. № 6870-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 148, кв. 52 арыштавана хатняя гаспадыня, маці дваіх сыноў (Юлія і Давыда) **Харык Дзіна (Матліна) Звулаўна** (н. ў 1911 у Бабруйску), жонка Ізі Харыка. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД СССР асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена ў 1946. Вярнулася на радзіму. Працавала выхавацелькай у дзіцячым садзе, загадвала бібліятэкай Мінскага аб'яднання габрэйскай культуры імя Ізі Харыка. Дзіне Харык не раз прапаноўвалі з'ехаць за мяжу, у Ізраіль, ЗША, але яна адмаўлялася. Усё чакала сваіх сыноў. Рэабілітавана 14.8.1956. Памерла 11.3.2003. Асабовая справа Х. № 6846-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Адданасць: [Выбр. тв]. М., 1970. Яўр.; Пераклады: Выбр. тв. Мн., 1958; Выбранае. Мн., 1969.

Кр.: *Лынькоў М.* Таленавіты паэт // *Маладосць*. 1958. № 6; *Броўка П.* Пра паэта і таварыша // *ЛіМ*. 1973. 23 сак.; *Хведаровіч М.* Сугучнасць часу // *Беларусь*. 1976. № 3; *БП*. Т. 6; *Наша Ніва. 2003. 18 крас.; Рэпрэсаваныя...*



ХАТУЛЁЎ Пятро [Пётр Фёдаравіч; 29.6.1912, Віцебск — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], літаратурны крытык. Пачаў выступаць на старонках бел. перыядычнага друку ў 1932. У 1934 скончыў МПІ. Працаваў у рэдакцыі газ. «Літаратура і мастацтва». На працягу 1934–36 апублікаваў, пераважна на старонках гэтай газеты, артыкулы, рэцэнзіі, нататкі пра творчасць А. Александровіча, П. Броўкі, Э. Самуйлёнкі, Ю. Таўбіна, У. Хадыкі, І. Шапавалава і інш. Выступаў супраць вульгарызатарскага падыходу да літаратуры, заклікаў улічваць асаблівасць гістарычнага часу і не шукаць ворагаў у XIX ст. Арыштаваны 3.10.1936 у Мінску па адрасе: вул. Р. Люксембург, д. 44, кв. 12.

З пратакола допыту П. Хатулёва ад 13.11.1936: *«В 1931 году у меня обнаружили нацдемовские стихи* (вершы, якія былі прысве-

чаны М. Багдановічу. — **Л. М.**), *написанные еще в Витебске и привезенные с собой. В связи с этим обо мне был поставлен вопрос на общеинститутском собрании, на котором мои стихи были осуждены, а мое пребывание в институте оказалось под вопросом ...»*

Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 як «член антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 29.9.1966. Асабовая справа Х. № 19561-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: «Мая другая кніга» Юлія Таўбіна // *ЛіМ*. 1932. 15 чэрв. Сааўт. І. Малец; Заўвагі пра творчасць П. Броўкі // *Полымя рэвалюцыі*. 1934. № 4.

Кр.: *Мушынскі М.* Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20–30-я гады). Мн., 1975; *БП*. Т. 6; *Рэпрэсаваныя...*



ЧАРНУШЭВІЧ Аляксандр Анікеевіч [1899, мяст. Капыль Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], парт. і дзяржаўны дзеяч. З бел. сялянскай сям'і. Удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў грамадзянскую вайну, потым барацьбы з бандытызмам. З 1922 на парт. рабоце: сакратар Грэскага райкама КП(б)Б, загадчык аддзелаў Бабруйскага і Віцебскага акруговых камітэтаў партыі, культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б. З кастр. 1932 — сакратар Мінскага гаркама КП(б)Б. У сак. 1933 — лют. 1936 наркам асветы БССР, потым загадчык аддзела забеспячэння Бел. геалагічнай разведкі. Член ЦК КП(б)Б (1929–36), член Бюро ЦК КП(б)Б (1931–34). Арыштаваны 19.6.1937 у Мінску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 31/33, кв. 30. Асуджаны тройкай НКВД 28.10.1937 як «член нацыянал-фашысцкай шкодніцкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.12.1956. Асабовая справа Ч. № 9842-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

4.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Энгельса, д. 64, кв. 2 арыштавана студэнтка 5 курса БДУ **Чарнушэвіч Марыя Лукінічна** (н. ў снеж. 1902 у в. Грыбаўшчына Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл.), жонка Аляксандра Чарнушэвіча. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі

канцлагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалена 5.11.1945. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 26.6.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Ч. № 6689-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *ЭГБ*. Т. 6/2; *Жертвы политического террора...; Рэпрэсаваныя...*



ЧАРОТ Міхась [сапр.: **Кудзелька Міхась Сымонавіч**; 7.11.1896, мяст. Рудзенск Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], паэт, драматург, празаік, рэдактар, грамадскі дзеяч, стрыечны брат Іосіфа і Івана *Кудзелькаў*. У 1917 скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Мабілізаваны ў армію; служыў афіцэрам запаснога палка ў Кузнецку. Вясной 1918 вярнуўся ў Мінск; пачаў настаўнічаць у бел. школе; паступіў у МПІ. Спяваў у хоры Тэраўскага пры «Беларускай хатцы», быў старшынёй тэатральнай суполкі «Маладзік». Друкавацца пачаў у 1918. У 1919 — член Белнацкама і створанай пры ім Вайсковай Рады. Быў адным з арганізатараў Беларускай камуністычнай арганізацыі. З 1920 — супрацоўнік, у 1925–29 рэдактар газ. «Савецкая Беларусь». У 1922 апублікаваў першы зборнік вершаў «Завіруха». У 1923 удзельнічаў у стварэнні літаб'яднання «Маладняк», з якога выйшаў у канцы 1927. Некаторы час быў членам літаб'яднання «Полымя», потым уступіў у БелАПП. У 1922–24 — кандыдат у члены, у 1924–31 — член ЦВК БССР. У 1924 вучыўся ў Маскве ў Дзяржаўным інстытуце журналістыкі. У 1930-я г. працаваў загадчыкам літаратурнага сектара Дзяржаўнага выдавецтва БССР, кансультантам у кабінеце маладога аўтара СП БССР. Падчас арышту загадчык літаратурнага сектара Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Быў жанаты, гадаваў сына Вячаслава, дочак Святлану, Зінаіду, Алену (усе ва ўзросце ад 6 да 11 гадоў). Арыштава-



М. Чарот з братам А. Кудзелькам.

ны 24.1.1937 у Мінску па адрасе: вул. Ленінская, д. 35, кв. 1, адначасова выключаны з ВКП(б).

З пратакола вобыску: *«...документы, журналы — 210 штук, книги — 85 штук, переписка — 127 страниц, рукописи — одна пачка...»*

Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 у 10.00 як «агент польскай разведкі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Апошні верш «Прысяга» запісаў на сцяне мінскай унутранай турмы НКВД.

З успамінаў Міколы Хведаровіча: *«У 1939 годзе я быў пераведзены ў адзіночную камеру. Уважліва аглядзеў сцены, шукаючы надпісаў, і вось у кутку прачытаў тэкст верша, выкалупаны нечым вострым на сцяне. Гэта была апошняя сустрэча з маім любімым паэтам і другам Міхасём Чаротам. Гадамі я захоўваў гэтыя яго словы ў сэрцы:*

Я не чакаў
І не гадаў,
Бо жыў з адкрытаю душою,
Што стрэне лютая бяда,
Падружыцца з допытам,
З турмою.

Прадажных здрайцаў ліхвяры
Мяне заціснулі за краты.
Я прысягаю вам, сябры,
Мае палі,
Мае бары, —
Кажу вам — я не вінаваты!»[1]

Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 8.12.1956. Асабовая справа К. № 8153-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Імем Ч. названы вуліцы ў Маладзечне і Рудзенску.

5.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Старажоўская, д. 47, кв. 2 арыштавана хатняя гаспадыня **Дадыка Ефрасіння Тарасаўна** (н. ў 1903), жонка Міхася Чарота. 28.11.1937 асобай нарадай пры НКВД асуджана як «член сям'і здрадніка радзімы» да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР (Акмолінск). Загінула ў зняволенні ў першай палове 1940-х г. Рэабілітавана 11.3.1957 трыбуналам БВА. Асабовая справа Ч. № 10102-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Творы: У 3 т. Мн., 1932–1936; Збор твораў: У 2 т. Мн., 1958; Выбраныя вершы і паэма «Босыя на вогнішчы». Мн., 1967; Выбранае. Мн., 1982.

[1] *ЛіМ.* 1965. 22 чэрв.

Кр.: *Ярош М.* Міхась Чарот: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1963; *Яго ж.* Міхась Чарот. Мн., 1966; Песняр революционной романтики. Мн., 1983; *БП.* Т. 6; *Рэпрэсаваныя...*



ШАЛАЙ Макар [сапр.: **Шалаеў Макар Ксенафонтавіч**; 17.2.1906, в. Цельцы Расонскага р-на Віцебскай вобл. — 29.10.1937, Мінск, турма НКВД], літаратурны крытык. Скончыў партшколу ў Віцебску. У 1925–26 сакратар Народнага дома пры выканкаме Расонаў. Член Беларускай літаратурна-мастацкай камуны (1927–28). Друкаваўся ў час. «Росквіт». Працаваў у газ. «Чырвонаармейская праўда». Выступаў з рэцэнзіямі на творы П. Броўкі, А. Александровіча, Я. Скрыгана, Г. Брэскай і інш. У 1928 паступіў у БДУ (пры дапамозе наркама асветы А. Баліцкага і П. Шукайлы).

З успамінаў Я. Скрыгана: *«Я жыў з Макарам Шалаем, чалавекам нястрымнага запалу спрэчак. Ён назубок ведаў класікаў марксізму, Чарнышэўскага, Герцэна, Дабралюбава, Пісарава, Пляханава і логікай іх мыслення збіваў з ног любога праціўніка. Ён не мысліў сябе без спрэчак і шукаў толькі такога асяроддзя...*

Мы, асабліва Макар Шалай і Апанас Сідарэнка, заспрачаўшыся па якой кнізе ці па якому пытанню эстэтыкі, маглі забыць на абед, на вячэру, хапацца за чубы, прасядзець усю ноч, плаваючы ў сінім дыме...»

З восені 1928 — член «Маладняка», потым БелАППа. Арыштаваны 15.3.1933 па справе «Беларускай народнай грамады». Пасля катаванняў вызвалены з дыягназам шызафрэнія. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. У сярэдзіне 1930-х г. выкладаў літаратуру ў Расонскай СШ. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Другі раз арыштаваны 17.11.1936, верагодна, у мяст. Расоны Віцебскай вобл. Перавезены ў Мінск.

З успамінаў С. Грахоўскага: *«З «амерыканкі», унутранай турмы НКВД у Мінску, мяне перавялі ў старую турму на вуліцы Валадарскага. Пасля адзіночкі ў «амерыканцы», дзе я амаль развучыўся гаварыць, у вялікай «замкавай» камеры, нягледзячы на глыбокую ноч, мяне сустрэлі — бог ты мой! — сябры-пісьменнікі Сяргей Дарожны, Сымон Куніцкі, Макар Шалай... На прагулку нас выводзілі ў турэмны двор, які быў разбіты на маленькія клетачкі метраў па дваццаць — дваццаць пяць. У гэтых клетках мы і хадзілі кругам... Кругам у клетках...»*

Асуджаны 28.10.1937 тройкай НКВД як «член антысавецкай арганізацыі» і за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 20.7.1957. Асабовая справа Ш. № 6742-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Кандыбовіч С.* Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі. Мн., 2000; *Рэпрэсаваныя...*

ЗЯЛЕНСКІ Баляслаў Антонавіч (1891), працаваў у калгасе «Піянер». Арыштаваны 15.3.1938. Асуджаны 2.11.1938.

ІВАНОЎСКІ Леанід Данілавіч (1896), кіраўнік спраў «Белзаготскота». Арыштаваны ў 1938. Асуджаны 22.9.1938.

КАПЧЫЦ Нісан Хаймавіч** (1896), гандлёвы агент Старобінскага сяльпо. Арыштаваны 23.8.1938. Асуджаны 15.10.1938.

КАРАБАН Мікалай Ільіч (1885), начальнік дэпо Нёманскай галіны Уздзенскага леспрама. Арыштаваны ў 1938. Асуджаны 2.11.1938 (?).

КАРУСЁЎ Цімафей Сямёнавіч* (18.1.1884), настаўнік вячэрняй школы ў Мсціславе. Арыштаваны 31.7.1938. Асуджаны 15.11.1938.

КАЦНЕЛЬСОН Якаў Яўсеевіч** (1891), сталяр. Арыштаваны 9.1.1938. Асуджаны 29.3.1938.

КОРАХ Рыгор Лейбавіч (1895), дырэктар зубапратэзнай майстэрні ў Мінску. Арыштаваны ў 1938. Асуджаны 26.5.1938.

КРАСНІЦКІ Аляксандр Апанасавіч* (1890), настаўнік нямецкай мовы ў Магілёўскай школе № 1. Арыштаваны 31.8.1938. Асуджаны 11.11.1938.

КРУТКОВІЧ Меер (Бэр, Барыс) Зарохавіч (Захаравіч) (ліп. 1900). Арыштаваны 27.3.1938. Асуджаны 12.11.1938.

КРЫВАДУБСКІ Ігнат Ігнатавіч* (1894), псаломшчык Успенскага сабора ў Слуцку Мінскай вобл. Асуджаны 13.11.1938.

КЯРУБІН Пётр Язэпавіч** (1891), пенсіянер. Арыштаваны 9.1.1938. Асуджаны 12.4.1938.

ЛЕШЧАНКА Аляксандр Сцяпанавіч (1876), селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.6.1938. Асуджаны 12.11.1938.

ЛІПСКІ Фадзей Язэпавіч (1902), майстар цэха абутковай фабрыкі імя Тэльмана ў Мінску. Арыштаваны 25.8.1937. Асуджаны 8.1.1938.

ЛОСІК Сямён Міхайлавіч (10.9.1898), працаваў у калгасе «Гігант». Арыштаваны 10.8.1938. Асуджаны 2.11.1938.

ЛЬВОВІЧ Давыд Абрамавіч* (3.1.1898), педагог. Арыштаваны 1.11.1937. Асуджаны 9.4.1938.

ЛЮТАРЭВІЧ Антон Язэпавіч (1896), селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.8.1938. Асуджаны 15.10.1938.

ЛЯЎКЕВІЧ Мацвей Міхайлавіч (14.2.1898), аграном Крупскай МТС. Арыштаваны 9.1.1938. Асуджаны 29.3.1938.

МАЛІНОЎСКІ Ігнат Адамавіч (снеж. 1898), працаваў у калгасе «Памяць Леніна». Арыштаваны 10.7.1938. Асуджаны 12.11.1938.

МАМЧЫЦ Пётр Язэпавіч** (1900), брат Р. *Мамчыца* (гл.: 6.11.1938), працаваў у калгасе «Шлях праўды». Арыштаваны 8.7.1937. Асуджаны 2.11.1938.

МАРГОЛІН Мордух Давыдавіч (3.12.1893), загадчык хімічнай лабараторыі «Цэнтраспірт». Арыштаваны 9.1.1938. Асуджаны 12.4.1938.

МАРОЗ Адам Іванавіч (1902), касір пошты чыгуначнай ст. Мінск. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 8.1.1938.

МАСКАЛЕНКА Георгій Рыгоравіч (4.2.1883), старшыня калгаса «Перамога». Арыштаваны 15.8.1938. Асуджаны 15.10.1938.

МАТУЛАЙЦІС Кацярына Станіславаўна* (5.1.1900), гісторык. Арыштавана 9.8.1937. Асуджана 12.4.1938.

МАШУКЕВІЧ Іван Мацвеевіч (1896), працаваў у калгасе «Новае жыццё». Асуджаны 11.11.1938.

МАШЭЎСКІ Пётр Рыгоравіч (1895), працаваў у калгасе «Чырвоны партызан». Арыштаваны ў кастр. 1937. Асуджаны 8.1.1938.

МОРДУС (МОРДАС) Язэп Ігнатавіч (1898), рабочы шчотачнай фабрыкі (Мінскі р-н). Арыштаваны 26.1.1938. Асуджаны 26.2.1938.

МЫТНІК Лаўрэн Язэпавіч (24.5.1891), бондар нафтабазы ў Барысаве. Арыштаваны 17.7.1938. Асуджаны 11.11.1938.

МЯЛЬГУЙ Станіслаў Пятровіч (1888), наборшчык друкарні газ. «Звязда». Арыштаваны ў 1938. Асуджаны 20.9.1938.

НЕЙЛАНД Кацярына Якаўлеўна (1899), медсястра 3-й Савецкай бальніцы ў Мінску. Арыштавана 9.1.1938. Асуджана 29.3.1938.

ПАНКОЎ Аляксей Аляксеевіч (30.9.1898), начальнік аддзела Дзяржплана БССР. Арыштаваны 1.4.1938. Асуджаны 21.9.1938.

ПАТРУБЕЙКА Антон Гаўрылавіч (1895), пажарны цагельнага завода № 5 (Мінскі р-н). Арыштаваны 8.1.1938. Асуджаны 25.3.1938.

ПАЎЛОВІЧ Міхаіл Францавіч (1902), працаваў у калгасе «Новы быт». Арыштаваны 7.7.1938. Асуджаны 2.11.1938.

ПАЎЛОВІЧ Франц Францавіч (1890), працаваў у калгасе «Чырвоны сцяг». Арыштаваны 27.7.1938. Асуджаны 2.11.1938.

ПАЎЛЮКЯВІЧУС Банавентура Казіміравіч* (16.10.1896), празаік, публіцыст. Арыштаваны 4.8.1938.

ПЕНЯЗЬ Ануфрый Трафімавіч (1898), працаваў у калгасе імя К. Лібкнехта. Арыштаваны 14.8.1938. Асуджаны 15.11.1938.

ПІЛІПЧЫК Антон Аляксандравіч (1900), працаваў у калгасе «Пуцілавец». Арыштаваны 16.7.1938. Асуджаны 15.11.1938.

ПЯНЧАНСКІ Гірш Бенцыянавіч (1893), урач-венеролаг Мінскай скурна-венералагічнай клінікі. Арыштаваны 31.1.1938. Асуджаны 29.3.1938.

ПЯТРОВІЧ Васіль Міронавіч* (кастр. 1905), службовец, педагог. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны 26.2.1938.

РАГОВІН Абрам Ісакавіч (1882), буфетчык арцелі інвалідаў у Мінску. Асуджаны 25.5.1938.

РАМЕЙКА Франц Казіміравіч (10.10.1891), шавец абутковай фабрыкі індывідуальнага пашыву ў Мінску. Арыштаваны 16.12.1937. Асуджаны 21.1.1938.

РОЎКАЧ Раман Аляксандравіч (14.10.1898), эканаміст фанерна-запалкавага трэста ў Мінску. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны 20.10.1937.

РУСЕЦКІ Іван Ануфрыевіч (8.9.1873), вартаўнік леспрамгаса. Арыштаваны 12.6.1938. Асуджаны 15.11.1938.

РЫБІНСКІ Казімір Фабіянавіч (4.3.1894), працаваў у калгасе «Прамень сацыялізму». Арыштаваны 8.3.1938. Асуджаны 15.11.1938.

САКАЛОЎ Фёдар Эраставіч (20.4.1903), загадчык гаспадаркі Каўгарскага спіртзавода. Арыштаваны 22.8.1938. Асуджаны 12.11.1938.

САНЬКО Мітрафан Іванавіч (1898), возчык Грэскага сяльпо. Арыштаваны 4.8.1938. Асуджаны 12.11.1938.

СЕРГІЕЎСКІ Барыс Аляксандравіч (1887), выкладчык Мінскага дарожна-механічнага тэхнікума. Арыштаваны 4.1.1938. Асуджаны 9.4.1938.

СІДАРОВІЧ Нічыпар Іванавіч (1888), працаваў у калгасе «Вольны шлях». Арыштаваны 13.7.1938. Асуджаны 11.11.1938.

СЛЯПЯН Іосіф Веньямінавіч* (1907), настаўнік матэматыкі Мінскай СШ № 6. Арыштаваны 4.3.1938. Асуджаны 26.5.1938.

СМОЛЬСКІ Осман Бякіравіч (1883), касір прыходнай кассы Белкамунбанка. Арыштаваны 26.7.1938. Асуджаны 1.11.1938.

СОЙКА Трафім Пятровіч (1892), працаваў у калгасе «Чырвоны камунар». Арыштаваны 26.7.1938. Асуджаны 12.11.1938.

СПАРЫХІН Барыс Вячаслававіч (1.5.1897), старшы эканаміст-фінансіст трэста Белкамунбуда. Арыштаваны 25.12.1937. Асуджаны 15.2.1938.

СТАНКЕВІЧ Міхаіл Пятровіч (1892), радыётэхнік Дома Урада. Арыштаваны ў студз. 1938. Асуджаны 26.2.1938.

СЯРГЕЕЎ Ігнат Рыгоравіч** (1894), пекар у пас. Мар'іна Горка. Арыштаваны 26.3.1938. Асуджаны 11.11.1938.

СЯЎКО Мікалай Васілевіч (1897), цясляр «Белкамунзабеспячэння» ў Мінску. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 26.5.1938.

СЯЎРУК Сцяпан Фёдаравіч (май 1885), нам. кіраўніка Старобінскай канторы «Заготскот». Арыштаваны 24.2.1938. Асуджаны 14.11.1938.

СЯЦКО (СЕЦКА) Сяргей Лукашавіч (1888), селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.4.1938. Асуджаны 22.9.1938.

ТАРАШКЕВІЧ Браніслаў Адамавіч* (8(20).1.1892), грамадскі і паліт. дзеяч, мовазнавец, перакладчык, публіцыст. Арыштаваны 5.5.1937. Асуджаны 5.1.1938.

ТУРНІЦКАЯ Міра Абрамаўна* (1904), інспектар Наркамата аховы здароўя БССР. Арыштавана 13.8.1937. Асуджана 21.1.1938.

ХІНЕВІЧ Канстанцін Фадзеевіч (1901), майстар бровара ў мяст. Мір. Арыштаваны 30.12.1937. Асуджаны 15.2.1938.

ХРАПІН Язэп Ульянавіч** (1900), працаваў у калгасе «Памежнік». Арыштаваны 31.7.1938. Асуджаны 19.11.1938.

ЧАЙКА Канстанцін Васілевіч** (1895), працаваў у калгасе «Прамень». Арыштаваны 26.8.1938. Асуджаны 15.10.1938.

ЧАРАПОВІЧ Антон Аляксандравіч** (11.9.1889). Арыштаваны 4.2.1938. Асуджаны 26.2.1938.

ЧАПУРКА Уладзімір Міхайлавіч** (1891), працаваў у калгасе «Хваля рэвалюцыі». Арыштаваны 30.7.1938. Асуджаны 15.11.1938.

ШАГУН Альфонс Севасцянавіч (Аляксандравіч) (3.8.1898), працаваў у калгасе імя К. Маркса. Арыштаваны 31.7.1938. Асуджаны 12.11.1938.

ШЫГАЛА Міхаіл Канстанцінавіч (1894), селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.8.1938. Асуджаны 11.10.1938.

ЭНЦІН Міхаіл Гіляравіч (1899), эканаміст-планавік фабрыкі імя Куйбышава ў Мінску. Арыштаваны 3.2.1938. Асуджаны 26.5.1938.

ЮРКЕВІЧ Канстанцін Язэпавіч** (1897), працаваў у калгасе «Чырвоны Захад». Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны 12.11.1938.

ЯНОВІЧ Канстанцін Ксенафонтавіч (26.2.1898), працаваў у калгасе «Нараджэнне сацыялізму». Арыштаваны 7.8.1938. Асуджаны 15.11.1938.

ЮР'ЕЎ Раман Іосіфавіч* (1891), настаўнік. Арыштаваны 10.8.1938. Асуджаны 11.11.1938.

1938 (месяц і дзень невядомы)

АПІН Пётр Ільзавіч (22.3.1886), грузчык чыгуначнай транспартнай экспедыцыйнай канторы. Арыштаваны 4.12.1937. Асуджаны 10.1.1938.

БУРКЕВІЧ Уладзімір Канстанцінавіч** (1919), селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.5.1938. Асуджаны 1.9.1938.

ГАРДЗЕЙ Мікалай Юр'евіч (снеж. 1905), брат С. *Гардзея* (гл.: 25.4.1938), землямер Чэрвеньскага райземаддзела. Арыштаваны 8.1.1938. Асуджаны 29.3.1938.

ГУТГАРЦ Ізраіль (Сруль) Беркавіч (1901), токар завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Мінску. Арыштаваны ў снеж. 1937. Асуджаны 5.1.1938.

ЖДАНОВІЧ Станіслаў Аляксандравіч** (1895), працаваў у калгасе «Камінтэрн». Арыштаваны 5.1.1938. Асуджаны 9.1.1938.

ЖУК Емяльян Мікалаевіч (25.8.1895), закройшчык Мінскай швейнай фабрыкі «КІМ». Арыштаваны 14.10.1937. Асуджаны 14.12.1937.

КАЗІМІРЧЫК Уладзімір Лук'янавіч** (1907), дзяжурны чыгуначнай ст. Крупкі. Арыштаваны 9.7.1938. Асуджаны 16.10.1938.

КАСЦЯН Іван Іванавіч (1899), водаправодчык гарбарнага завода «Бальшавік» у Мінску. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 9.12.1937.

КУЗЬМІЦКІ Франц Язэпавіч (1910), грузчык чыгуначнай ст. Негарэлае. Арыштаваны 5.7.1938. Асуджаны 7.10.1938.

КУНІЦКІ Адольф Антонавіч** (1900), працаваў у калгасе «Новае жыццё». Арыштаваны 13.8.1938. Асуджаны 2.11.1938.

КУШАЛЬ Аляксандр Лукіч (1885), настаўнік Курганскай СШ. Арыштаваны 9.1.1938. Асуджаны 20.9.1938.

ЛОБАЧ Міхаіл Раманавіч (1896), конюх калгаса «Ленінскі шлях». Арыштаваны 11.3.1938. Асуджаны 14.3.1938.

ЛЯЎКО Браніслаў Іванавіч (1898), працаваў у калгасе «Усход». Арыштаваны 20.11.1937. Асуджаны 14.12.1937.

ЛЯШКО Франц Адамавіч (1900), шавец арцелі «Каапрамонт» у Каралішчавічах. Арыштаваны 20.11.1937. Асуджаны 14.12.1937.

МАЛАШ Лаўрэн Фёдаравіч (1895), калгаснік. Арыштаваны 18.11.1937. Асуджаны 8.1.1938.

МЫСЛІЦКІ Язэп Серафімавіч** (1892), шавец арцелі інвалідаў «Чырвоная зараніца». Арыштаваны 30.7.1938. Асуджаны 3.11.1938.

НОВІК Несцер Васілевіч** (13.3.1876), працаваў у калгасе «Новы шлях». Арыштаваны 6.1.1938. Асуджаны 8.1.1938.

НЯМКОВІЧ Аляксей Рыгоравіч** (1900), працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 13.8.1938. Асуджаны 8.10.1938.

ПАНАМАРЭНКА Мікалай Іванавіч (1903), начальнік склада № 96 у Мінску. Арыштаваны 5.8.1938. Асуджаны 11.10.1938.

ПАНКРАШОЎ (ПАНКРАШАЎ) Іван Міхайлавіч (1903), майстар шклозавода ў Барысаве. Арыштаваны 4.12.1937. Асуджаны 21.1.1938.

ПАХАМОВІЧ Васіль Мікалаевіч (1898), грабар. Арыштаваны 9.2.1938. Асуджаны 16.4.1938.

РУСЕЦКІ Васіль Якаўлевіч (28.2.1885), дырэктар завода імя Мяснікова ў Мінску. Арыштаваны 26.7.1938. Асуджаны 7.10.1938.

РЫМАШЭЎСКІ Зянон Адамавіч* (9.7.1905), дацэнт Мінскага педагагічнага інстытута. Арыштаваны 20.1.1937. Асуджаны 14.12.1937.

ТАРАСІК Вікенцій Іванавіч (1897), дзясятнік «Свіслачбуда». Арыштаваны 14.1.1938. Асуджаны 26.2.1938.

САДОЎСКІ Антон Станіслававіч** (1900), сакратар партбюро 39-га кавалерыйскага палка. Арыштаваны 20.3.1938. Асуджаны 2.7.1938.

СКУРЛАТОВІЧ Васіль Міхайлавіч (1879), калгаснік. Арыштаваны 17.7.1938. Асуджаны 3.11.1938.

СТАВЕР Аляксандр Міхайлавіч (1916), тынкоўшчык АТС у Мінску. Арыштаваны 5.9.1937. Асуджаны 3.11.1938.

СТАСЮЛЕВІЧ Марк Фаміч (Цімафеевіч)** (1902), працаваў у калгасе «Улада Саветаў». Арыштаваны 18.1.1938 (?).

ЦЭБЕРГ Аляксандр Карлавіч (1874), тэлеграфіст чыгуначнай ст. Радашковічы. Арыштаваны 5.12.1937. Асуджаны 8.1.1938.

ХТО НАСТУПНЫ?

З успамінаў Міхася Кавыля «Казённы дом і далёкая дарога» (падзеі, якія ў іх апісваюцца, адбываліся ў канцы лют. 1933 года):

«…із камеры дыхнула такім смуродам, што ледзь утрымаўся на нагах. Як п'яны апусьціўся тут жа каля дзьвярэй на нары, паміж нечых худых, як у рахітыка, ног. Паглядзеў на вялікую камеру. На нарах, на цэмэнтовай падлозе адзін каля аднаго ляжалі, хто на баку, хто на сьпіне, нейкія стварэньні із Дантавага «аду».

…Неўзабаве пасля гэтай страшнай ночы мяне, каб не ганяць «чорны воран» па Мінску, перакінулі із вастрогу ў «страшны дом» на Савецкай вуліцы, бліжэй да следчых. У камеры ляжалі голыя на цэмэньце Зьмітрок Паваротны[1] і Чарняўскі, імя не памятаю…

… Два гэпэвушнікі палезьлі [пад нары] да Макарэнкаў і сталі цягнуць іх за ногі… Тыя небаракі-сьмяротнікі паднялі такі крык і лямант, што ўсю камеру кінула ў дрыжыкі… Не памаглі ні крык, ні хапаньне рукамі за цэмэнт, за нары. Павалаклі…»[2].

З успамінаў Міколы Хведаровіча, адноўленых Янкам Брылём (падзеі, якія ў іх апісваюцца, адбываліся ў пачатку жн. 1938 года):

«Камера на дзесяць чалавек, а нас там каля сотні. Мокрыя ад поту, у адных трусах, ляжым проста адзін на адным.

А параша саракавядзёрная, ажно брадзіць пачынае ад гарачыні. Уранні наглядчык адчыніць дзверы, а сам набок, каб духам з ног не збіла!»[3]

З ліста журналіста Мікалая Сцерніна (Багдановіча) сакратару ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка (дат. 29.7.1939):

«Днем и ночью из кабинетов следователей, находящихся в тюрьме, неслись дикие крики, вопли и стоны избиваемых и пытаемых людей. С допросов [людей возвращали] в камеры с разбитыми головами, иссеченными, в кровоподтека и синяках, спиной и грудью, распухшими лицами, вырванными волосами, выкрученными руками, ободранными ногтями…»

«И кулаками и сапогами били меня, — расказаў мне брыгадзір калгаса «Сталінец» Сцяпан Шэлег, — все терпел. А как садану-

---

[1] Беларускі журналіст. Арыштаваны органамі НКВД 2 красавіка 1933 года. Этапаваны ў адзін са сталінскіх канцлагераў. Далейшы лёс невядомы.

[2] Запісы. 1992. № 20.

[3] *Брыль Я.* Сцежкі, дарогі, прастор. Мн., 2001. С. 213.

ли сапогом в живот — выбили грыжу. Вижу — смерть моя приходит. Махнул рукой: «Пишите, что хотите. Все подпишу...»[1]

Урывак з дзённіка К. Чорнага (запіс ад 3 кастр. 1944 года):

«У яжоўскай турме [у камеры-адзіночцы] увосень 1938 мяне саджалі на кол, білі вялікім жалезным ключом па галаве і палівалі збітае месца халоднай вадой, паднімалі і кідалі на рэйку, білі паленам па голым жываце, устаўлялі ў вушы папяровыя трубы і раўлі ў іх на ўсё горла...»[2]


У падвалах ГПУ-НКВД чамусьці заўсёды было нясцерпна горача і моташна смуродна, але рэдка ціха і «сумна». Асабліва ноччу. То закрычыць ад болю яшчэ не страціўшы свядомасць ад катаванняў падследны, то пранясецца па турме роспачны лямант звар'яцелага за хвіліну да смерці бедалагі, прыгаворанага да расстрэлу, якога выцягваюць, вырываюць з камеры, а ён чапляецца з апошніх сіл за нары і жыццё. То рэха пісталетнага стрэлу адразу сотням пакутнікаў прымусіць задаць сабе адно і тое самае пытанне: «Хто наступны?»

У падвалах ГПУ-НКВД чамусьці заўсёды было нясцерпна горача і моташна смуродна, але рэдка ціха і «сумна».

Хто наступны?

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 16.

[2] *Чорны Кузьма*. Выбраныя творы. Мн., 2000. С. 589.



Прыкладная схема комплексу будынкаў КДБ Беларусі

1. Галоўны ўваход у цэнтральны корпус.
2. Цэнтральны корпус.
3. Славутая турма КДБ — „амерыканка".
4. Новае правае крыло.
5. Прагулачныя дворыкі для арыштантаў.
6. Уваход у "бюро пропускаў".
7. Уваход у "Дом культуры" імя Ф. Дзяржынскага.
8. Вароты для аўтатранспарту.
9. „Парадны" ўваход у будынак Міністэрства унутраных спраў Беларусі.
10. Тэхнічныя службы.

Аўтар схемы — Славамір Адамовіч

1996 – 2002 гг.

Яны вынішчалі нашых продкаў

Народныя камісары (наркамы) і памочнікі (намеснікі) наркамаў унутраных спраў (УС) БССР перыяду так званага крывавага тунэля смерці
(са жніўня 1937 да лістапада 1938)

З 4.3.1937 да 22.5.1938 [за 444 дні] рэпрэсавана каля 100 тысяч чалавек; у сярэднім за ноч арыштоўвалі 230 (дзвесце трыццаць!) чалавек.



БЕРМАН Борис Давыдович[1]

Н. ў 1901 у в. Андрыянаўка Чыцінскага пав. Забайкальскай вобл. (Расія) у яўрэйскай сям'і, бацька — уласнік цагельнага завода. Скончыў 4-класнае гарадское вучылішча (1918).

У ЧК з 1921. У 1934–37 — нам. начальніка замежнага аддзела ГУДБ НКВД СССР. З 25.12.1936 — нам. наркама УС БССР, з 4.3.1937 — наркам УС БССР (да 22.5.1938), камісар дзяржбяспекі 3-га рангу. Асабіста ўдзельнічаў у катаваннях падследных[2]. У снеж. 1937 узнагароджаны ордэнам Леніна. Арыштаваны 24.9.1938. Асуджаны 22.2.1939 да ВМП. Расстраляны. Неўзабаве да ВМП былі прыгавораны і многія супрацоўнікі НКВД. Знішчаючы выканаўцаў сваіх загадаў, бальшавікі знішчалі сляды сваіх злачынстваў.

Брат Б., Мацвей Берман, кіраваў канцлагерамі «Беламорбуда». Расстраляны ў 1938.

З кнігі Дзмітрыя Быстралетава[3] «Пир бессмертных» (М.,1993): *«Однажды ночью дверь* (камеры ў маскоўскай турме НКВД

[1] З мэтай пазбегнуць памылак пры перакладзе прозвішчы, імёны і імёны па бацьку ўсіх карнікаў пададзены па-руску.

[2] У кнізе Р. Платонава «Лёсы» (Мн., 1998) прыводзіцца выступленне Б. Бермана 27.11.1937 г. перад выбаршчыкамі Расонскага раёна: *«Таварыш Сталін даў указанне граміць ворагаў, і мы пачалі іх граміць»* (Советская Белоруссия. 1937. 3 снеж.).

[3] Быстралетаў (Талстой) Дзмітрый Аляксандравіч [4.1.1901, мяст. Ачкора, Крым, цяпер Украіна — 3.5.1975, Масква], савецкі разведчык, літаратар, журналіст, кінасцэнарыст, мастак, фатограф, мемуарыст, вязень сталінскіх канцлагераў. Скончыў каледж для еўрапейцаў-хрыс-

Ляфортава. — **Л. М.**) *со скрипом растворилась, и в комнату еле шагнул через порог тощий мужчина неопределённого возраста с измученным худым лицом.*

— Алексей Алексеевич Наседкин, — представился он мёртвым голосом и бессильно повалился на койку.— Из ГУГБ.

Я назвал себя и вкратце рассказал свою историю. Новый напарник чуть оживился и, с трудом переводя дыхание, заговорил:

— В последнее время я был наркомом внутренних дел Белоруссии... Сменил там Бориса Бермана... В Минске это был уже не тот Берман, которого вы когда-то встречали в Берлине, и даже не тот, у которого частенько сидели в кабинете на Лубянке...

В Минске это был сущий дьявол, вырвавшийся из преисподней... У меня дядя умер от рака печени, так вот тогда Берман так же ежедневно менялся к худшему, как раковый больной. Но у дяди болезнь была незаразной, а здесь же чахнул и таял на глазах сам Борис и при этом распространял вокруг себя смерть. Он сам был раковой опухолью на теле Белоруссии... Дмитрий Александрович! Слушайте: Берман расстрелял[1] *в Минске за неполный год работы*[2] *больше восьмидесяти тысяч человек. Слышите? Он убил всех лучших коммунистов республики. Обезглавил советский аппарат. Истребил цвет национальной белорусской интеллигенции. Тщательно выискивал, находил, выдергивал и уничтожал всех мало-мальски выделявшихся умом... Писателей, ученых, художников... Восемьдесят тысяч невинных жертв... Гора залитых кровью трупов до небес...»*

З кнігі А. Лукашука «За кіпучай чэкісцкай работай»: З жыцьця катаў» (Мн., 1997):

«Празьмерная стомленасьць, болі ў раёне сэрца, — запісвалі лекары паказаньні чарговага пацыента. Той расказваў, што апошнія пяць гадоў рэгулярна прымае душ Шарко, а таксама цыркулятарны, вэерны, дажджавы, сасновыя ванны, але ўсё роўна адчувае перастому. — Трэба берагчы сябе, таварыш наркам, Вы патрэбныя партыі. Вось выпішам рэцэпт, адпачніце, а потым зноў,

---

ціян у Канстанцінопале (1921), Пражскі (1928) і Цюрыхскі (1935) ун-ты, вучыўся ў Берлінскай і Парыжскай мастацкіх акадэміях. Жыў у Праге, Берліне, Лондане, Нью-Йорку, Цюрыхе... Выдатна валодаў дзвюма тузінамі моў ад ангельскай да японскай. Менавіта Б. завербаваў Кіма Філбі. Арыштаваны 18.11.1938. Асуджаны да 20 гадоў ППК. Вызвалены ў 1954 напалову паралізаваным. Рэабілітаваны. Працаваў перакладчыкам. Адмовіўся ад пенсіі КДБ СССР.

[1] Памылка. Не расстраляў, а арыштаваў. Расстраляна больш за 10 тысяч чалавек (у Мінску). Арыштавана каля 100 тысяч.

[2] За год і тры месяцы.

калі ласка, да нас на абсьледаваньне».

Барыс Давыдавіч Берман, а такое было імя пацыента, які наведаў паліклініку санітарнага аддзелу НКВД 13 сьнежня 1937 году, больш да лекараў не прыйшоў: праз тыдзень, да 20-й гадавіны ЧК, наркам атрымаў ордэн Леніна за ўдарнае выкрыцьцё ворагаў народу ў Беларусі, а потым быў адкліканы ў Маскву, дзе ад перастомы і боляў у сэрцы лячылі куляй у патыліцу...»

ХОРХОРИН Григорий Сергеевич (нам. Бермана)



Н. 20.1.1900 у Пецярбургу ў сям'і сталяра. Скончыў пачатковае гарадское вучылішча (1912). У 1917 працаваў тэлеграфістам у Петраградзе. У ЧК з 1920. З 5.12.1935 маёр дзяржбяспекі[1]. Са снеж. 1936 — начальнік 3-га аддзела УДБ НКВД БССР, з 15.8.1937 — нам. наркама УС БССР (да 1.10.1937). Асабіста ўдзельнічаў у катаваннях падследных. Арыштаваны 5.12.1938. Забіты падчас следства (1939).

ЖАБРЕВ Иван Андреевич (нам. Бермана)

Н. ў 1898 ва Усцюжыне Валагодскай губ. у сям'і рускага рабочага. Скончыў пачатковае вучылішча (1916). У ЧК з 1920. З 7.7.1937 — начальнік Гомельскага гарадскога аддзела НКВД, потым — начальнік 3-га аддзела УДБ НКВД БССР, нам. наркама УС БССР (да 26.2.1938). Асабіста ўдзельнічаў у катаваннях падследных, дапытваў Міхайлу Піятуховіча і інш. Арыштаваны 17.11.1938. Асуджаны 22.2.1939 да ВМП. Расстраляны.

З ліста асуджанага Г. А. Кашыцына сакратару ЦК ВКП(б) Г. Малянкову:

«Кошкин[1] *избивал арестованную Бобровскую шомполом. На суде*

[1] Маёр дзяржбяспекі — камбрыг (генерал) РСЧА;
іншыя вайсковыя званні:
сяржант дзяржбяспекі — лейтэнант РСЧА;
малодшы лейтэнант дзяржбяспекі — старшы лейтэнант;
лейтэнант дзяржбяспекі — капітан;
старшы лейтэнант дзяржбяспекі — маёр;
капітан дзяржбяспекі — палкоўнік.



признал, что избивал арестованных по указанию Жабрева...»[2]

З абвінаваўчага заключэння па крымінальнай справе № 48805 (ад 2.10.1939):

«5.2.1938 Серышев вместе с Жабревым дал санкцию на арест по необоснованным материалам на 30 человек ассерийцев. Впоследствии... 5 человек из них умерло в тюрьме...»[3]

З 22.5.1938 да 16.12.1938 [менш чым за 7 месяцаў] рэпрэсавана ад 20 000 да 30 000 чалавек; у сярэднім за ноч арыштоўвалі каля 120 (ста дваццаці) чалавек.

НАСЕДКИН Алексей Алексеевич



Н. 6.2.1897 у в. Маўрына Растоўскага пав. Яраслаўскай губ., Расія (паводле іншых звестак — у Маскве) у сям'і рабочага. Скончыў 4-класнае гарадское вучылішча ў Маскве (1910), курсы чырвоных камандзіраў (1919), Маскоўскі электратэхнікум (да 1927). Удзельнік падаўлення сялянскіх выступленняў на Тамбоўшчыне (так званага Антонаўскага мяцяжу). З 1927 — супрацоўнік АДПУ. З 1934 — нам. начальніка, начальнік эканамічнага аддзела УДБ НКВД па Куйбышаве і Маскоўскай вобл., начальнік УДБ НКВД па Смаленскай вобл. Маёр дзяржбяспекі. З мая 1938 наркам УС БССР. Арыштаваны 16.12.1938. Асуджаны да ВМП 25.1.1940. Расстраляны. Татальнае знішчэнне бальшавікамі слядоў арганізаванага імі генацыду супраць беларускага народа прадугледжвала забойства і тых, хто выконваў іх злачынствы.

З ліста А. Наседкіна да Л. Берыі:

«По вопросу расследования фактов нарушения революционной

---

[1] Супрацоўнік УНКВД па Гомельскай вобл.

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1706, л. 21–35.

[3] Тамсама, с. 1703, л. 29.

законности со стороны аппарата НКВД БССР тов. Пономаренко первоначально занял позицию отстранения всех работников, которые принимали участие в избиениях арестованных... Я ему объяснил, что если пойти по этому пути, то надо 80 процентов всего аппарата НКВД БССР снять с работы и отдать под суд».

СТОЯНОВСКИЙ — нам. наркама.

З выступу Стаяноўскага на адным з аператыўных паседжанняў (1938 г.):

«На сегодняшний день... 1200 арестованных... сидят от 9 месяцев до 2 лет. Этот груз, 1200 человек, будет представлять исключительную трудность по целому ряду моментов. Потому что документировать дела на лиц, которые арестованы 2 года тому назад, которые обвиняются во вредительстве, шпионаже и терроре, конечно, сейчас будет труднее. Вторая трудность — это следующее: мы оформим этих 1200 человек, а они все 1200 битые, да битые до потери сознания, с отливкой водой да в «парилку». Это даст большую трещину в авторитете наших органов. Ибо ни один арестованный, ни один обвиняемый, который прошел эту школу наших оперативных групп, в свое время молчавший об этом, теперь молчать не будет».

З ліста невядомага сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку (ад 11.12.1938):

«С приездом в БССР Наседкина и Стояновского... репрессии были усилены... Арестованных сажали в «парилки», на «кол», избивали и т. п.»[1]

Старшыні спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда СССР (у народзе — «тройкі»)**:**

нарозных судзілішчах — **В. С. КАРПИК**[2]**, И. О. МАТУЛЕВИЧ**.

Сакратары спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда СССР:

нарозных судзілішчах — **ВИНОГРАДОВА, М. КУДРЯВЦЕВ, КУЗНЕЦОВ**.

Члены спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда СССР:

нарозных судзілішчах — **ЗАРЯНОВ, ЗУБЧЕНКО**, **М. МИЛЯКОВСКИЙ, ФЕДОСЕЕНКО**.

Член Вярхоўнага суда БССР:

АБРАМОВ.

З ліста В. Кундовіча[1] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

---

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1408, л. 2–3.

[2] Кажуць, што гэты «чэмпіён» па судзілішчах памёр ужо падчас перабудовы.

«Случайно мне стало известно, что бывший зам. начальника УНКВД по Могилевской обл. Абрамов, член КП(б)Б, ныне работает на руководящей работе в Верховном суде БССР. Я, как подлинный большевик-коммунист... считаю своим долгом довести до сведения ЦК КП(б)Б о том преступлении, которое проводил Абрамов совместно с бывшим начальником УНКВД Ягодкиным. 25.5.1938 я был подвергнут аресту... брошен в подвал. Я увидел, что в подвале ежедневно умирают заключенные, что смерть происходит исключительно от побоев... Попросту говоря — людей забивали... В июле 1938 года я был вызван на «допрос» в комнату 11а и оказалось, что я попал в кабинет Абрамова... Абрамов требовал от меня признаний, что я контрреволюционер, наносил мне оскорбления... Когда я заявил, что при допросе следователь Юрков применял ко мне пытки и всевозможные издевательства, Адрамов сказал, что поскольку я преступник и контрреволюционер, то других методов ко мне и быть не может... 10 с половиной месяцев я подвергался невыносимо тяжелым пыткам и мучениям, будучи совершенно невиновным. Об этом знал и Абрамов... Он должен нести ответ... Как он может работать в Верховном Суде?»[2]

СЛЕДчЫя УДБ НКВД БССР, яКJя ПРАВОДЗJЛJ ДОПЫТЫ ВА ўНУТРАНАЙ ТУРМЕ НКВД[3] (ТАК ЗВАНАЙ «АМЕРЫКАНЦЫ»)

Кіраўнікі аддзяленняў і аддзелаў УДБ НКВД БССР і іх намеснікі:

КАРЕЛИН Владимир Петрович (н. ў 1897 у Адэсе ў сям'і рускага настаўніка; з 1917 член партыі эсэраў, з 1931 у ВКП(б); у ЧК з 1921; працаваў у АДПУ-НКВД Украіны; з 1935 у БССР, маёр дзяржбяспекі (1935); са студз. 1937 нам. начальніка 5-га (асобага) аддзела УДБ НКВД БССР[4]; зацвердзіў пастановы на арышт і вобыск у кватэрах Анатоля Вольнага, Алеся Дудара, Міхася Зарэцкага, Сымона

[1] Кундовіч Віталь Вікенцевіч. Член ВКП(б) з 1924. Да арышту жыў у Магілёве па адрасе: вул. Ленінская, д. 53. Арыштаваны 26.5.1938. Вызвалены ў крас. 1939. Далейшы лёс невядомы.

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1805, л. 213–214.

[3] У другой палове 1930-х г. камендантам турмы, верагодна, быў *Ермолаев Александр Константинович*. Акрамя іншых сваіх абавязкаў, адследжваў, як абшукваюць арыштаваных пры паступленні ў турму. Арыштаваны і асуджаны да ВМП (заменена на 10 гадоў ППК).

[4] Тут і далей указаны даты, калі дакладна вядома, хто ў гэты час кіраваў аддзелам або аддзяленнем.

Баранавых, Валерыя Маракова, Барыса Мікуліча і інш.; узнагароджаны ордэнамі «Красной Звезды» (1936), «Знак Почета» (1937); арыштаваны 29.7.1937; асуджаны да ВМП і ў верас. 1938 расстраляны).

Сын чэкіста Фелікс Карэлін (н. 24.7.1925) падчас 2-й сусветнай вайны — у СМЕРШЫ, пасля — супрацоўнік МДБ, засланы ў групу «богашукальнай» моладзі, але настолькі зацікавіўся рэлігійнымі пытаннямі, што пакаяўся і раскрыў сябе як агента; арыштаваны з групай і асуджаны да ППК; у лагеры, каб даказаць, што ён не «стукач», забіў правакатара; атрымаў новы тэрмін; пасля вызвалення рэабілітаваны не быў; «прадказаў» хуткі канец свету; на правакацыю паддаліся тры маскоўскія святары і дваццаць прыхаджан, яны распрадалі ўласную маёмасць і выехалі ў Новы Афон; памёр 30.11.1992.

КРЫЛОВ (начальнік асобага аддзела УДБ НКВД БССР (1938)).

З ліста Х. Дымана[1] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Я подвергся неслыханным и невыносимым физическим пыткам со стороны начальника особого отдела Крылова и его помощников следователей. Описать эти пытки очень тяжело... В течение полутора месяца при почти ежедневных пытках, продолжающихся иногда круглыми сутками, длился этот мучительный процесс...»[2]

УШАКОВ (сапр.: УШАМИРСКИЙ) **Зиновий Маркович** (н. ў 1895, капітан дзяржбяспекі, нам. начальніка асобага аддзела УДБ НКВД БССР (ліст. 1936); разам з С. Шліфенсонам і інш. следчымі суткамі катаваў на допытах і давёў да вар'яцтва Цішку Гартнага; арыштаваны ў 1939 (?); на допытах прызнаў, што збіваў падследных яшчэ ў Ляфортаўскай турме,

[1] Дыман Ханон Зелікавіч [1899, Беласток, Польшча — ?]. З яўрэйскай рабочай сям'і. Атрымаў пачатковую адукацыю. З 1920 працаваў на Віцебскай фабрыцы «Профінтэрн». Уступіў у ВКП(б) (1923). З 1929 на гаспадарчай працы ў сістэме Віцебскага міжраённага аддзялення культпрамкаапeрацыі. З 1931 дырэктар Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ». З 1933 старшыня прафсаюзнага камітэта Віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», потым нам. старшыні Віцебскага прафсаюзнага камітэта. З 1935 дырэктар дома адпачынку «11-га ліпеня» ў в. Ждановічы Мінскага р-на. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 8.6 (ці 7.7).1938 у Мінску па адрасе: вул. Маскоўская, д. 26, кв. 3. Выключаны з партыі ў 1938 у сувязі з арыштам. Асуджаны 1.11.1938 асобай нарадай НКВД як «агент польскай разведкі» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ва Унжэнскі канцлагер НКВД Горкаўскай чыгункі (ст. Сухабязводная). Вызвалены 14.10.1944. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.7.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Д. № 7325-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1807, л. 159–166.

але, калі пачалі катаваць яго, сцвярджаў, што «не бил так по-зверски» і ўвогуле не меў «представления об испытываемых избиваемым муках и чувствах»; асуджаны да ВМП 21.1.1940 як «германскі шпіён, завербаваны ў 1932 годзе» і «член антысавецкай арганізацыі з 1933»; расстраляны).

ДЕЙКОВ (афіцэр дзяржбяспекі, начальнік 4-га СПА (май 1935)).

ГОЗИН (афіцэр дзяржбяспекі, нам. начальніка 4-га СПА (май 1935); на допытах катаваў падследных).

КЛЕЙНБЕРГ (капітан дзяржбяспекі; начальнік 4-га СПА (кастр. — ліст. 1936); дапытваў Яна Скрыгана, Васіля Сташэўскага, Уладзіміра Хадыку і інш.; арыштаваны, верагодна, у 1938).

ВРАЧЕВ Георгий Яковлевич (н. ў 1900; капітан дзяржбяспекі, начальнік 4-га СПА (снеж. 1936 — жн. 1937); дапытваў шэраг бел. пісьменнікаў; арыштаваны ў 1939 (?)).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*Клейнберг... аказаўся ворагам народу — прайдзісветам, пасля яго* [начальнікам 4-га СПА стаў] *Урачоў, пра якога старыя работнікі кажуць, што ён прапіў 4-ты аддзел, зачыняўся ў кабінеце штодзень з пахмелля і нікога не прымаў. Пасля яго* [4-м СПА кіраваў] *Волчак, які быў арыштаваны за сувязь з трацкістамі...*»[1]

ВОЛЧОК (старшы лейтэнант дзяржбяспекі, нам. начальніка, начальнік 4-га СПА (студз. 1937 — студз. 1938); падпісаў пастанову аб арышце Васіля Хомчанкі, Платона Галавача і, верагодна, Янкі Нёманскага, Браніслава Тарашкевіча, Аляксея Траецкага, Зэліка Аксельрода, Ізі Харыка, Якава Бранштэйна, Аркадзя Смоліча, Васіля Шчарбакова, Пятра Ільючонка, Фларыяна Ждановіча, Дзмітрыя Курдзіна, Сямёна Клінцэвіча, Арона Юдэльсона, Сямёна Якубчыка, Іосіфа Воўк-Левановіча і інш.; дапытваў Міхайлу Піятуховіча, Міхася Чарота і інш., падпісваў абвінаваўчыя заключэнні; асуджаны ў 1939 (?)).

ЕРМОЛАЕВ Василий Андреевич (н. ў 1900 у в. Печарнікі Разанскай губ. ў сям'і рускага селяніна; член ВКП(б) з 1919; у АДПУ з 1924; у 1935 накіраваны ў БССР; праз некалькі месяцаў прызначаны начальнікам Асобага аддзялення кавалерыйскай дывізіі; з кастр. 1936 — начальнік Лепельскага раённага аддзела НКВД; старшы

[1] *Лукашук А.* «За кіпучай чэкісцкай работай»: З жыцця катаў. Мн., 1997.

лейтэнант дзяржбяспекі; у пачатку 1938 пераведзены ў Мінск, прызначаны начальнікам 4-га СПА УДБ (у студз. або лют. 1938 змяніў Ваўчка); арыштаваны ў студз. 1939; асуджаны 29–30.5.1939 ваенным трыбуналам войскаў НКВД СССР Беларускай акругі ў Мінску да ВМП[1] ; на судзе вінаватым сябе не прызнаў і адмовіўся ад паказанняў, якія даў падчас следства; 5.9.1939 расстрэл заменены на 10 гадоў ППК).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«На пачатак лютага 1938 году за [сакрэтна-палітычным] *аддзелам, дзе працавалі 54 чалавекі, налічвалася больш за 450 арыштаваных, многія зь якіх чакалі свайго лёсу год і болей. Каля 600 сьледчых справаў з пэрыфэрыі ляжалі доўгія месяцы без адказу... Я знайшоў у аддзеле поўны развал дысцыпліны, наяўнасьць групаўшчыны на глебе маральна-бытавога разбэшчаньня... Сувязь зь невядомымі жанчынамі, няведаньне іх групай, выкарыстаньне для нізкіх мэтаў кансьпіратыўных кватэраў. У гэтую групу ўваходзілі Слукін, Кунцэвіч, Быхоўскі, Шэйнкман, Якімаў, Теравозчыкаў ды інш.»*

З ліста М. Сцерніна[2] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку (дат. 29.7.1939):

«Впервые с фальсификацией «очных ставок» я ознакомился 13 июля 1938 в кабинете начальника 4-го отделения Ермолаева»[1] .

---

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1702, л. 2–4.

[2] Сцернін (Багдановіч) Мікалай Клеафасавіч. Н. ў 1900 у сям'і чыгуначніка. Скончыў Магілёўскую гімназію. З 1913 працаваў карэктарам мясцовай земскай друкарні. З верас. 1917 увахо дзіў у склад Магілёўскай арганізацыі РСДРП (левыя інтэрнацыяналісты). У розныя гады рэдагаваў ці быў супрацоўнікам газ.: «Соха и молот», «Известия Оршанского Совета», «Оренбургский рабочий», «Тамбовская правда», «Красное Знамя» (Цюмень), «Красный шахтёр» (Шахты), «Донская правда» (Таганрог), «Кооперативная жизнь» (Масква) і інш. Узначальваў Саюз журналістаў у Магілёве. У 1932 скончыў вышэйшыя рэдактарскія курсы ў Маскве. Потым працаваў нам. загадчыка сектара друку ВЦСПС. Нечакана С. перавялі ў Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. на пасаду начальніка палітаддзела саўгаса «Пачаевічы». Пазней быў рэдактарам газ. «Звязда». Звольнены ў жн. 1936 «за потерю революционной бдительности и допущение засоренности аппарата редакции... чуждыми людьми». Працаваў пасля гэтага ў Інстытуце мовы і літаратуры АН БССР рэдактарам руска-бел. слоўніка і сакратаром рэдакцыйнага аддзела акадэміі. Арыштаваны 11.6.1938. Пад следствам знаходзіўся ва ўнутранай турме НКВД у Мінску. Вытрымаў больш за сорак допытаў, якія суправаджаліся страшнымі катаваннямі. Вызвалены 11.7.1939. Пры вызваленні прымушаны напісаць наступную пад-

«Ермолаев говорил мне: «На тебя будет 100 показаний и 30 очных ставок...»[2]

«Ермолаев неоднократно приходил ко мне на «допросы», видел меня избитого, с кровавыми нарывами на лице и шее, с кровоподтеками, разбитыми, распухшими ногами. Когда я заявил, что меня бьют, Ермолаев... ответил: «Мерзавец! Ты клевещешь на НКВД». После его ухода меня... избивали еще сильнее...»[3]

«7-го июля [1938] *начались «допросы» под руководством начальника 4-го отдела Ермолаева, который в первый же день неоднократно заходил, угрожал расстрелом и обещал лично за меня взяться»*[4] .

З прысуду № 80 па крымінальнай справе № 106 (ад 29–30.5.1939):

«...в результате указаний [Ермолаева], *подчиненный ему следственный аппарат начал применять методы физического воздействия к арестованным, последствием чего на допросах были убиты арестованные Лемеш, Шевелев и Тихонец*[5]*; вместо того, чтобы виновников убийства привлечь к уголовной ответственности, он, Ермолаев, вызывает врача Каца, которого заставляет составить акт о том, что арестованные умерли естественной смертью.*

В 1938 году 4-м отделом было проведено следствие по делу Корженевича[6] *и Ароцкера*[7] *— по обвинению их в участии в право-троцкистской организации и во вредительстве; не имея достаточных материалов по делу Корженевича, Ермолаев утвердил обвинительное заключение, а дело Ароцкера было возвращено Минским об-*

піску: *«Я, Стернин Н. К., обязуюсь никому и нигде не говорить о том, что мне стало известно за время с 11 июня 1938 г. по 11 июля 1939 г. о работе органов НКВД. Мне известно, что за нарушение этого я буду отвечать по всем строгостям революционных законов, как за разглашение государственных тайн».*

Кр.: *Селяменеў В., Бараноўскі Я.* Пачыналі па-рознаму — завяршалі аднолькава (Драматычныя лёсы рэдактараў газеты) // *Звязда*. 1997. 10 крас.; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 3. Мн., 2004. С. 525–526.

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 31.

[2] Тамсама, л. 15.

[3] Тамсама, л. 24.

[4] Тамсама, л. 12.

[5] Біяграфічныя звесткі не выяўлены.

[6] Біяграфічныя звесткі не выяўлены.

[7] Ароцкер Вульф Герцавіч [1892, мяст. Смаргонь Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — 29.11.1938, Мінск, турма НКВД],

лсудом на доследование, без допроса обвиняемого, приобщил к делу один протокол, в котором Остроух изобличал Aроцкера в шпионской деятельности, составили обвинительное заключение, которое утвердил без достаточных к тому оснований обвиняемый Кунцевич. Оба эти дела Ермолаевым были доложены на тройке, и Корженевич и Aроцкер были приговорены к высшей мере наказания и приговоры приведены в исполнение.

Кроме того, Ермолаевым в бытность его начальником 4-го отдела УГБ НКВД БССР производились массовые необоснованные аресты, среди которых были научные работники... Ивашкевич, Камлюк[1], Лебенский, Шиманский и др.»[2]

СЕРГЕЕВ Алексей Андреевич (н. ў 1905 у в. Радыёнаўка Серпухаўскага пав. Маскоўскай губ. у сям'і рускага рабочага. У ЧК з 1932. Са жн. 1936 — старшы оперупаўнаважаны НКВД БССР, начальнік аддзялення 4-га СПА УДБ НКВД БССР. Катаваў на допытах падследных, за што з сяржантаў узведзены ў капітаны (1939), а яшчэ праз некалькі гадоў — у палкоўнікі. З 1954 на пенсіі. Старшыня Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. З палявання на людзей пераключыўся на паляванне на жывёлаў.



З ліста С. Гваздзецкага[3] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*Я являюсь жертвой произвола, творимого следователем Перским и его бригадой, а позже и его последователями Сергеевым и др. От истощения я слепну, с трудом передвигаюсь*...»[1]

службовец. З яўрэйскай рабочай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. У 1930-я г. дырэктар Уздзенскага леспрамгаса. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 1.7.1937. Асуджаны тройкай НКВД 1.11.1938 за «шпіянаж» і «шкодніцтва» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 14.1.1958 трыбуналам БВА. Асабовая справа А. № 11361-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[1] Верагодна, маецца на ўвазе Камлюк Васіль Радзівонавіч. Падрабязней гл.: *Рэпрэсаваныя...*

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1702, л. 2–4.

[3] Гваздзецкі Сцяпан Паўлавіч. З украінскай сялянскай сям'і. Падчас 1-й сусветнай вайны салдат царскай арміі. У 1917 кулямётчык 2-га стралковага палка ў Петраградзе. У чэрв. 1917 уступіў у ВКП(б). Удзельнік Кастрычніцкага перавароту 1917. Адзін з арганізатараў са-

АЗАРОВ (старшы лейтэнант дзяржбяспекі, нам. начальніка 4-га СПА (ліст. 1936 — ліп. 1937); дапытваў Міхася Багуна, Уладзіміра Хадыку і інш.).

СУСМАН (нам. начальніка 4-га аддзела УДБ НКВД БССР, старшы лейтэнант дзяржбяспекі).

КУНЦЕВИЧ Иван Игнатович (н. ў 1904 у в. Востраў Мінскай губ. ў бел. сялянскай сям'і; член ВКП(б) з 1929; у АДПУ з 1932; сяржант дзяржбяспекі; начальнік аддзялення па справах царкоўнікаў і сектантаў 4 СПА (май 1935–1937); нам. начальніка 4-га СПА В. *Ермалаева* (1938); дапытваў Платона Галавача, Міхася Зарэцкага, Алеся Звонака, Васіля Каваля, Тодара Кляшторнага, Валерыя Маракова, Барыса Мікуліча, Міхайлу Піятуховіча, Аляксандра Чарнушэвіча і інш.; катаваў на допытах падследных, прымушаў іх збіваць адзін аднаго; арыштаваны і асуджаны 29–30.5.1939 ваенным трыбуналам войскаў НКВД СССР Беларускай акругі ў Мінску да ВМП[2] (верагодна, заменена на 10 гадоў ППК).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*У аддзеле кадраў ёсць заява, што Кунцэвіч... у 1930 годзе заганяў адміністрацыйна сялян у калгасы, абагульняў інвентар аж да курэй. У гэтай заяве гаворыцца, што Кунцэвіч меў сувязь з жонкай арыштаванага і што ёй расказваў пра мужа...*

Кунцэвіч — разбэшчаны ў бытавым плане чалавек, меў шырокія сувязі на глебе палавой распусты з невядомымі жанчынамі. Са слоў Быхоўскага мне вядома, што Кунцэвіч знаходзіўся ў сужыцці з 15 жанчынамі толькі супрацоўніцамі наркамата. Для гэтай мэты выкарыстоўваў кватэру Слукіна, дзе прымалася агентура...»

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Кунцевич говорил: «Вы умный человек, были редактором «Звязды». Поймите, в стенах НКВД сталь плавится... Никто из арестованных на свободу не выйдет. Вы находитесь в «ежовых рукавицах». У нас были люди покрепче вас, подпольщики, а писали все, что нам надо. Напишите — останетесь живы. Нет — сгноим в подвале, поломаем кости, покалечим. Все равно — хоть перед

вецкай улады на Палтаўшчыне, пазней старшыня ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў у Прылупах, Ромені (Украіна). З 1926 сакратар парткома завода «Серп-Молот» у Харкаве, загадчык арганізацыйнага аддзела Харкаўскага абл. камітэта ВКП(б). З 1936 у Беларусі. Арыштаваны ў жн. 1937. У крас. 1939 яшчэ знаходзіўся ў мінскай унутранай турме НКВД. Далейшы лёс невядомы.

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1805, л. 95–96.

[2] Тамсама, с. 1702, л. 2–4.

смертью — напишете все, что нам надо... <...> не выдержите...»[1].

З ліста С. Кудмана[2]:

«20 сентября 1937 года я был арестован без предъявления обвинения... В течение двух месяцев меня мучили, применяя абсолютно нечеловеческие методы следствия... Я не выдержал мучений и вынужден был под диктовку следователя дать о себе ложные показания. На допросах я просил, умолял и доказывал следователю, что я невиновный... Я заявлял об этом начальнику отделения Кунцевичу и пом. начальника следственного отдела Быховскому, но никто меня не слышал...»[3]

З прысуду № 80 па крымінальнай справе № 106 (ад 29–30.5.1939):

«Кунцевич и Кулешов[4] *настолько избили арестованного* (Якава Шэлега[5]. — **Л. М.**), *что последний... на месте умер»*[6].

БЫХОВСКИЙ Виктор Эммануилович (лейтэнант дзяржбяспекі, начальнік аддзялення па справах нацыянал-фашыстаў 4-га СПА (1936–1937); катаваў на допытах падследных; дакладна вядома пра выпадкі з Антонам Баліцкім, Ананіем Дзякавым, Браніславам Тарашкевічам,

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 12–13.

[2] Кудман Самуіл [1898, Барысаў Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — ?]. З сям'і каваля Давыда Кудмана (памёр у 1910). Атрымаў пачатковую адукацыю. Працаваў рабочым на заводах Днепрапятроўска (Украіна), на Барысаўскай электрастанцыі, у Саюзе металістаў у Мінску. У 1924 уступіў у ВКП(б). З 1925 на кіруючых пасадах у розных раёнах БССР. З 1932 сакратар Смалявіцкага раённага камітэта ВКП(б). Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 20.9.1937. Асуджаны 10.10.1938 асобай нарадай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў Какорынскі лагерны пункт Усольскага канцлагера НКВД Пермскай вобл. (Салікамск). У сак. 1939 яшчэ знаходзіўся ў канцлагеры. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.9.1966 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа К. № 19560-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[3] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1702, л. 2–4.

[4] Куляшоў Кузьма Дзям'янавіч. Малодшы лейтэнант дзяржбяспекі, начальнік Рудзенскага раённага аддзялення УНКВД. Н. ў 1901 у в. Лабанаўка, цяпер Чэрыкаўскі р-н Магілёўскай вобл., у бел. сялянскай сям'і. Уступіў у ВКП(б) у 1926. У АДПУ з 1930. У 1939 асуджаны да ВМП.

[5] Шэлег Якаў Уладзіміравіч [1897, в. Русаковічы, цяпер Рудзенскі р-н Мінскай вобл. — 31.3.1938, Мінск, турма НКВД], селянін-аднаасобнік. З бел. сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны ў сак. 1938. Абвінавачваўся як «член антысавецкай арганізацыі». Рэабілітаваны пракуратурай БССР 19.8.1961. Асабовая справа Ш. № 19027-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[6] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1808, л. 36–42.

Рыгорам Хацкевічам і інш.; калі тыя трацілі прытомнасць, утыкаў ім у шыю іголкі; дапытваў Анатоля Вольнага, Сяргея Гесэна, Алеся Дудара, Міхася Зарэцкага, Яна Скрыгана, Уладзіміра Хадыку, Міхася Чарота і інш.; ад даследчыкаў гісторыі беларускай літаратуры атрымаў мянушку «садыст»; арыштаваны 10.12.1938, асуджаны 20.4.1939 да 10 гадоў ППК).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*Быхоўскі — садыст, маральна разбэшчаны, фанабэрысты, ганарлівы, падхалім, кар'ерыст, распусны нізкі чалавек, які інтымна жыў з многімі невядомымі жанчынамі, у тым ліку з машыністкай 4-га аддзела...*»

З заявы Я. Скрыгана Генеральнаму пракурору СССР (дат. 8.4.1954):

«*Следователь Быховский (1937) с первого же допроса начал требовать... лжи, клеветы, извращения фактов... и откровенно заявил, что правды он и не требует. Со злобой он выкрикнул: «Ишь, сволочь, Иисус Христос нашелся, правда ему нужна! Нам нужна правда, которой от тебя требуют!.. Если ты советский человек, то должен подписать всё, что требует от тебя следствие. Это нужно в интересах государства...» После такой усердной работы Быховского вся — как моя, так и чужая — жизнь превращалась в сплошной жуткий комок грязи и преступлений*».

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Следователь Быховский «разъяснил» мне, что я был врагом партии с 1917 г., был всю жизнь двурушником-троцкистом, что меня завербовал Сурта[1] *еще в 1917 г., что я был руководителем нацфашистской организации в Академии наук БССР. Сказал, что мне надо дать показания на Гикало, Сурту... Якуба Коласа...*

Учитель Каменский[1] *рассказывал, что его путем избиений вынуждали дать показания против поэта Якуба Коласа»*[2].

З агляднай даведкі (з архіўна-следчай справы № 8825) па абві-

[1] Сурта Іван Захаравіч [10(22).11.1893, в. Бяседавічы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хоцімскі р-н Магілёўскай вобл. — 20.12.1937, Мінск, НКВД], дзяржаўны дзеяч, навуковец. З сялянскай сям'і. У 1918 уступіў у ВКП(б). Скончыў медыцынскі ф-т 2-га Маскоўскага ун-та (1918), Інстытут чырвонай прафесуры (1932). У 1933 нам. наркама асветы Беларусі, з 1933 наркам аховы здароўя Беларусі. У 1936–37 прэзідэнт АН Беларусі. Аўтар навуковых работ па пытаннях метадалогіі і гісторыі прыродазнаўства. Кандыдат у члены ЦК ВКП(б). Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 27.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Камунальная, 3-ці Дом Саветаў, кв. 35. Выключаны з ВКП(б) у сувязі з арыштам. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 19.12.1937 як «член антысавецкай арганізацыі правых» і за «шкодніцтва ў галіне аховы здароўя» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны.

навучанні В. Быхоўскага (арт. 180 «а» КК БССР):

«Стенографистка Жуковская показала, что... многие следователи, являясь инструкторами по бою, ходили по кабинетам и избивали несознавшихся арестованных... Когда арестованные теряли сознание после избиения, [Быховский] *колол их иголкой в шею... А. Балицкому дал прессом в лицо... арестованного* [литератора] *З. ставил ногами вверх к окну и избивал...»*

З ліста А. Балціна[3] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«27 месяцев я сижу в тюрьме совершенно без всякой вины... Меня не допрашивают, не предъявляют «улик» или конкретных обвинений, а просто бьют, истязают, плюют в лицо и нагло требуют писать то, что от меня требуется. Версия напрашивается сама собой исходя из моего офиц. положения: я был наркомом, следовательно, вербовал меня Голодед, информировал о задачах и методах их работы к-р орг. Моя практическая роль — вредительство в местной промышленности. В декабре 1937 г. следователь-бандит Быховский предъявил новые требования. Вспомнили, что я — латыш, а по словам следов. Быховского, «все латыши — шпионы», а значит, версия опять ясна: активная роль в латышск. антисов. орг., шпионаж, связь с Кнориным в Москве и латышским консулом в Витебске. То, что я с Кнориным никогда в жизни не встречался и его не знаю лично, то, что я никогда не был у Витебского или какого-либо другого латв. консула — это не играет

Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 28.4.1956. Асабовая справа С. № 6631-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

«По рассказу находившегося в одной камере с Суртой бывшего директора Речицкого дубильно-экстрактного завода Лаптева, Сурта в камере плакал, говорил, что он написал свыше 100 страниц ложных показаний. У Сурты по [свидетельству] *Лаптева был разбит задний проход...»*

Кр.: НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 43; *БЭ*. Т. 15; *ЭГБ*. Т. 6/1.

[1] Біяграфічныя звесткі не выяўлены.

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 14–15.

[3] Балцін Аўгуст Янавіч [сапр. Блюм Тэадор Янавіч, 5(17).1.1894, Газенпот Курляндскай губ., цяпер Айзпутэ, Латвія — 23.6.1953], дзяржаўны дзеяч. З верас. 1934 наркам мясцовай прамысловасці БССР. Член ЦВК СССР (1935–37) і ЦВК БССР (1929–37), старшыня Таварыства старых бальшавікоў (1933–37). Узнагароджаны ордэнам Леніна. 2.8.1937 вызвалены ад пасады наркама. Арыштаваны 4.9.1937 у Мінску па адрасе: вул. К. Маркса, д. 2, кв. 21. Асуджаны 9.6.1940 як «удзельнік антысавецкай трацкісцкай арганізацыі, якая існавала на тэрыторыі БССР з 1933 г.» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены ў канцы 1940-х г.

роли. Герману, Волчку и Быховскому нужно, чтобы так было, и они имеют в своём распоряжении средства добиться того, что им нужно.

Когда применение жестоких пыток не заставило меня писать всю эту смердящую ложь, ночью во время моего избиения приводили мою жену, показали мне её, говорили, что она всё слышала, упала в обморок и её унесли на носилках. И мне предлагали прямую сделку: «Пиши, если хочешь спасти жену. Будешь писать — её сейчас же выпустим, если не будешь, то я буду драть эту бл... так же, как и тебя». Это было прямое вымогательство, но у меня не оставалось никакого выхода. Я стал писать требовавшуюся от меня ложь. У моей жены обманом брали записки на моё имя, что она освобождена, живет на той же квартире и т. д., а в действительности она продолжала сидеть в тюрьме»[1].

З ліста Э. Трыфсік сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Все обвинения против моего мужа[2] *необоснованны и были подписаны им после жесточайшего физического воздействия, без сомнения, в невменяемом состоянии...*

Как теперь выяснилось, быв. следователь Быховский, произведя допросы, сопровождаемые не поддающимися описанию физическими воздействиями, добился немало самооговоров... К числу таких жертв попал и мой муж»[3].

З заявы В. Быхоўскага на імя наркама УС БССР А. Наседкіна ад 27.11.1938 г. (заява напісана за некалькі тыдняў да арышту таго, каму яна была адрасавана, і арышту самога заяўніка):

«Я хочу Вам рассказать о тех безобразиях, антипартийных, по существу фашистских методах следствия, которые здесь, в Белоруссии, процветали на протяжении последних лет 1937–1938 гг. в бытность здесь наркомом Бермана и до вашего приезда сюда...

Берман и нач. следственного отдела Волчек стали на официальных совещаниях работников существовавшего здесь следственного отдела давать установки совершенно открыто, что если враг не сдается, надо на него воздействовать физически и сломить его...

И я в числе других стал это делать. Я стал применять при допросах к арестованным самые разнообразные методы издевательств...

Я бил и применял всякого рода издевательства... бил их руками... ложил их на пол, сгибал вдвое и ставил сверху стул, са-

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1808, л. 12–19.

[2] Трыфсік Барыс Ісакавіч. Н. ў 1900. У 1919 уступіў у ВКП(б). У першай палове 1930-х г. сакратар Талачынскага райкама ВКП(б).

[3] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1807, л. 29–30.

дился на него и сидел до тех пор, пока эти лица не начинали давать показания…

Я видел, что в окружении меня поголовно все, от мала до велика, — все бьют… били и оперативные работники и не оперативные…

Особенно много натворили беззаконий и безобразий, избивали арестованных, истязали их, сотрудники НКВД БССР — Авербух, Вихорев, Волков, Завадский, Кауфман, Кунцевич, Лукашонок, Массарский, Перевозчиков, Перский, Половинскин, Серышев, Слукин, Сотиков, Цейтлин, Шейнкман, Широков истязали нагайками и поясами, заставляли арестованных избивать друг друга, раздевали арестованных догола и били их поясами до полусмерти. Это делали следователи: Барсуков, Бурмистров, Годин, Климкович, Козлюк, Короткевич, Крупенков, Кузнецов, Паремский, Сергеев, Фиш, Черняк».

Быхоўскі, расказаўшы новаму кіраўніку МУС, што тварылася да яго прыходу ў засценках унутранай турмы НКВД, спадзяваўся, што выратуе сабе жыццё. І не памыліўся. Замест шмат разоў заслужанага расстрэлу атрымаў 10 гадоў пазбаўлення волі.

ФЕДОРОВ*[1] (начальнік аддзялення (змяніў Быхоўскага, потым Гарбачэўскага (1938) па справах нацыянал-фашыстаў 4-га СПА).

ГОРБАЧЕВСКИЙ Макар Давыдович* (н. ў 1906 у в. Багданава Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. Да 1927 працаваў на сельскай гаспадарцы ў бацькоў. З 1927 — тэхнічны сакратар Лёзненскага райкама ВКП(б). З 1928 — курсант школы аднагадзічнікаў 3-га сапёрнага батальёна ва Уладзіміры. З 1929 — загадчык улікова-статыстычнага пададдзела акруговага камітэта партыі (Віцебск). Член ВКП(б) з кастр. 1929. У 1930–35 — супрацоўнік АДПУ НКВД БССР (Мінск). У 1935–36 — слухач Цэнтральнай школы НКВД (Масква). З 1937— начальнік Старобінскага, потым — Шклоўскага раённага аддзела НКВД. З 1938 — начальнік аддзялення (змяніў на нядоўгі час Фёдарава) па справах нацыянал-фашыстаў 4-га СПА), потым — кіраўнік УНКВД па Пінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны — у войсках НКВД. Арганізоўваў дыверсійныя партызанскія групы для работы ў нямецкім тыле. З восені 1944 — нам. наркама ўнутраных спраў БССР па кадрах. У 1945–47 удзельнічаў у разгроме антысавецкага падполля ў Гродзенскай вобл. У першай палове 1950-х г. —

[1] Інфармацыя пра персаналіі, адзначаныя зорачкай, часткова або цалкам узята з кнігі: *Лукашук А.* «За кіпучай чэкісцкай работай» : З жыцьця катаў. Мн., 1997.

начальнік улікова-архіўнага ўпраўлення КДБ Брэсцкай вобл. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1 ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, мноствам медалёў. 27.12.1955 звольнены з-за службовай неадпаведнасці. 30.3.1961 Брэсцкім абл. камітэтам КПСС выключаны з партыі).

ШЕЙНКМАН* (начальнік аддзялення па справах трацкістаў і правых 4-га СПА (1936–1937); катаваў на допытах Платона Галавача і інш.).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*У* [4-га СПА] *было 8 аддзяленьняў. Аддзяленьне ў справах трацкістаў і правых узначальваў Шэйнкман, разбэшчаны чалавек, стары халасьцяк, заляцаўся да кожнай спадніцы...*»

АШИШКЕВИЧ* (начальнік аддзялення (змяніў Шэйнкмана) па справах трацкістаў і правых 4-га СПА (1937)).

АРТОМОНОВ* (начальнік аддзялення па справах эсэраў і меншавікоў 4-га СПА).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*Артамонаў — п'яніца, гультай, прагульшчык...*»

АРХАНГЕЛЬСКИЙ* (начальнік аддзялення (змяніў Ашышкевіча) па справах трацкістаў і правых 4-га СПА, начальнік аддзялення (змяніў Артамонава) па справах эсэраў і меншавікоў 4-га СПА).

ПОЛИТЫКА (начальнік аддзялення (змяніў Архангельскага) па справах эсэраў і меншавікоў 4-га СПА, дапытваў Міхася Зарэцкага, Васіля Сташэўскага і інш.).

ТАРАКАНОВ Сергей Иванович (начальнік Слуцкага раённага аддзела НКВД, з ліст. 1938 у Мінску, начальнік аддзялення (змяніў Архангельскага) па справах трацкістаў і правых 4-га СПА, начальнік аддзялення (змяніў Палітыку) па справах эсэраў і меншавікоў 4-га СПА; арыштаваны 20.5.1939; асуджаны да 10 гадоў ППК).

З прызнанняў следчага Слуцкага НКВД А. Машэнца*:

«*На аператыўных нарадах Тараканаў прызначаў на кожнага супрацоўніка цвёрдыя нормы выкрыцця трох-чатырох арыштаваных у суткі. Пасадка на вугал крэсла, допыт стоячы і фізічнае збіванне ўжываліся масава ўсімі намі, следчымі, іначай і быць не магло, бо прызначаную норму — тры-чатыры выкрыцці ў суткі — немагчыма выканаць пры звычайным допыце. Следчыя, дапыт-*

ваючы такімі метадамі, давалі ададнаго да трох выкрыццяў, і былі асобныя выпадкі, калі дабіваліся па тры-чатыры выкрыцці ў суткі, напрыклад, Шэвелеў, Лучко, Сталяроў, я і Каралёў...»

З ліста С. Тараканава сакратару ЦК ВКП(б) Г. Малянкову:

«...осуждают меня к лишению свободы на 10 лет – за что? Только за то, что я всем следователям передавал установки быв. наркомов – Бермана и Наседкина, чтобы каждый следователь в сутки разоблачал от 1 до 2 арестованных, а также за то, что я лично к арестованному... Хаткевичу применил меры физического воздействия, нанес два удара кулаком по голове...»[1]

ГОРБАТЫЙ* (начальнік аддзялення па справах савецкага апарату і рабочага класа 4-га СПА).

ЛЕГАЕВ* (начальнік аддзялення (змяніў Гарбатага) па справах савецкага апарату і рабочага класа 4-га СПА).

СЛУКИН (лейтэнант дзяржбяспекі; начальнік аддзялення па справах моладзі 4-га СПА (крас. 1937); катаваў на допытах Васіля Хомчанку і інш.).

З ліста В. Ермалаева сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«*Слукін — распуснік, разбэшчаны ў полавых адносінах, маральна нізкі. Выкарыстоўваў у нізкіх мэтах канспіратыўную кватэру — вадзіў туды жанчын...*»

ГУБСКАЯ М. А.* (афіцэр дзяржбяспекі, начальнік 4-га аддзялення 4-га СПА (1937), потым сакратар у апараце НКВД (?); падпісала пастанову аб арышце Васіля Хомчанкі і інш.).

КАГАН (начальнік 3-га аддзялення 4-га СПА (ліп. 1935), паводле некаторых звестак сваяк паэткі Эдзі Агняцвет; катаваў на допытах падследных[2]).

«...Власов Григорий... при допросах на следствии жестоко избивался следователями Каганом, Малахановым, Киселевым, Евтушенко, которые требовали от него показаний...»[1]

ШЛИФЕНСОН Самуил Иосифович (н. ў 1903 у Вяліжы Віцебскай губ., цяпер Смаленская вобл., у сям'і яўрэйскага служачага. Атрымаў сярэднюю адукацыю. У ЧК і ВКП(б) з 1921[2]. З ліст. 1925 — нам. упаўнаважанага па інфармацыі, упаўнаважаны 16-га Койданаўскага памеж-

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1706, л. 11.

[2] Тамсама, л. 5.

нага атрада АДПУ БССР. З мая 1933 — начальнік аддзялення Віцебскага аператыўнага сектара ДПУ-НКВД БССР. Са снеж. 1936 — начальнік 3-га аддзялення 4-га СПА (ліст. — снеж. 1936). 19.12.1937 узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. З 11.4.1938 — начальнік УНКВД Гомельскай вобл. Падпісаў пастановы на арышты Сымона Баранавых, Анатоля Вольнага, Міхася Зарэцкага, Валерыя Маракова, Барыса Мікуліча і вобыскі ў іх кватэрах; арыштоўваў і дапытваў Змітрака Астапенку і інш., разам з Ушаковым і інш. следчымі суткамі катаваў і давёў да вар'яцтва Цішку Гартнага; у камеры, разлічаныя па кубатуры на 3 (тры) чалавекі, заганяў 40 (сорак) чалавек; аддаваў загады збіваць падследных, якія не прызнавалі сябе вінаватымі. Арыштаваны 2.12.1938. Падчас следства вінаватым сябе прызнаў. Асуджаны ваенным трыбуналам войскаў НКВД Беларускай акругі ў перыяд 15–18.5.1939 да ВМП. Расстраляны ў 1939).



З успамінаў Івана Аляксеевіча Карцеля:

«Днём тут (ва ўнутранай турме НКВД. — **Л. М.**) *цішыня, самая «малацьба» пачынаецца глыбокай ноччу...*

Мяне ўжо чакалі двое следчых: Цэйтлін і Шліфенсон. Пасадзілі на высокае крэсла, ногі не даставалі да падлогі, каб чалавек быў у пастаянным напружанні, трымаўся на нервах — як бы не хіснуцца і не зваліцца.

Не паспеў я спытаць, на якой падставе арыштаваны, як у адно вуха закрычаў Шліфенсон: «Дзе і калі вы завербаваны ў контррэвалюцыйную нацыяналістычную арганізацыю?», а ў другое вуха — тое ж самае Цэйтлін. Не паспее выкрыкнуць сваё пытанне Шліфенсон, як тым жа пытаннем аглушае Цэйтлін. Я адчуваў сябе як на кавадле, па якім лупяць два малаткі. Дзяўбуць дзень, потым ноч, потым зноў дзень. Зморыцца ад дзяўбання Цэйтлін — ідзе на адпачынак, дзяўбанне пачынае Шліфенсон. А калі і ён стоміцца, яго замяняе хто-небудзь іншы са следчых...

Канвеерныя допыты на працягу некалькіх сутак — гэта былі яшчэ толькі кветачкі. Упартых, якіх нічым нельга было прымусіць

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1706, л. 5–6.

[2] Тамсама, с. 1702, л. 5–7.

падпісаць пратакол, ставілі ў так званую стаячую труну, дзе чалавек траціў прытомнасць ужо праз некалькі гадзін. Яшчэ заганялі ў карцэр з халоднай вадой на цэментнай падлозе…

З другой паловы 1937 г. …з допытаў не прыводзілі, а прыносілі, дакладней, прыцягвалі. Збітага, бесприытомнага чалавека проста перакідвалі за парог камеры, як мех з зернем. Чалавек дзён дзесяць прыходзіў у прытомнасць, нічога не еў, прасіў толькі піць…

Амаль год я быў пад следствам і прайшоў праз рукі і кулакі многіх следчых-фальсіфікатараў. Устаноўка ў іх была такая: катаваць да таго часу, пакуль чалавек не падпішацца пад злачынствам, якое яму прыпісвалася. Самым жорсткім для мяне быў следчы Шліфенсон, начальнік аднаго з аддзелаў НКВД рэспублікі. Ён не ведаў беларускай мовы, наўрад ці меў сярэднюю адукацыю, але спецыялізаваўся на стварэнні спраў вучоных і пісьменнікаў. За кар'еру, за ўзнагароды ён, здавалася, гатоў быў стварыць ілжывую справу нават на роднага бацьку. «А-а, на маё месца цэліш, Польшчы хацеў аддаць Беларусь, — перарываў ён часам допыт, пераходзячы на «лірыку». — А вось табе, вось!» — і тыцкаў у нос кулаком з фігай. На руках гэтага маленькага чалавека з завітушкамі на патыліцы засталася кроў многіх беларускіх інтэлігентаў…» [1]

З прысуду № 72 па крымінальнай справе № 53 (ад 15–18.5.1939):

«Шлифенсон в ноябре 1937 года, работая начальником Могилевского городского отделения управления НКВД, во внутренней тюрьме создал режимные камеры, в которых при нормальном положении могло содержаться 3 человека, в эти камеры сажали до 40 человек; арестованные этих режимных камер вынуждены были сутками стоять на ногах, и когда приводили новых арестованных, то их приходилось в камеры не впускать, а вдавливать при помощи камерной двери. В камере не хватало воздуха, в результате этого арестованные падали в обморочное состояние и их в бессознательном состоянии вытаскивали в коридор и отливали водой, а после приведения в чувство вновь помещали в камеры. Обвиняемым Шлифенсоном в этих режимных камерах была создана специальная агентура из числа явных врагов Советской власти — Лонского, Головенчика, Амбармчука и Хомицкевича, приговоренных к высшей мере уголовного наказания. Эта преступная четверка по заданию Шлифенсона и обвиняемого Давиденко проводила провокационную работу и всевозможными морально-физическими воздействиями над арестован-

[1] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 3. Мн., 2004. С. 307–310.

ными вынуждала их к даче на себя вымышленных показаний, учила арестованных, какие надо давать показания, а арестованных неграмотных учили расписываться своей фамилией.

В результате такой преступной деятельности Шлифенсона... арестованные давали на себя вымышленные показания, на основании которых приговаривались к ВМН.

В январе 1938 года Шлифенсон был переведен на должность начальника райотделения города Гомеля и впоследствии начальника областного управления Гомеля. Шлифенсон по примеру Могилева и здесь создал режимные камеры, так называемые «парилки», в эти камеры кубатурой на 3 человека — 6 метров куб. — содержалось до 22 человек. Несмотря на то, что в камерах и без того было душно от большого скопления арестованных, их заставляли подтапливать печку, отверстия в окнах и двери забивались одеждой арестованных, были также случаи обмороков, точно так же была создана камерная агентура, которая занималась провокационной деятельностью, вынуждала арестованных давать на себя вымышленные показания, на арестованных несознающихся — одевали шубы, били, и арестованные, давшие на себя показания, приговаривались к ВМН»[1].

ГЛАДКОВ Петр Андреевич (н. ў 1902 у в. Трубчаўск Арлоўскай губ. (Расія) у сям'і рускага рабочага. Скончыў вясковую школу ў мяст. Свіслач Бабруйскага пав. Мінскай губ. (1915), Самарскі геолага-разведвальны інстытут (1933). УЧК з 1934. З сак. 1937 — оперупаўнаважаны 3-га аддзела УДБ НКВД БССР. З 9.12.1937 — нам. начальніка 2-га аддзялення 3-га аддзела УДБ НКВД БССР. З 1938 — начальнік аддзялення 3-га аддзела УДБ НКВД БССР. Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Леніна, Нахімава і інш. У 1946 паніжаны ў пасадзе і выключаны з партыі за прысваенне грошай, выдадзеных для аператыўных мэтаў. 26.11.1954 звольнены з органаў за «дыскрэдытацыю звання кіраўнічы работнік МУС»).



ГЕПШТЕЙН Александр Михайлович (н. ў 1908 ў Адэсе ў сям'і адваката (да 1920 г. члена партыі кадэтаў);

[1] НАРБ, ф.4п, в. 21, с. 1702, л. 5–7, 16–18.

атрымаў сярэднюю адукацыю; у 1932 уступіў у ВКП(б); у АДПУ з 1925; жыў у Мінску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 32, кв. 5; да арышту начальнік 3-га аддзела УДБ НКВД БССР, лейтэнант дзяржбяспекі (1936–38); дапытваў С. Гесена і інш.; арыштаваны 27.12.1938; асуджаны да ВМП).

З абвінаваўчага заключэння па крымінальнай справе № 48805: *«По указанию Гепштейна производились аресты по национальному признаку: арестовывали поляков, латышей, немцев... без наличия на них компрометирующих материалов. Аресты производились в массовом порядке... Достаточно было, чтобы в агентурном донесении указано, что поляк или уроженец Польши, как Гепштейн накладывал резолюцию — арестовать...*

По непосредственному указанию Гепштейна и лично Гепштейном к арестованным применялись незаконные методы следствия, в ряде случаев садистские [пытки], вследствие чего имели место показания арестованных с оговором самих себя...

Массовое избиение арестованных в 3-м отделе продолжались до мая 1938... Арестованных избивали резиновыми нагайками, сажали на ножку опрокинутой табуретки и другие острые вещи... Наряду с тем, Гепштейн сам применял садистские методы допроса... Применение методов физического действия и садизма к арестованным доходило до того, что арестованных форменным образом уродовали... 21 августа 1938 года арестованный Скибо П. М. поступил в тюремную больницу города Минска с разрывом мочевого пузыря и травматическими контузиями. Арестованный Польто П. И. 31 августа 1938 года поступил в тюремную больницу города Минска с травмами у правой паховой области. Арестованный Сикерич К. В. 25 июля 1938 года поступил в тюремную больницу города Минска с явлениями обильных кровоподтеков в области паховых складок мошонки и члена, а также обилием кровоподтеков плечевого пояса...

Также на следствии убивали — били насмерть. На следствии были убиты арестованные Шабан И. С., Овечко М. С. и другие... Трупы убитых по указанию Генштейна не вскрывались в целях скрыть действительные причины смерти...

Допросы осужденных производились путем зверских, жесточайших избиений... В кабинетах стоял сплошной рев и крики... Людей на носилках выносили в тюремную больницу... С лета 1938 избиение из кабинетов было перенесено в камеры... Арестованных ставили лицом к стене и заставляли стоять всю ночь... Открывали парашу, наклоняли к ней лицом... Если арестованный поднимал голову, то его били по голове...

Вследствие вышеизложенных физических и садистских мер

воздействия на арестованных... уже приговоренных к ВМН и оставленных Гепштейном, видно, что Гепштейн этим преследовал цель, чтобы от каждого арестованного получить показаний как можно больше, на большее количество людей, что и делалось. Из проверенных арестованных 38 человек (которые дали показания уже после приговора к ВМН) дали показания на 3489 человек; из них: Юзефович С. И. дал показания на 183 человека, Шнейдер Я. А.[1] *— также на 183, Тарашкевич Б. А.*[2] *— на 249 человек, Спорин — на 241 человека, Жилинский — на 244 человека и т. д.*

Гепштейн даже тех людей не освобождал, которые явно ошибочно были арестованы, т. е. [когда] *вместо одного арестовывали другого – однофамильца»*[1].

КОРОТКЕВИЧ (афіцэр дзяржбяспекі, нам. начальніка 3-га аддзялення 4-га СПА (ліст. 1936); падпісваў пастановы аб арыштах; катаваў на допытах Міхася Багуна, Платона Галавача і інш.).

---

[1] Шнэйдар Якаў Абрамавіч [1907, Цеханаў, Польшча — 27.11.1938, Мінск, НКВД], педагог. З сям'і рабочага. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Уступіў у ВКП(б). Падчас арышту нам. дырэктара сектара завочнага навучання МВПІ. Арыштаваны 29.12.1937 у Мінску па адрасе: вул. Ленінская, д. 20, кв. 1. Падчас следства падвяргаўся нечалавечым катаваннем. Асуджаны «тройкай» НКВД 12.4.1938 як «агент польскай разведкі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БВА 30.4.1989. Асабовая справа Ш. № 24515-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. 8.8.1938 у Мінску па адрасе: вул. Ленінская, д. 20, кв. 1 арыштавана настаўніца Мінскай вячэрняй школы № 12 Фромберг Бэла Рыгораўна (н. ў 1906 у Беластоку, цяпер Польшча; атрымала вышэйшую адукацыю), жонка Якава *Шнэйдара*. 11.9.1939 асобай нарадай НКВД асуджана за «сувязь з агентам польскай разведкі» да 5 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Далейшы яе лёс невядомы. Рэабілітавана 31.5.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа Ф. № 25842-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[2] Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч [псеўданімы: Адам Навука; «Тарас на Парнасе»; Я.Тарас; Тарас Язычнік; Тарас Навіна (?); Białorusin; 8(20).1.1892, засценак Мацюлішкі Віленскага пав. Віленскай губ., цяпер Вільнюскі р-н, Літва — 29.11.1938, Мінск, НКВД], грамадскі і паліт. дзеяч, мовазнавец, перакладчык, публіцыст. У 1911 скончыў 2-ю Віленскую гімназію, у 1916 — гісторыка-філалагічны ф-т Петраградскага ун-та. У бел. друку выступаў з 1913. У 1916–18 — на кафедры рускай мовы і славеснасці Петраградскага ун-та. З 1917 адзін з лідэраў Беларускай сацыялістычнай грамады, з 1918 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. У 1918 Т. выдаў «Беларускую граматыку для школ»,

СЕРЫШЕВ Василий Михайлович (н. ў 1902 у Іркуцку ў рабочай сям'і; атрымаў пачатковую адукацыю; у 1923 уступіў у ВКП(б); у ЧК-АДПУ-НКВД з 1921; жыў у Мінску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 32, кв. 12; да арышту нам. начальніка 3-га аддзела НКВД Гепштэйна (1936–1938), лейтэнант дзяржбяспекі; катаваў на допытах Сымона Баранавых, Сяргея Грахоўскага і інш.; асуджаны да 5 гадоў ППК без пазбаўлення правоў).

З абвінаваўчага заключэння па крымінальнай справе № 48805 (ад 2.10.1939):

«При допросе арестованных Серышев подвергал последних всевозможным пыткам и садистским издевательствам. К примеру: арестованного Гринштейна[2]*.*

Серышев ходил по кабинетам следователей и избивал арестованных до потери сознания: Шидловского, Рассказова, Красильникова и других. Допрошенный по делу Шидловский показал:

«В середине сентября 1937 года я находился под следствием; мое дело вел следователь Кауфман. К нему для избиения меня заходил Серышев. Серышев меня лично избивал два раза. Первый раз он меня бил под ложечку кулаками (пока я не упал и не потерял сознание). Будучи приведенным Кауфманам в чувство,

---

якая адыграла значную ролю ў нацыянальнай асвеце. У 1919 выкладчык бел. і грэчаскай моў у МПІ. У тым жа годзе Т. быў арыштаваны бальшавікамі. У 1920 старшы рэферэнт дэпартамента асветы Сярэдняй Літвы. У 1921–22 дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. Адзін з кіраўнікоў і заснавальнікаў ТБШ. У 1922 абраны дэпутатам польскага сейма, узначаліў у ім Беларускі пасольскі клуб. Актыўна выступаў з трыбуны сейма ў абарону інтарэсаў бел. народа. У 1925 старшыня Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Арыштаваны 14.12.1927. У маі 1928 на «Працэсе 56-і» асуджаны да 12 гадоў турмы. У 1928 абраны акадэмікам АН Беларусі. У 1930 вызвалены паводле распараджэння прэзідэнта Польшчы. Зноў арыштаваны 5.2.1931. У ліст. 1932 асуджаны да 8 гадоў катаржнай турмы. Падчас знаходжання ў турме пераклаў на бел. мову паэму А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». З верас. 1933 па абмене палітвязнямі жыў у СССР. «Бронюсь, куды ты ідзеш?» — словы, кінутыя драматургам Францішкам Аляхновічам Б. Тарашкевічу падчас іх абмену на савецка-польскай мяжы 5.9.1933. Працаваў у Міжнародным аграрным інстытуце ў Маскве. Арыштаваны НКВД 5.5.1937. Падчас следства падвяргаўся нечалавечым катаванням. Асуджаны 5.1.1938 «двойкай» НКВД і Пракуратуры СССР да ВМП. Рэабілітаваны 26.1.1957. Імем Т. названы вуліцы ў Маладзечне і Радашковічах, ліцэй у Бельску (Польшча).

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1703, л. 1–33.

[2] Грынштэйн Хема Барысавіч [1907, Бабруйск Мінскай губ., цяпер Магілёўская вобл. — ?], журналіст. З сям'і рабочага. Меў нясконча-

я начал кричать. Серышев стал мне, лежащему на полу, ногой на горло, а затем всунул в рот носок ботинка. После этого высыпал из плевательницы мне на лицо мусор.

Второй раз Серышев меня бил плечами об стенку и, взяв за рукава гимнастерки, давил коленом в живот. Серышеву я заявил, что зря избиваете честного коммуниста. Он ответил: Мы тебя совсем убьем и отвечать не будем...»

В декабре 1937 года Серышев вместе с Цейтлиным при допросе арестованного Гринштейна к последнему применяли садистские методы воздействия: били кулаками по лицу, били ногами в живот, сажали на ножку перевернутой табуретки. В результате такого допроса Гринштейн дал вымышленные показания...

Серышев незаконно письменными распоряжениями оставлял осужденных к ВМН для дальнейшего допроса и допрашивал их исключительно садистскими методами...»[1]

КАУФМАН Залман Исаакович (н. ў 1900 у Магілёўскай губ. у сям'і яўрэйскага рабочага. Скончыў прыватную яўрэйскую гімназію (1918). У ЧК з 1920. Памочнік упаўнаважанага Гомельскага аддзялення АДПУ БССР, упаўнаважаны Магілёўскай, потым Бабруйскай акругі, Жлобінскага, Парычскага, Рагачоўскага, Рэчыцкага р-наў. Са студз. 1935 — начальнік СПА УДБ Віцебскага гарадскога аддзялення НКВД. Са снеж. 1936 нам. начальніка 3-га аддзялення УДБ НКВД БССР. Катаваў на допытах падследных. З 9.12.1937 начальнік УНКВД Палескай вобл. Арыштаваны ў 1939).



ВАСИЛЬЕВ Александр Алексеевич* (н. ў 1897; у НКВД з 1921, лейтэнант дзяржбяспекі, начальнік 8-га аддзялення 3-га аддзела НКВД (1936–1937); дапытваў Сяргея Ракіту і інш.).

МОРОШЕК Зорух Мейерович* (лейтэнант дзяржбяспекі, начальнік

ную сярэдне-спецыяльную адукацыю. У 1930-я г. рэдактар шматтыражкі Бабруйскага лесакамбіната. Арыштаваны 2.9.1937. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці». Вызвалены да суда. Рэабілітаваны Бабруйскім НКВД 15.12.1938. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Г. № 5781 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1703, л. 24–33.

упраўлення НКВД на Беларускай чыгунцы; начальнік аддзялення 4-га аддзела УДБ НКВД БССР; дапытваў шэраг беларускіх пісьменнікаў і гаспадарчых дзеячаў (Г. У. Стрэле і інш.)).

МІРКІН* (начальнік Мінскай турмы).

ПЕРСКИЙ Михаил Абрамович (н. ў 1904; лейтэнант дзяржбяспекі (1936–1938); верагодна, начальнік аднаго з аддзяленняў 4-га СПА; катаваў на допытах Змітрака Астапенку, Сымона Баранавых, Анатоля Вольнага, Міхася Зарэцкага, Васіля Каваля, Яна Скрыгана, Юлія Таўбіна, Уладзіміра Хадыку і інш.).

З ліста С. Гваздзецкага сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку: «*Двадцать месяцев сижу в Минской тюрьме под следствием... В ноябре 1937 г. меня вызвали на так званый допрос, где пытками заставили написать под диктовку следователя Берского* (Перского. — **Л. М.**)*, что я враг народа, вредитель... Об этом насилии и издевательствах я написал наркому Берману, но очевидно, мои заявления дальше следователя не пошли. Я писал наркому Берману, что большая надстройка над воротами тюрьмы превратилась в застенок, где кровью людей политы стены, от криков их движутся окна...*»[1]

СОКОЛОВ Алексей Иванович (н. 1.10.1897 у Яраслаўскай губ. (Расія) у сям'і шаўца. Скончыў гарадское вучылішча ў Яраслаўлі. У ЧК з 1922. З 1936 — начальнік аддзялення 4-га СПА УДБ НКВД БССР. З 16.5.1937 — нам. начальніка 4-га СПА, нам. начальніка Мінскай турмы; разам з энкавэдыстамі Абрамчыкам і Гарбацэвічам спаліў некалькі дзесяткаў тысяч рукапісаў беларускіх літаратараў. З 1939 — нам. начальніка УНКВД Віцебскай вобл. Загінуў падчас 2-й сусветнай вайны.



СЛЕДЧЫЯ

АБРАМОВ* (афіцэр дзяржбяспекі, нам. начальніка Магілёўскага гарадскога аддзела НКВД[1], потым у Мінску; арыштоўваў Міхася Зарэцкага і інш.).

АВЕРБУХ (следчы, арыштоўваў і

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1805, л. 95–96.

дапытваў Валерыя Маракова і інш., катаваў на допытах падследных).

АЛЕКСЕЕВ (следчы).

З ліста У. Луканскага[2] пракурору па асобых справах БССР:

«Не предъявляя обвинения, меня направили в Минск, в тюрьму НКВД; там приблизительно через месяц вызвали на допрос.

Следователь, который допрашивал первым (на мою просьбу назвать свою фамилию ответил грубой бранью), на мой вопрос: «За что я арестован?» — стал мне доказывать, что если арестован, то значит, преступник... и если я хочу остаться в живых, если не хочу превратиться в отбивную котлету и калеку, то должен признаться...

Когда я начал доказывать свою правоту, то следователь позвонил по телефону и в кабинет явилось два лица, начавшие меня избивать до тех пор, пока я не согласился давать такие показания, какие требовал следователь...

Через некоторое время меня вызвал следователь Алексеев, который, применяя методы пыток и побоев, заставил меня подписать протокол, в котором вся моя педагогическая деятельность представлена как вредительская в духе троцкизма...»[1]

БАКУНИН (следчы, «працаваў» у адным кабінеце з *Нячаевым*).

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«В декабре 1938 г. следователь Бакунин... на мое требова-

---

[1] З ліста П. Панамарэнкі Г. Малянкову (ад 13.12.1938) «О недостатках и извращениях в работе органов НКВД Белоруссии, вскрытых в связи с проверкой кадров»:

«Подозрение о том, что в Могилевском областном управлении НКВД существовала мародерская группа... подтвердилось. Разоблачены шесть сотрудников во главе с комендантом управления. У членов группы на сберкнижке обнаружены десятки тысяч рублей, десятки пар дамских туфель, мужской обуви, шубы, 40 отрезов сукна и т. д. Думаю, что за счет только присвоения вещей расстрелянных такие суммы появиться не могли. Подозреваю... фиктивные расстрелы и освобождение врагов в результате подкупа этой группы».

[2] Луканскі Уладзімір Сяргеевіч [1898, мяст. Ляхавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. — ?]. З пачатку 1-й сусветнай вайны з сям'ёй знаходзіўся ў бежанстве ў Расіі. У 1930-я г. працаваў настаўнікам СШ ў г. Сураж Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 12.1.1938 падчас заняткаў у школе. Асуджаны за «шпіянаж на карысць Польшчы» да 10 (?) гадоў ППК. Этапаваны ў Горна-Шорскі канцлагер НКВД Томскай чыгункі. Далейшы лёс невядомы.

ние дать возможность написать заявление товарищу Сталину издевательски ответил: «Заявление Сталину — это... (далей грубая лаянка. — **Л. М.**)»[2].

БАРСУКОВ (следчы, катаваў на допытах падследных).

БАСИНКЕВИЧ (следчы, лейтэнант дзяржбяспекі (ліст. 1936); дапытваў Сяргея Дарожнага, Васіля Каваля, Яна Скрыгана, Васіля Сташэўскага, Уладзіміра Хадыку і інш.).

БИКСОН.

БОНДАРЕНКО (следчы).

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«С 7 по 11 июля — 4 суток — я стоял на «конвейере» у следователя Бондаренко. На конвейере подследственный стоит в солдатской стойке, со сжатыми ногами, сдвинутыми носками и опущенными вдоль корпуса руками. Ему не дают в это время двигаться с места, не дают ни пищи, ни воды. День сменяет ночь, сутки сменяют сутки, а подследственный все стоит в таком положении без движения и без сна. Следователь в это время уговаривает писать. У меня на конвейере сменялись три следователя...

На конвейере опухают руки, ноги. Человек после конвейера не может идти, падает. От отсутствия сна и невероятного физического и нервного переутомления наступают дикие зрительские и слуховые галлюцинации»[3].

БУРМИСТРОВ (следчы, катаваў на допытах падследных).

БЫСТРОВ Николай Михайлович* (н. ў 1908 у сям'і тульскага рабочага. У ліст. 1917 уступіў у чырвонагвардзейскі латышскі атрад спецпрызначэння ў Смольным у Петраградзе. Браў удзел у ліквідацыі белагвардзейскіх бандаў і ў разгоне Устаноўчага сходу. У сак. 1918 атрад пераехаў з урадам у Маскву-Крэмль, дзе Б., паводле яго слоў, «неаднаразова даводзілася ахоўваць кабінет У. І. Леніна». Браў удзел у падаўленні мяцяжу анархістаў і паўстанні левых эсэраў. Асабіста ўдзельнічаў у вызваленні з палону левых эсэраў у Пакроўскіх казармах Ф. Э. Дзяржынскага. У маі 1919 паступіў на работу ў органы ЧК, у якіх на розных аператыў-

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1806, л. 136–139.
[2] Тамсама, с. 2547, л. 7.
[3] Тамсама, л. 17–18.

ных пасадах працаваў да дня арышту. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР ад Старадарожскай выбарчай акругі. Арыштаваны, верагодна, у 1938. Абвінавачваўся як «член нацыянал-фашыстоўскай латышскай шпіёнскай арганізацыі».

ВИЛЬДФЛУШ (ВИЛЬФЛУШ) (следчы, лейтэнант дзяржбяспекі; дапытваў Сяргея Дарожнага і інш.).

ВИЛЬКО.

ВИНЬКОВЕЦКИЙ (следчы, катаваў на допытах падследных).

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Неоднократно, примерно с 4 до 6 утра меня избивала «бригада». Собирались следователи Морев, Виньковецкий, Годин, Крупеньков и еще два, фамилии которых не знаю. …Лебедев, блондин с вьющимися волосами, тонкими чертами лица, выделялся в бригаде своей жестокостью. «Бригада» била, одновременно применяя различные приемы: один рвал волосы, другой давил на горло, третий оплевывал лицо, остальные били кулаками и сапогами по голове, груди, животу, ногам. Это «бригада» играла в «футбол», помещая меня в центре, били по очереди сапогами — кто куда попадет»[1].

ВИХОРЕВ Фома Антонович (сяржант дзяржбяспекі; н. ў 1908 у Маскве ў сям'і рускага рабочага; атрымаў пачатковую адукацыю; уступіў у ВКП(б) (1931); у АДПУ з 1932; удзельнічаў у арыштах Міхася Зарэцкага і інш.; абшукваў арыштаваных пры паступленні ва ўнутраную турму НКВД; катаваў на допытах падследных; асуджаны да 10 гадоў ППК).

З прысуду № 78 па крымінальнай справе № 99 (ад 25.5.1939):

«Вихорев, работая следователем УГБ НКВД СССР, в период сентябрь-декабрь 1937 г., пользуясь своим служебным положением, при допросах арестованных Потовича и Чикилевского применял методы физического воздействия, избивал их, сажал на кончик стула и на ножку перевернутого стула, таким путем заставлял их давать на себя вымышленные показания… Вихорев применял методы физического воздействия к тем арестованным, которые к нему никакого отношения не имели, ходил по кабинетам других следователей и избивал арестованных Шидловского, Басинкевича и Рассказова.

В июне 1938 г. обвиняемый Вихорев был переведен на долж-

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 22.

ность начальника 4-го отделения Витебского УНКВД. Зная о том, что сотрудники его отделения занимаются избиением арестованных, не принимал мер к искоренению незаконных действий, а наоборот, сам принимал участие в избиении арестованных Каца, Миклушова[1], Лобача и Эстрина[2]. Кроме того, обвиняемый Вихорев занимался производством незаконных арестов, в результате его преступной деятельности невинные люди попадали в тюрьму: Онескович, Богорад (?), Дульченок, Страш, Зильберг...»[3]

ВЛАСОВ (следчы, лейтэнант дзяржбяспекі; дапытваў Алеся Звонака і інш.).

З ліста П. Раднова[1] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Ни Левину, ни Вихореву, ни Власову я не давал указания создавать режимные камеры с агентурой якобы для избиения арестованных, вынуждая их на оговор себя и других...

Не знал о допускаемых ими извращениях в работе...

Честно веря директивам и указаниям оказавшегося вражеского руководства Наседкина и без всякого умысла слепо выполняя их... допустил ряд ошибок и нарушений в силу своей малоопытности и политической близорукости»[2].

ВОЛКОВ (следчы, лейтэнант дзяржбяспекі; верагодна, да служ-

[1] Міклушоў Герасім Анісімавіч [1894, в. Багданава, цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. — ?], калгаснік. З бел. сялянскай сям'і. Працаваў у калгасе «Ударнік». Быў жанаты, гадаваў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 20.9.1937. Асуджаны 25.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Каргапольскі канцлагер НКВД Комі АССР. Вызвалены 3.9.1943. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.4.1960 Віцебскім абл. судом. Асабовая справа М. № 9449-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

[2] Эстрын Веньямін Айзікавіч [1905, Магілёў — ?], вайсковец. З яўрэйскай рабочай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Уступіў у ВКП(б) (1925). На момант арышту нам. камандзіра палкавой школы 188-га зянітна-артылерыйскага палка, старшы лейтэнант. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 18.8.1937 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 128а. Выключаны з партыі ў сувязі з арыштам. Асуджаны 28.5.1938 за «контррэвалюцыйную трацкісцкую агітацыю» да 6 гадоў ППК. Пазбаўлены воінскага звання. Этапаваны ў Пячорскі канцлагер НКВД Комі АССР. Вызвалены 19.8.1943. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.4.1958 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Э. № 12040-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[3] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1702, л. 13.

бы ў Мінску працаваў у Оршы; катаваў на допытах Саламона Левіна, Валерыя Маракова, Барыса Мікуліча і інш.).

ВОЛОЦОРУБ (следчы).

З ліста М. Несцяровіча сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«После ареста меня в тот же день и последующие дни и ночи допрашивали. При допросах применялись физические... меры воздействия. Говорили со мной начальник 4-го отдела Ермолаев и его зам. Кунцевич. После всего в одну ночь мне дано было 5 очных ставок. На них присутствовали Ермолаев, Быховский, Кунцевич и 2 следователя. Протоколы ставок диктовались по очереди Кунцевичем, Быховским, Волоцорубом... Я вынужден был дать письменно показания, что я контрреволюционер, шпион, фашист, террорист, вредитель и пр. мерзость. Я оклеветал себя...»[3]

ВОЛЬФСОН (арыштоўваў і дапытваў Барыса Мікуліча і інш.).

ВОЛЬФТРУБ Мейер Абрамович (следчы, дапытваў М. Дарожкіна[1] і інш.; звольнены з органаў НКВД БССР у лют. 1939; падчас 2-й сусветнай вайны зноў у НКВД; канчаткова звольнены ў ліст. 1946 «па стане здароўя»; жыў у Мінску).

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Заместитель начальника 4-го отдела Кунцевич и следователь Вольфтруб доказывали мне почти в одних и тех же выражениях, что «НКВД под руководством Ежова ошибок не делает. Раз ты арестован, будешь неизбежно осужден»[2].

«27 июня 1938 г. следователь Вольфтруб предъявил мне обвинения по ст. 69 (вредительство), 70 (террор), 76 (контрреволюционная агитация), указав, что я «изобличаюсь как активный участник нацфашистской организации, вредительстве в области народного образования». Когда я... сказал, что в обла-

---

[1] Радноў Пётр Якаўлевіч, чэкіст. Н. ў 1902. З рускай сялянскай сям'і. Атрымаў пачатковую адукацыю. У ЧК з 1920. У ВКП(б) з 1924. Служыў у Маскве (да жн. 1937), Іванаве (да крас. 1938). З мая 1938 начальнік УНКВД па Віцебскай вобл. Дэпутат Вярхоўнага савета БССР. Узнагароджанымі ордэнамі і медалямі. Арыштаваны. Асуджаны 27.9.1939 да ВМП.

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1807, л. 57–70.

[3] Тамсама, с. 1805, л. 124–125.

сти народного образования никогда в жизни не работал... Вольфтруб [ответил]*: «Могу записать тебе правотроцкистскую организацию — тебе же будет хуже... Все равно кем-нибудь будешь...»*[3]

З ліста М. Вольфтруба (ад 11.12.1938) сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«[Почему] *руководители нац. фашистской организации по сей день находятся на свободе (Купала, Колас, Вольфсон*[1] *...) — для меня совершенно непонятно»*[2].

ВЫСОЦКИЙ* (следчы, катаваў на допытах падследных).

З ліста ў ЦК КП(б)Б былога камандзіра 1-га кавалерыйскага эскадрона Райхлінавіча Яфіма Мацвеевіча[3]:

«У лістападзе 1937 года мяне прывялі а 1-й гадзіне ночы на допыт і пачалася расправа. Я быў звязаны ва ўтаймавальнай кашулі і збіты да страты прытомнасці. У снежні нада мной зрабілі інсцэніроўку абразання. А 2-й гадзіне ночы пры допыце мне прапанавалі спусціць нагавіцы... Я не пагадзіўся, але пасля жорсткага збівання спусціў нагавіцы і адзін са следчых выняў нож і прымусіў, каб я палавы орган паклаў на табурэтку, але я гэтага не зрабіў, і тады яны схапілі мяне за палавы орган і пачалалі ця-

[1] Дарожкін Мікалай Апанасавіч [14.12.1905, в. Гарохаўка, цяпер Бранская вобл., Расія — 27.4.1993, Мінск], міколаг і фітапатолаг. Акадэмік АН БССР (1962). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1929). З 1931 працаваў вучоным спецыялістам, загадчыкам лабараторыі, дырэктарам Інстытута біялогіі АН БССР. Арыштаваны 26.6.1938. Абвінавачваўся ў «шпіянажы і арганізаванай антысавецкай дзейнасці». Пракуратурай БВА справа спынена. Вызвалены. Рэабілітаваны 9.2.1940. Удзельнічаў у 2-й сусветнай вайне. З 1948 дырэктар Інстытута біялогіі АН БССР, з 1959 дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства, у 1976–87 загадчык лабараторыі Інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР.

«Непонятна роль профессора Дорожкина, который очень невнятно и туманно говорил о том, что следователь Вольфтруб предлагал ему какое-то сотрудничество, что его, Дорожкина, скоро освободят потому, что он многое знает, что он дал 7 очных ставок и т. д. Член партии Антоненко рассказывал, как Дорожкин уговаривал его на очной ставке: «Иван Михайлович, признайся. Ведь мы состояли с тобой в контрреволюционной организации» (НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 30).

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 6.

[3] Тамсама, л. 12.

гаць па пакоі да страты прытомнасці…

На наступны допыт, на Новы год, г. зн. 1 студзеня 1938 года, мяне выклікалі… таксама роўна а 2-й ночы, прымусілі стаяць на зважай і адзін [са следчых] *стаў на зэдлік і пачаў мачыцца мне ў вуха. У гэтым жа месяцы таксама а 1-й гадзіне ночы* (у 30-градусны мароз. — **Л. М.**) *пры знарок адчыненых вокнах і дзвярах мяне распранулі да адной кашулі, налілі за каўнер 2 графіны вады і прымусілі сядзець да 2 гадзінаў раніцы. На мне абсалютна ўся вопратка змерзла, я змерз да страты прытомнасці. Дадам, што следчы Высоцкі, які мяне збіваў і здзекаваўся з мяне, прымушаў мяне стаяць на зважай, трымаць тоўстую кнігу Евангелля, хрысціцца і маліцца. Гэта працягвалася 6 месяцаў…»*

ГЕРАСИМОВИЧ.

ГОДИН (следчы, катаваў на допытах падследных).

ГОРЕМЫКИН (оперупаўнаважаны).

З ліста М. Сцерніна сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Уполномоченный Горемыкин издевательски улыбался, рассматривая взятый у меня при обыске и аресте мой партийный билет № 0855202»[1].

ДОВГАЛЕНКО Василий Ал. (следчы, лейтэнант дзяржбяспекі; да службы ў НКВД працаваў настаўнікам; дапытваў Анатоля Воль-

[1] Вальфсон Сямён Якаўлевіч [27.5(8.6).1894, Бабруйск Мінскай губ., цяпер Магілёўская вобл. — 1941, Мінск], дзяржаўны дзеяч, філосаф, літаратуразнавец, педагог. У 1919 скончыў Кіеўскі ун-т. З 1921 прафесар БДУ. У 1931—38 дырэктар Інстытута філасофіі і права. Як літаратурны крытык выступаў з пазіцый вульгарнага сацыялагізму, абвінавачваў бел. пісьменнікаў у нацыяналізме. Калі ў 1938 у НКВД дайшла чарга і да выкрывальніка нацдэмаў, знаёмыя лекары схавалі В. у бальніцы для псіхічна хворых, дзе ён і адседзеўся. У пачатку 2-й сусветнай вайны схоплены і забіты фашыстамі.

[2] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1398, л. 57.

[3] Н. ў 1900 у в. Пранчэйкава Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Да арышту камандзір 1-га кавалерыйскага эскадрона. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны ў Мінску 15.9.1937. Асуджаны 1.9.1938 асобай нарадай пры НКВД за «сувязь з польскай разведкай» да 3 гадоў ППК. Дадому вярнуўся інвалідам. Рэабілітаваны 24.4.1990 пракуратурай БВА. Асабовая справа Р. № 30959-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

нага, Цішку Гартнага, Сяргея Грахоўскага і шэраг іншых беларускіх пісьменнікаў).

З успамінаў С. Грахоўскага:

«*Мяне дапытваў следчы Даўгаленка. Пазней яму «даверылі гутарыць» з самім Цішкам Гартным…*

У чарговы раз прывялі да Даўгаленкі ў кабінет, рукі назад, табурэтка стаіць. Ён бярэ нейкія дакументы са стала і тыкае мне ў твар:

— Ведаеш яго?

— І Цішка Гартны, камуніст з 1912 года, арыштаваны? — не змог стрымаць я здзіўлення.

— А што? Ён жа адзін з кіраўнікоў контррэвалюцыйнай арганізацыі, і ты павінен быць нам вельмі ўдзячны, што своечасова цябе перахапілі і ворагі народа не паспелі ўцягнуць пачынаючага паэта ў антысавецкую дзейнасць, а яны ж на гэткіх, як ты, і разлічвалі…

У мяне дома засталася маладая жонка, таксама як і я, студэнтка. Яна была на апошнім месяцы цяжарнасці, а яе пасля майго арышту выкінулі з кватэры. Я ўмаляю, прашу сказаць, нарадзіла яна ці не, хвалююся, таму што пры родах тады шмат жанчын памірала.

— От прызнаецеся, падпішаце ўсе паперы, што трэба, тады і даведаецеся…»

ДРОЗДОВ Александр Евсеевич* (н. ў 1905; у НКВД з 1926, оперупаўнаважаны, арыштоўваў і дапытваў Барыса Мікуліча і інш.).

ЕВТУШЕНКО (следчы, катаваў на допытах падследных[1]).

З ліста І. Смірнова[2] Чорнаму[3] (ад 24.12.1939):

«У моего теперешнего соседа по квартире (у ссылцы ў Паўладары Казахскай ССР. — **Л. М.**) *следователем Евтушенко выбита в ухе барабанная перепонка…*

Следователи-«молотобойцы» в своих кабинетах, превращенных в кровавые застенки, добивались от арестованных огульного сочинения вымышленного, несуществующего преступления, главным образом по части шпионажа, диверсии, террора и т. д.»[4].

ЕРМАКОВ (следчы 3-га аддзела УДБ НКВД БССР; арыштаваны і асуджаны ў 1939).

З ліста асуджанага К. С. Румянцава сакратару ЦК ВКП(б) Г. Маланкову:

«Следователи Малаханов и Ермаков для того, чтобы из меня… сделать шпиона, применяли следующее:

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2547, л. 4.

Все допросы систематические сопровождались запугиванием расстрелом, побоями и оскорблениями.

В период следствия, т. е. со дня ареста 14.5.1939 и по день суда 29.7.1939 содержался в сырой камере-одиночке. Со дня ареста по 8.6.1939 содержался в камере одиночке № 32 Минской тюрьмы, а с 8.6.1939 по 29.7.1939 — в камере-одиночке № 8 внутренней тюрьмы НКВД БССР (американка).

С 12.6.1939 по 17.6.1939 включительно содержался без всякого основания в сыром и темном карцере на одной воде с 400 гр. хлеба.

В период следствия мне не разрешали спать, систематически на всю ночь вызывали на допросы, а днем по установке следователей спать запрещалось...

Издевались над моей семьей, проживающей в Смоленске. До сегодняшнего дня задержали у себя написанную мною доверенность на получение расчета по месту моей работы ДТО НКВД Западной ж.д. г. Смоленска. 8.7.1939 в период допроса на мою просьбу об отправлении доверенности моей жене следователь Малаханов и Ермаков, разговаривая со мною, нецензурно отзывались о моей жене, говоря, чтобы я о семье не беспокоился, т. к. жена поторгует собой и денег для семьи заработает. Кроме этого, Ермаков в период этого же допроса, обращаясь ко мне и к Малаханову, говорил: «Румянцев, ты напрасно беспокоишься о жене, ты ее больше не увидишь. Вот Малаханов едет в Смоленск, поручи ему, и он твою жену отдерет...

За короткий период я заболел почками и сердцем...»[1]

ЕФИМОВ (следчы 3-га аддзела НКВД, катаваў на допытах падследных[2]).

ЗАВАДСКИЙ Владимир Николаевич (лейтэнант дзяржбяспекі;

---

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1706, л. 5–6.

[2] Смірноў Іван Сямёнавіч [8.1.1906, с. Машына, Расія — ?]. З рускай сялянскай сям'і. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Працаваў у Ленінградзе. З 1933 інжынер-электрык Дзяржплана БССР. Арыштаваны 13.8.1938 у Мінску па адрасе: вул. Старажоўская, д. 37, кв. 6. Асуджаны 5.8.1939 за «шпіянаж на карысць Польшчы» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Паўладар Казахскай ССР. Працаваў энергетыкам на хлебакамбінаце. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа С. № 25574-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

[3] Біяграфічныя звесткі не выяўлены.

[4] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 2184, л. 227, 238.

катаваў на допытах Сяргея Знаёмага, Валерыя Маракова і інш.).

З архіва КДБ Беларусі:

«*Обзорная справка*

По архивному следственному делу № 71068 по обвинению бывшего зам. начальника Особого отдела Белорусского военного округа Завадского Владимира Николаевича, 1906 года рождения, урожденца гор. Смоленска, и других, всего 4 человека.

Завадский В. Н. Военным трибуналом Белорусского Особого военного округа 3–7.11.1940 года (5 дзён судзілі ката, — не 15 хвілін, як нявінна забітых А. Вольнага, П. Галавача, А. Дудара, Ю. Лявоннага, В. Маракова, М. Чарота і інш. — **Л. М.**) *осужден по ст. 69 УК БССР с санкции ст. 64 УК БССР к ВМН — расстрелу (т.1 л. д.651).*

Судом Завадский признан виновным в том, что, находясь с ноября 1937 года по сентябрь 1938 года в должности начальника 5-го отдела НКВД БССР, извращал революционную законность и методы ведения следствия путем подлогов и фальсификации протоколов допросов, культивирования и огульного применения к следственно-заключенным мер физического воздействия, ориентировал подведомственные ему особые органы на поголовные аресты и избиения лиц комначсостава, уволенных из РККА, и допускал другие извращения в следственной работе (т.1 л.д.648–651).

Обзорную справку составил:

Начальник 6 сектора Особого отдела комитета Госбезопасности при СМ СССР по Белорусскому военному округу полковник —

Голубь, 31 июля 1956 года».

ЗАРУБИН.

ЗИНОВЬЕВ (начальнік аддзялення Мінскай турмы[1]).

ИЗМАЙЛОВ (следчы).

З ліста О. Ціманнена[2] сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку:

«Следователь Измайлов уже с начала следствия, когда я был в его физической разработке, сказал мне, что сделает из меня шпиона искусственно...»[3]

КАЛЯМИН (следчы).

---

[1] НАРБ, ф. 4п, в. 21, с. 1706, л. 72–81.

[2] Тамсама, с. 1703, л. 24.

КАЦ Марк Исаевич (н. ў 1899), лейтэнант дзяржбяспекі; у НКВД з 1930-х г. да 1954; праводзіў масавыя незаконныя арышты, дапытваў Георгія Бондара (загадчык сельскагаспадарчай секцыі (аддзела) Дзяржплана БССР), Анатоля Вольнага, Міхася Зарэцкага, Васіля Каваля, Янку Нёманскага, Васіля Сташэўскага, Міхася Чарота і інш.).

КАЦЕВ (следчы).

З ліста асуджанага К. С. Румянцава сакратару ЦК ВКП(б) Г. Малянкову:

